№ 32 (534) 30 жніўня 2007 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

# Урад узьнімае цэны

Зь верасьня падаражэюць хлеб, малако, гарэлка, праезд у транспарце і пераглядаюцца закупныя цэны. Старонка 3.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

4 верасьня ў Нясьвіжы і Салігорску суды над Настай Азаркай і Іванам Шылам. Старонка 5.

## Два працэсы ў адзін дзень



## Слаба бегаем, але добра кідаем

Іван Ціхан стаў чэмпіёнам сьвету. **Старонка 20.**

## У НУМАРЫ

**«Да канца году мы пачнем вяшчаньне на спадарожніках «Астра» і «Сірыюс»**

На пытаньні чытачоў адказвае дырэктарка тэлеканалу «Белсат» Агнешка Рамашэўская. **Старонка 8.**

**Тэатар несвабоды**

АМОН затрымаў актораў і гледачоў Свабоднага тэатру. **Старонка 4.**



# Эканамічная праграма расейскай экспансіі

Прэса схапілася за скандальную заяву пасла Сурыкава пра магчымасьць выкарыстаньня тэрыторыі Беларусі ў якасьці пляцоўкі для расейскай атамнай зброі. Між тым ягонае інтэрвію агенцтву «Інтэрфакс-Захад» цікавае перадусім эканамічнымі вымогамі, якія ён сфармуляваў. Пасол патрабуе ад беларускіх уладаў паважаць інтарэсы расейскага капіталу. Аналіз інтэрвію.

Выбар СМІ не выпадковы. Агенцтва «Інтэрфакс-Захад» зьвязанае з расейскім «Інтэрфаксам» і блізкае да лукашэнкаўцаў. Якраз яно друкуе паведамленьні беларускага КДБ раней за фармальна «дзяржаўныя» СМІ.

Аляксандар Сурыкаў пачаў з адмазкі за нявыдачу крэдыту: «Бюджэт Расеі не крэдытуе камэрцыйных структураў. Расея ніколі не магла абяцаць такі крэдыт камэрцыйнай арганізацыі, якой ёсьць «Белтрансгаз». Для такой арганізацыі ёсьць крэдытныя гісторыі, якія адпаведна адкрываюць банкі — расейскія, беларускія [«Белгазпромбанк» — расейскі фарпост у беларускай банкаўскай сфэры. — **«НН»**]. А нашто ж нам крэдытаваць камэрсантаў бюджэтнымі грашыма. ... Беларускі бок заявіў, што ёй трэба паўтара мільярда. Але [дзе] падставы для здабыцьця гэтага крэдыту. Дэфіцыту бюджэту няма, ёсьць прафіцыт».

**Працяг на старонцы 7.**

## Аршанская бітва—2007



Старонка 29.

## АД РЭДАКЦЫІ

Нумар газэты адкрываецца матэрыял пра павышэньне цэнаў. Гэтая падзея мае палітычнае значэньне. Арганізаванае павышэньне ці, як гаварылася калісьці, выроўніваньне цэнаў прымушае наноў задумацца над станам беларускай гаспадаркі, асабліва з улікам далейшага росту выдаткаў на газ, якое адбудзецца з 1 студзеня 2008 году. Пасол Сурыкаў заявіў, што цана можа скласьці ад 125 да 150 даляраў за тысячу кубамэтраў (**старонка 2, 7**).

Кінэматаграфічным сюжэтам мінулага тыдня стаў арышт актораў і гледачоў «Свабоднага тэатру» сіламі палка міліцыі спэцыяльнага прызначэньня. **Старонка 4**. (Кіраўніцтва нацыянальных акадэмічных тэатраў маўчыць.)

Гістарычную значнасьць мае справа «Маладога фронту» Яна папоўнілася новымі фігурантамі. Суд над «МФ», чарговы акт якога адбудзецца ў Салігорску й Нясьвіжы 4 верасьня, ураўнаважваецца з найгучнейшымі працэсамі ў беларускай гісторыі. Гэтым разам на лаве падсудных — школьнік Іван Шыла. **Старонка 5.**

Ня менш сутнасная нам падаецца тэма, узьнятая Віталём Тарасам. Ён мяркуе, што суісnаваньне двух правапісаў беларускай мовы становіцца тормазам для разьвіцьця культуры. Абставіны складаюцца так, піша В.Тарас, што патрэбнае адзінства, нават коштам любых кампрамісаў. У сытуацыі, якую маем, суісnаваньне розных правапісаў з вымушанай непазьбежнасьцю ператвараецца ў супрацьпастаўленьне, дзеліць і без таго падзеленую нацыю. **Старонка 6.** Калі разьвіваць думку аглядальніка «НН», далейшае захаваньне фармальнай чысьціні правапісных традыцый сёньня магчымае толькі коштам далейшага звужэньня камунікацыйных магчымасьцяў незалежнай беларускай культуры. Гэта ставіць прыхільнікаў тае чысьціні ў пазыцыю эвангельскіх кніжнікаў-фарысэяў.

У той жа час факт застаецца фактам, што найперш і перадусім дзяржаўны гвалт і палітызацыя моўных пытаньняў перашкодзілі ў 90-я і перашкаджаюць сёньня выпрацоўцы адзінага правапісу. Што ўрадаваму боку, называючы рэчы сваімі імёнамі, пляваць на лёс усяго беларускага, што марна чакаць ад яго кампрамісаў дзеля беларускай культуры.

Меркаваньне В.Тараса, безумоўна, выкліча дыскусію. Далучайцеся да абмеркаваньня.

**Шаноўныя людзі!**

«Наша Ніва» шукае распаўсюднікаў для продажу газэты на вуліцах і ў электрычках. Справа выгадная і надта патрэбная.

Продаж ажыцьцяўляецца на аснове дамоваў.

Зьвяртацца праз тэл.: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84.

Купала ў кожны дом




**Выйшаў першы плякат з сэрыі «Нацыянальныя героі Беларусі». Каб набыць, пытайцеся праз тэл. (029) 505-39-11 або праз e-mail: plakat@biz.by**

# Зь верасьня даражэюць хлеб, малако, гарэлка, транспарт

Міністэрства эканомікі хоча кампэнсаваць дыспрапорцыю закупачных цэнаў на матэрыяльна–тэхнічныя рэсурсы і сельгаспрадукцыю.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Ад студзеня да ліпеня рост валавога ўнутранага прадукту склаў 108,8%. Грашовы прыбытак насельніцтва ў намінальным налічэньні вырас на 18% (сярэдні заробак дасягнуў $330), у рэальным — 10,1%. І інфляцыя склала ўсяго 4,1%.

Карацей, не жывем, а квітнеем. Каб беларусам не раздурэць ад такой раскошы, урад вырашыў пры канцы жніўня, пакуль далёка да восеньскіх маршаў пратэсту, узьняць цэны на прадукты першай неабходнасьці.

Пра гэта аб’явіў на прэс-канфэрэнцыі ў аўторак намесьнік міністра эканоміка Ўладзімер Адашкевіч.

Малако і малакапрадукты падаражэюць на 4% у два этапы: на 2% у жніўні і на гэтулькі ж цягам верасьня. Гэта выклікана ростам закупачных цэнаў на малако на 5%.

Хлеб і хлебапрадукты таксама будуць даражэць паэтапна, агульны памер росту складзе 2,5—3%. Па словах намесьніка міністра, тут усё залежыць ад таго, па якой цане давядзецца закупляць пшаніцу. На гэтыя мэты давядзецца выдаткаваць каля $20 млн — краіна мае закупіць на булкі й макароны да 200 тыс. т. пшаніцы, закупачныя цэны на якую сёньня складаюць каля $200 за тону.

Ад 28 верасьня падаражэла гарэлка. Рост цаны на гэты прадукт склаў 3%. Сп. Адашкевіч адзначыў, што гэтая галіна харчовай прамысловасьці характарызуецца высокай рэнтабэльнасьцю вытворчасьці, што сягае 32%.

Уладзімер Адашкевіч адзначыў, што безь дзяржаўнай падтрымкі сельгаспрадпрыемствам не абысьціся: дыспрапорцыя росту закупачных коштаў на матэрыяльна-тэхнічныя рэсурсы і сельгаспрадукцыю робіць вытворчасьць апошняй нерэнтабэльнай.

Гаворачы пра падаражэньне праезду ў гарадзкім гарадзкім транспарце (з 30 жніўня на 20%), намесьнік міністра нагадаў, што апошняе падаражэньне гэтых паслугаў праводзілася ў ліпені мінулага году.

«Мы не плянуем падвышаць кошт праезду больш, чым раз на год» — падкрэсьліў ён. Было адзначана, што праязныя месячныя і дэкадныя квіткі будуць даражэць адносна талёнаў удвая менш. Робіцца гэта з мэтай папулярызацыі выкарыстаньня праязных дакумэнтаў.

Каб кампэнсаваць інфляцыю, з 1 верасьня падрастуць пэнсіі, а з 1 кастрычніка павысіцца тарыфная стаўка 1-га разраду, памер якой на сёньня складае 65 000 бел. руб. Памеры росту пакуль не разгалошваюцца. Відаць, хочуць, каб гэта стала прыемным сюрпрызам купцам малака, хлеба і бэнзыну.

**Сямён Печанко**

**Ад 30 жніўня ў Менску падаражэюць квіткі**

**на ўсе віды грамадзкага транспарту, пра гэта «Нашай Ніве» паведамілі ў філіяле «Агенцтва па распаўсюдзе білетнай прадукцыі» КУП «Мінсктранс». Цяпер поўны квіток будзе каштаваць 600 рублёў, а льготны 300, замест сёньняшніх 500 і 250 рублёў. У «Мінсктрансе» сказалі, што кошты на квіткі не павялічваліся больш за год і цяпер прыйшоў час, каб гэта зрабіць.**

**Старыя квіткі будуць дзейнічаць цягам дзесяці дзён. Праязныя квіткі на наступны месяц і першую дэкаду верасьня пакуль можна набыць па старых коштах. Яшчэ невядома, колькі будуць каштаваць новыя праязныя на месяц.**

**Паводле разьлікаў Мінфіну пасажыры павінныя камэнсаваць да 75% ад сабекошту паслугаў транспарту ў абласных гарадах, да 60% – у Менску. Фактычна гэтыя лічбы складаюць 68% і 36% адпаведна.**

**ЗП**

# Тэатар несвабоды

22 жніўня ў катэджы ў раёне Зялёнага Лугу ў Менску мусіў адбыцца прэм'ерны паказ спэктаклю «Свабоднага тэатру». Але ў дом уварваўся амон. Сярод шасьцідзесяці затрыманых апынулася група французаў і трое дзетак.

Мікалай Халезін і яго каманда меліся паказаць п'есу ангельскага драматурга Эдварда Бонда «Адзінаццаць кашуляў» прысьвечаную праблеме гвалту ў школьным асяродзьдзі. Як казалі акторы «Свабоднага тэатру», «пры жаданьні можна і тут убачыць палітыку».

Меркаваньне пацьвердзілася: перад пачаткам імпрэзы ў катэдж уварваліся амонаўцы. Адзін зь іх, на прозьвішча Басалыга, загадаў «усё спыніць».

Прысутным было забаронена карыстацца сродкамі мабільнай сувязі і загадана не разыходзіцца, чакаць міліцэйскіх аўтобусаў. Аўтобус пад'ехаў усяго адзін. Туды ўціснулі ўсіх затрыманых... Дарогай людзі скардзіліся на духату і цеснату. Затрымалі нават траіх малых дзетак, гадкоў па пяць. Яны сядзелі ў бацькоў на каленях у тым самым аўтобусе.

Пяцьдзясят гледачоў, акторы, а таксама журналісты і замежныя госьці (францускі рэжысэр Крыстыян Бэнэдэці, кіраўніцтва францускага тэатру «Артфатвіль») былі дастаўленыя ў пастарунак Савецкага раёну. Затрыманых адвялі ў падвал. «Дастаткова ўтульны, — жартавалі яны, — нават з фатэлямі». Але забаранілі размаўляць міжсобку. Пачалося перапісваньне пашпартных зьвестак. Праз гадзіну адпусьцілі замежнікаў. Яшчэ праз паўгадзіны — дзяцей і іх бацькоў. Астатнім забаранілі нават выходзіць у прыбіральню.

Так і чакалі людзі да паўночы. Перш, чым адпусьціць, з кожнага бралі паказаньні. Людзі пісалі, што прысутнічалі на вясельлі «Дзяніса і Марыны», калі наляцела міліцыя.

Назаўтра УУС Менгарвыканкаму абвергла інфармацыю пра разгон спэктаклю. Агенцтва «Інтэрфакс» паведаміла, што «менская міліцыя аказалася ў прыватным доме ў раёне плошчы Бангалор, у сувязі з паступіўшым тэлефанаваньнем пра выбух».

А назаўтра, 23 жніўня, «Свабодны тэатар» прызначыў новую прэзэнтацыю. Гэтым разам за Менскам, у вёсцы Кучкуны Валожынскага раёну. Ужо на ўезьдзе ў вёску машыны з акторамі і гледачамі спыніла мясцовае ДАІ. «Куды вы едзеце, там усё замініравана», — казалі яны, спрабуючы завярнуць «Свабодны тэатар» назад. Гучала вельмі непераканаўча.

Ледзь пасьпела пачацца прэзэнтацыя, як у прыватны катэдж завіталі нарад міліцыі і кадэбісты ў цывільным. Ізноў пачалося перапісваньне пашпартных зьвестак прысутных. Аднак абышлося без затрыманьняў — сярод гледачоў гэтым разам былі Аляксандар Мілінкевіч, швэдзкі дыплямат Стэфан Эрыксан. Сілы правапарадку абмежаваліся тым, што вакол дварышча , дзе ішла прэм'ера, пусьцілі двух міліцэйскіх апэратараў з камэрай. Яны фільмавалі ўсё, што адбывалася, старанна ўнікаючы журналістаў.

А кіраўнік «Свабоднага тэатру» Мікалай Халезін змог, нарэшце, прывітаць усіх прысутных на «другім дні вясельля» і абвесьціць пра пачатак спэктаклю.

**СМ, Юлія Дарашкевіч**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Два працэсы ў адзін дзень

4 верасьня ў наступны аўторак у раённых судах Нясьвіжу і Салігорску пачнуцца працэсы па справе незарэгістраванага «Маладога фронту». На лаве падсудных апынуцца **Наста Азарка** і **Іван Шыла**.

Сямёх маладафронтаўцаў ужо судзілі па артыкуле 193 КК «дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі». Азарка з Шылам popстануць восьмай і дзевятым. На чарзе яшчэ Яраслаў Грышчэня з Баранавіч, дата суду якога пакуль не названая.

Працэсы прызначаныя на адзін дзень з разьлікам на тое, каб на суды прыехала як мага меней людзей, мяркуюць маладафронтаўцы. Толькі 4 верасьня зь берасьцейскай турмы выйдзе Павал Севярынец, які мог бы арганізаваць належную падтрымку пад сьценамі судоў Нясьвіжу і Салігорску. І, нарэшце, 6 верасьня «Малады фронт» сьвяткуе дзесяцігодзьдзе. Прысуды маладзёнам, такім чынам, могуць стаць своеасаблівым «віншаваньнем», лічаць яны.

## Наста Азарка: Адна на цэлы горад

Імя 25-гадовай Насты Азаркі пэрыядычна фігуруе ў сьпісах затрыманых і ўдзельнікаў апазыцыйных акцыяў досыць даўно. Яна сядзела на сутках у 2004-м, неаднаразова атрымлівала штрафы, яе затрымлівалі і трымалі ў пастарунках. Аднак жаданьне займацца грамадзкай дзейнасьцю не зьнікае.

Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў-2006 на Насту ўжо заводзілі крымінальную справу па тым самым артыкуле, але ўрэшце спынілі. Сёлета выраашылі завесьці зноў. У пастарунках Азарка падпісвала расьпіскі, што адмаўляецца ад любой палітычнай дзейнасьці, пасьля міліцыянты лавілі яе зноў, калі яна вывешвала недзе сьцяг, ці распаўсюджвала налепкі.

Настаўніца пачатковых клясаў паводле адукацыі, Наста вымушаная працаваць рабочай на ільнозаводзе. І нават гэтую працу дзяўчына знайшла толькі з дапамогай прыязных міліцыянтаў.

На працу ад кадэбістаў прыйшла папера, каб кантралявалі ўсе мае заявы па днях, калі я пішу заявы на адгулы. Я вельмі ўдзячная маім калегам за тое, што яны ні аб чым не пытаюцца. Маўклівая падтрымка.

Наста адчувае цяпер моцную патрэбу ў маральнай падтрымцы.

## Іван Шыла: Юнак з жалезнымі нэрвамі

Імёны братоў Івана і Ільлі Шылы загучалі пасьля падзеяў на Плошчы. Там яны былі разам з бацькам Уладзімерам. Таму пытаньне бацькоўскай падтрымкі ў іх сям’і нават не стаіць.

За кароткі тэрмін Іван Шыла **(на фота)** змог згуртаваць вакол сябе некалькі дзясяткаў хлопцаў і дзяўчат, якія складаюць касьцяк салігорскай апазыцыі. Летась у траўні Іван быў адным з пачынальнікаў галадоўкі пратэсту супраць уціску моладзі ў навучальных установах.

«Хлопец з каменным тварам і жалезнымі нэрвамі. Ён мала кажа, але шмат робіць. Яго вытрымцы і мэтаскіраванасьці мог бы пазайздросьціць любы сталы палітык», — характарызуе Івана Шылу П.Севярынец.

Шылу ўжо ня раз затрымлівалі, але пакуль не судзілі, бо непаўналетні, школьнік. Звычайна хлопца, патрымаўшы пару гадзінаў у пастарунку, адпускаюць. Некалькі разоў на кватэры Шылаў КДБ ладзіўператрусы з канфіскацыямі. Летась старшыня салігорскага гарвыканкаму публічна абяцаў пасадзіць Івана ў клетку, калі ён не супакоіцца.

Шыла ня робіць ніякіх прагнозаў наконт суду. Кажа, што ўсё пакажа час.

І Наста, і Іван просяць усіх неабыякавых падтрымаць іх 4 верасьня.

**Зьміцер Панкавец**

# Ці прычакаем белага дыму?

Пара прыйсьці да адзінага правапісу. Піша **Віталь Тарас**.

Некалькі месяцаў таму, задоўга да таго, як быў апублікаваны праект новых правілаў беларускай артаграфіі, у незалежных СМІ было шмат гнеўных водгукаў. Адусюль тады сыпаліся перуны й маланкі.

І вось нядаўна Міністэрства адукацыі РБ зьмясьціла праект зьменаў на сваім афіцыйным сайце. І далей – цішыня. Калі не лічыць, вядома, водгукаў на сайце «Нашай Нівы». Але ж і тут заўвагі тычыліся, у асноўным, таго, што міністэрскі рэсурс аздоблены парасейску, ды яшчэ малапісьменна. (Побач з назвай праекту было напісана: «можна скачать сдесь».) А дыскусія неяк не завязваецца.

Выглядае, што літара «ў» засталася на сваім месцы, як і апостраф. Што да астатніх зьменаў, дык уводзіць іх мяркуецца цягам некалькіх гадоў. Да таго часу, пакуль яны будуць узаконеныя, можна не баяцца санкцыяў дзяржавы за іх парушэньне.

І ўсё ж, я лічу, меў рацыю мовазнаўца Пётра Садоўскі, калі казаў у нядаўнім інтэрвію радыё «Свабода», што галоўная небясьпека — у самым існаваньні двух узаконеных варыянтаў мовы. Працэс яе разбурэньня, выгнаньня амаль з усіх сфэраў дзейнасьці, які без таго зайшоў вельмі далёка, можа яшчэ больш паскорыцца, адштурхнуць ад роднай мовы тысячы звычайных людзей, асабліва маладых. Іх новыя правілы могуць дэзарыентаваць канчаткова.

Але ня толькі ў гэтым бачу праблему.

На маю думку, вядомыя і аўтарытэтныя знаўцы прадмету — такія, як паважаныя Вінцук Вячорка, Сяргей Шупа і многія іншыя нясуць, прынамсі, ня меншую адказнасьць за сучасны стан мовы, чымся «афіцыйныя» мовазнаўцы. Я не філёляг. Мне асабіста клясычны правапіс падаецца куды больш стройным і лягічным, арганічным для беларускай мовы, чым «наркамаўка». Але маё суб’ектыўнае стаўленьне нікому не цікавае. Мяне, як і тысячы іншых карыстальнікаў («юзэраў») цікавіць, каб можна было, не задумваючыся, заўсёды карыстацца адным і тым варыянтам. А мяне ўвесь час, можна сказаць, напружваюць — навязваюць то адно, то другое. Ды няхай было б і некалькі дзясяткаў варыянтаў: у нармальнай сытуацыі ў нармальнай дзяржаве тэарэтычныя спрэчкі, барацьба навуковых канцэпцыяў была б дарэчы. І нават, у канчатковым выніку, яны, мабыць,

> «Ь» у клясычным правапісе — гэта яшчэ й свайго роду сьцяг, знак нязгоды з афіцыйшчынай, разбурэньнем беларускай культуры і мовы. Але ці варты гэты сьцяг таго, каб разьядноўвацца?

пайшлі б толькі на карысьць мове. Але бяда ў тым, што ў выніку сёньняшняй сытуацыі — узровень непісьменнасьці, асабліва сярод моладзі, жахлівы. Як казаў незабыўны старшыня колішняга Вярхоўнага савету Беларусі Мікалай Дземянцей, «хто как хаціт, так і гаварыт». А цяпер і пішуць, дадам я. Асабліва ў інтэрнэце.

Адзін мой знаёмы вэб-рэдактар упарта даводзіў, што па-беларуску трэба пісаць «тэлефаніць» (замест «тэлефанаваць» або проста «званіць»).

Неяк Сяргей Вітушка напісаў у газэце «Свабода»: слова «заўзець» (ад «заўзятар»), можа, і адпавядае акадэмічнай навуцы, але гэта кабінэтная праўда. І падобныя гэтаму «правільныя» словы — мёртванароджаныя, яны ў народзе наўрад ці прыжывуцца.

І што ўвогуле народу сёньня трэба лічыць пісьменным або непісьменным? Можна лічыць наркамаўку бяздушнай, навязанай, можна кпіць зь яе, але пераважная большасьць людзей да яе прызвычаілася, ёю карыстаюцца.

Між іншага, справа не ў артаграфіі ці артаэпіі. У ангельскай мове, як вядома, усяго дваццаць чатыры літары, і іх не заўсёды хапае, каб адлюстроўваць фанэтыку. І ніхто з-за гэтага асабліва не перажывае.

Я разумею, што «ь» у клясычным правапісе — гэта яшчэ й свайго роду сьцяг, знак нязгоды з афіцыйшчынай, разбурэньнем беларускай культуры і мовы. Але ці варты гэты сьцяг таго, каб разьядноўвацца? Гэтак некалі ў сярэднявеччы руская праваслаўная царква раскалолся паводле фармальнай прыкметы: адны хрысьціліся трыма пальцамі, а «раскольнікі» — двума. І тыя і другія пры гэтым былі абсалютна, сьвята перакананыя, што праўда на іх баку. І гатовыя былі нават пайсьці на сьмерць за свае перакананьні. Перакананьні заўсёды вартыя павагі. Але важна, каб яны не ператвараліся ў карпаратыўнасьць.

Як па мне, дык трэба было б усіх беларускіх філёлягаў, як сьвятароў-кардыналаў пры абраньні Папы, замкнуць у адным памяшканьні ды не выпускаць, пакуль белы дым з коміну ня пойдзе. Маю на ўвазе менавіта ўсіх філёлягаў і мовазнаўцаў — акадэмічных ці неакадэмічных, дый ня толькі навукоўцаў. Усе, каму неабыякавы лёс беларускай мовы, незалежна ад палітычных поглядаў, маглі б заключыць нешта накшталт грамадзкай дамовы, альбо прыняць свайго роду «нулявы варыянт».

Баюся толькі, што ўсё зноў зьвядзецца да ўзаемных абвінавачаньняў і плачу над страчанаю моваю».

**А што Вы думаеце пра гэта?**
**Пішэце нам.**
**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Эканамічная праграма расейскай экспансіі

Адразу пасьля гэтага гутарка перайшла пра цану на газ: «[у 2007 годзе] можа быць у разьбежцы ад 125 да 150 даляраў за 1000 куб. мэтраў». Цэны боскія. За «Белтрансгаз» дзякуй.

Трэцяе пытаньне было пра адвязку беларускага рубля ад расейскага. «Я ня бачу тут палітыкі, — пасол зрабіў добрую міну пры дрэннай гульні. — Рэальна беларускі рубель і ня быў прывязаны да дзьвюх валютаў. Я прыехаў сюды ў 2006 годзе, калі суадносіны расейскага рубля да беларускага былі 1:76, а цяпер 1:84. Гэта што, 4% калідор, як меркавалася? Не — за 10%».

Наступным было пытаньне на мільярд. Пры якіх умовах расейскія давальцы вернуцца на беларускія НПЗ?

А ня трэба было грашыць, разводзіць рукамі пасол: «Беларусь пажынае плён нявыкананага пагадненьня 1995 году пра вяртаньне 85% мытаў на сьветлыя прадукты з нафты».

І што ж Беларусь мае зрабіць, каб загрузіць заводы? Трэба падзяліцца з расейскім бізнэсам уласнасьцю, радзіць пасол. «У Беларусі мае быць цікавасьць у тым, каб нафтаперапрацоўчыя прадпрыемствы стратэгічна функцыянавалі з прагнозам на шмат гадоў наперад. ... Уласьніку — беларускай дзяржаве — [трэба] ісьці насустрач здабыўцу — нафтавіку».

А што будзе, калі Беларусь «ня пойдзе насустрач»?

«Замясьціць 20 млн тонаў нафты пасьля 2009 году, калі канчаецца дзеяньне пагадненьня [аб пастаўках нафты], калі расейскія нафтавікі страцяць цікавасьць да гэтага рынку, будзе край як складана».

Давядзецца тады, як цяпер літоўцам у Мажэйкі, завозіць нафту праз Клайпеду, з прычыны дзірак у нафтаправодзе «Дружба».

Мала таго: тады і беларускія трактары напаткае той жа лёс, што цукар і мяса ў 2007-м: «Беларускія вытворцы [сельгастэхнікі] больш залежаць ад расейскага рынку, і нам бы не хацелася супрацьстаяньня».

Прычым Расея не сьпяшаецца. Можа і пачакаць. Галоўнае, каб захоўвалася прывязка беларускай эканомікі да расейскай: «Нас менш хвалюе, чым размовы скончацца, нам бы хацелася, каб гэтыя размовы былі шчырымі. Калі Беларусь бачыць патрэбу падтрымоўваць свайго вытворцу на гэтым этапе: два-тры гады, трэба сказаць пра гэта шчыра».

Падзяліцца гандлёвымі знакамі беларускім кандытарам не дазволяць. Хочаце працаваць — рэцэпт цеста той самы, што і бэнзіну (гл. вышэй пра нафтаперапрацоўку): «Кандытары Расеі цяпер прыходзяць у Беларусь, выкупляюць пакеты ў прыватных асобаў і ставяць пытаньне пра частковы выкуп акцыяў у дзяржавы. Гаворка ідзе пра «Спартак» і некаторыя іншыя фабрыкі». Тады іх пусьцяць на расейскі рынак.

Важным для Расеі зьўляецца і адкрыцьцё беларускага рынку сельгаспрадуктаў. «Мы б хацелі, каб ... міністэрствы сельскай гаспадаркі Беларусі й Расеі сталі дамаўляцца пра адзіную сыстэму падтрымкі сельгасвытворцаў».

Стварэньне беларуска-расейскага касьмічнага комплексу: «Наяўнасьць уласнага касьмічнага апарату — гэта элемэнт прэстыжу ... не выключаюцца і выведныя мэты».

АЭС у Беларусі: «Мы ня ставім палітычных умоваў, зьвязаных з пабудовай АЭС».

Пагадненьне пра стварэньне Адзінай сыстэмы СПА Беларусі й Расеі меркавалася падпісаць у канцы мінулага году. «Усё было гатова да падпісаньня. ... Толькі ў падпісанта зь беларускага боку не было паўнамоцтваў. І гэтыя паўнамоцтвы ніяк не зьяўляюцца. Мы разумеем, што сытуацыя так склалася, што беларускі бок думае. Пазыцыя расейскага боку не зьмянілася».

Карацей, мы пачакаем, мы ня гордыя.

Пакуль доля Расеі ў замежным гандлі Беларусі складае 48,3% (у экспарце 36,7%, імпарце — 58,1%), можна і пачакаць. Нікуды такая краіна не падзенецца. Калі ва Ўкраіне на долю Расеі прыпадае 27% замежнага гандлю, а ў Латвіі — 8%, гэтыя краіны могуць пачувацца вальней.

Расейская дзяржава абараняе інтарэсы расейскага капіталу. І яе паўнамоцны пасол яго пакорны слуга.

Сваё заданьне ў Беларусі на сёньня яны бачаць у захаваньні прывязкі беларускіх прадпрыемстваў да расейскіх карпарацыяў. Пры гэтым, мяркуюць яны, з часам усё роўна будуць узьнікаць нагоды здабыць іх ва ўласнасьць. Лукашэнка аддаў «Белтрансгаз» і Мотавелазавод, аддасьць і іншыя аб'екты, мяркуе Расея.

Пакуль 70% беларускай эканомікі застаюцца ўлучаныя ў расейскія вытворчыя ланцужкі, нічога ў сутнасьці беларуска-расейскіх адносінаў ня зьменіцца, Масква ў тым пэўная.

У гэтым адрозьненьне расейска-беларускіх адносінаў ад расейска-ўкраінскіх ці расейска-малдаўскіх. Якую палітыку вяла беларуская адміністрацыя, такі вынік маем.

Інтэрвію пасла Сурыкава сканчае пару жнівеньскіх адпачынкаў. Новы навучальны год пачынаецца.

### Дактары ацэняць

Камэнтуючы заяву пасла Расеі ў Менску пра магчымае разьмяшчэньне расейскай ядзернай зброі ў Беларусі старшыня міжнароднай камісіі савету рэспублікі нацыянальнага сходу Мікалай Чаргінец заявіў у інтэрвію радыё «Свабода»: «У нас жа кожны мае права выказваць сваю думку. ... Але адны выступы павінны ацэньваць палітыкі, а іншыя — можа, нават дактары. Таму я не разглядаю гэта як правакацыю. Кожны мае права гаварыць, у тым ліку пасол Расеі. Але ніякіх перамоваў на гэту тэму паміж Беларусьсю і Расеяй не вялося і не вядзецца».

# «Да канца году мы пачнем вяшчаньне на спадарожніках «Астра» і «Сірыюс»

Стэнаграма (скарочаная) онлайн-канфэрэнцыі з дырэктаркай тэлеканалу «Белсат» Агнешкай Рамашэўскай.

**— Сп-ня Агнешка, дык калі запрацуе «Белсат»? Мы ўжо зачакаліся. Мікола Завялейскі**

— Спадзяемся, што пад канец гэтага году.

**— Штосьці я не зразумеў: палячка кіруе «Белсатам». Ці ня будзеце навязваць гледачу польскі погляд на сытуацыю ў сьвеце? Kandatovic**

— Па-першае, мовай каналу будзе беларуская мова. Па-другое, у нашай рэдакцыі працуе шмат беларусаў, і гэта іх пазыцыя, а не мая, будзе ўплываць на праграму станцыі.

**— Дзякуй Вам, што ўзяліся рабіць ТВ для беларусаў па-беларуску, і хай Бог Вам памагае. Пытаньне самае галоўнае: на якім спадарожніку будзе яно весьціся? ёпс**

— Да канца гэтага году мы пачнем вяшчаньне на спадарожніках «Астра» і «Сірыюс».

**— Раскажыце крыху пра Вашых бацькоў, калі ласка. Ivan**

— Шмат можна распавядаць, ня ведаю, з чаго і пачаць. Ад паловы 70-х гадоў мае бацькі ўдзельнічалі ў польскім апазыцыйным руху. Абое яны фізікі паводле адукацыі. Калі у 1981 г. у Польшчы ўвялі ваеннае становішча, яны арганізавалі першае падпольнае радыё «Салідарнасьць», за што пазьней трапілі ў турму. Бацька адседзеў 2 гады, маці — год. Па атрыманьні Польшчай незалежнасьці ў 1989 г. майго бацьку выбралі сэнатарам. І на гэтую пасаду яго пераабіраюць па сёньняшні дзень, ужо шосты раз.

**— Якім чынам будуць працаваць белсатаўскія журналісты ў Беларусі, калі да кожнага прыставяць КДБэшніка? Калі ліцэнзіяў на працу, вядома, ня выдадуць, а апаратуру будуць пры нагодзе канфіскоўваць? Нехтатам R.**

— Менавіта таму я не адкажу на гэтае пытаньне.

**— На якім узроўні Вы самі ведаеце беларускую мову? Дзе Вы яе вывучалі? Aleň Jurkaviec**

— Я ўсё разумею па-беларуску. Навучылася «са слыху». А каб навучыцца гаварыць, мне трэба б было паехаць на два тыдні ў нейкую беларускую вёску, бо ў Менску гэта немагчыма.

**— Ці маеце рэцэпт, як НЕ ператварыць Беларусь-ТВ у БТ-наадварот? ЛЛ**

— Наша станцыя ня будзе рупарам прапаганды. Мы будзем супрацьлеглась-цю БТ у тым сэнсе,што будзем гаварыць пра тое, пра што на БТ не гавораць. Мы будзем даваць інфармацыю, якая не зьяўляецца на БТ, альбо зьяўляецца ў перакрыўленым ці ня поўным



**Агнешка Рамашэўская-Гузы**

нарадзілася ў 1962 у Варшаве. У 1987 г. скончыла факультэт гісторыі Варшаўскага ўнівэрсытэту. Брала ўдзел у незалежным студэнцкім руху, была ў кіраўніцтве апазыцыйнага Незалежнага аб’яднаньня студэнтаў (НАС), удзельнічала ў стварэньні падпольнага руху «Свабода і Мір». У 1987—1990 знаходзілася на доктарскай стыпэндыі ў Ельскім унівэрсытэце (ЗША).

У 1990 кінула навуковую кар’еру і вярнулася ў Польшчу. Ад 1991 працавала ў «Życie Warszawy». Ад 1992 на тэлебачаньні. Ад 1999 адмысловы карэспандэнт і рэдактар замежнай рэдакцыі. Працавала ў Косаве, Босьніі, Македоніі, Румыніі, Аўганістане.

У 2004—2005 рыхтавала рэпартажы зь Беларусі і Украіны. Ад ліпеня да лістапада 2005 пастаянна знаходзілася у Горадні і Менску.

У лістападзе 2005 прызначана на пасаду карэспандэнта ў Менску. Але ўжо ў сьнежні беларускія ўлады анулявалі візу.

Аўтар канцэпцыі стварэньня пры Польскім тэлебачэньні асобнага тэлеканалу для Беларусі.

варыянце. Але ў адрозьненьне ад БТ, якое прапагандуе адну палітычную сілу, мы ня маем такога накірунку. Мы хочам прапагандаваць толькі дэмакратыю і свабоду выбару.

**— А якія перадачы плянуюцца — забаўляльныя, інфармацыйныя, фільмы? Ці будзе рэлігійная перадача? цікаўныя**

— У плянах: два разы ў тыдні — мастацкі фільм. Таксама плянуем паказваць сэрыялы (пакуль не магу назваць якія, бо у гэты момант вядуцца перамовы пра іх пакупку). Спадзяемся паказаць некалькі цікавых гумарыстычных праграмаў. Рэлігійных праграмаў пакуль няма.

**— Ці можаце Вы назваць якія-небудзь імёны беларускіх журналістаў, аналітыкаў, якія пагадзіліся працаваць на канале? Сяргей**

— Не магу.

**— Зь дзяцінства глядзеў польскую тэлевізію. Заўсёды яна была лепшая за савецкую, а потым і за «беларускую». Таму спадзяюся, што «Белсат» возьме найлепшае з польскага ТВ. pan Brudas**

— Калі гаварыць пра якасьць, то спадзяюся, што на яе хопіць грошаў (тэлебачаньне — гэта вельмі дарагая рэч).

**— Як можна ўладкавацца на працу? Ці будуць адкрытымі конкурсы? Хто патрабуецца найбольш? Алена**

— Добры журналіст знойдзе шлях, каб да нас трапіць. А нам трэба толькі добрыя. Нам патрэбныя таксама рэдактары, рэжысэры-дакумэнталісты, спэцыялісты па мастацкіх фільмах.

**— Скажыце калі ласка, ці будуць мульцікі і перадачы для дзетак? Дзякуй! Valodzik**

— Дзіцячыя праграмы, у большасьці, вельмі дорага каштуюць. Пакуль што мы не плянуем іх набываць. Гэта ня значыць, што ў будучыні мы ня вернемся да гэтага пытаньня.

**— Частата ў канала будзе стабільнай ці, як у некаторых іншых каналаў, будзе мяняцца? Антон**

— Спадзяюся, што будзе стабільнай.

**— Спадарыня Агнешка, ці не ў Беларусі Вашы карані, мяркуючы па прозьвішчы? Ці будуць у «Белсаце» ўрокі польскай мовы? Яны патрэбныя. Ня ведаю, ці ўганаравалі палякі якім знакам ці помнікам радыё «Вольная Эўропа», а вось у вольнай Беларусі «Белсат» пастараемся ўганараваць, калі толькі ён выканае задуманае. Michal**

— Думаю, ва Ўсходняй Эўропе ўсе маюць супольныя карані. Мае бацькі і я нарадзіліся ў Варшаве. Толькі нядаўна я даведалася, што, магчыма, частка сям'і паходзіць з Гарадзеншчыны і Палесься. Урокаў польскай мовы ня будзе, затое будуць «заняткі па беларускай мове».

Пра помнік мы паразмаўляем пазьней.

**— Пані Агнешка, калі «Белсат» ня будзе ў Беларусі акрэдытаваны, ён ня зможа ані здымаць падзеі, ані браць інтэрвію ў афіцыйных асобаў. Якім чынам вы зьбіраецеся распавядаць пра падзеі ў Беларусі? Алена Гапава**

— Вы зможаце самі пераканацца, якім чынам мы гэта зробім.

**— Якія культурніцкія праграмы будуць на «Белсаце»? Рыгор МФ**

— У задумах шмат музычных праграмаў (напр. гіт-парад). Разглядаем праект цыклу перадачаў, які будзе распавядаць пра вядомых беларускіх артыстаў. Таксама наш вялікі праект – тэлетэатар. Першым спэктаклем на нашай антэне будуць «Тутэйшыя» Янкі Купалы.

**— Як на маю думку, у каналу велізарныя пэрспэктывы. Цяпер у беларускім эфіры занятыя нішы забаўляльных перадачаў у розных варыянтах, расейскай папсы і тэндэнцыйна-аглабельных паліткамэнтароў. Незанятыя нішы беларускай і сусьветнай культуры, палітычнай і эканамічнай аналітыкі, бесстароньняй падачы навінаў, беларускай і сусьветнай музыкі, фільмаў на беларускай мове. Дарэчы, да прыходу на БТ Зімоўскага не было забароны на дубляж фільмаў з францускай мовы на беларускую. Цяпер бясплатна прадстаўленыя французамі фільмы перакладаюцца спрэс на расейскую мову ў выніку вуснай забароны з боку кіраўніцтва БТ. Яшчэ хацелася б, каб канал тэматычна ня быў ані чыста палітычным, ані пуста-забаўляльным. Minak**

— Спадзяюся, што наш канал такі і будзе, хаця, канечне ж, не адразу ўдасца дасягнуць высокай якасьці: стварэньне тэлебачаньня — гэта стварэньне «вялікій фабрыкі». А фільмы перакладаем на беларускую мову.

**— Почему языком вещания избрали белорусский, а не русский? Все-таки по-русски большинство говорит в Беларуси. ДФ**

— Але нацыянальнай мовай беларусаў зьяўляецца беларуская мова. Упэўнена, што Вы пагодзіцеся з тым, што ўсе беларусы яе разумеюць. Па-расейску можна глядзець расейскія каналы.

**— Хто фінансуе «Белсат»? В.В.**

— У дадзены момант праект фінансуецца польскім урадам, які у гэтым годзе прызначыў на яго 4 мільёны эўра. Таксама ўжо ў гэтым годзе да фінансаваньня далучыцца (у невялікім адсотку) літоўскі ўрад. Маем вялікае спадзяваньне на фінансаваньне з боку ЗША.

**— Ці будзе «Белсат» трансьляваць свае перадачы на ЗША? Мікола**

— Пакуль не.

**— Ці ня думаеце Вы, што становішча Вашага бацькі дапамагло Вам у жыцьці і ў прыватнасьці спрычынілася да прызначэньня Вас на пасаду кіраўніка «Белсату»? Eva**

— Мой бацька — чалавек бескампрамісны. Ягоная пасада вельмі часта перашкаджала мне ў жыцьці, хаця мне, вядома ж, дапамагло выхаваньне, ягое ён мне даў. А пасада шэфа «Белсату» — гэта ня гонар, гэта вялікае заданьне.

**— Ці будзе магчымасьць глядзець перадачы тэлеканалу ў Інтэрнэце. Дзякуй. Сяржук**

— Будзе такая магчымасьць. Сайт «Белсату» павінен адкрыцца ў палове кастрычніка.

**— 22 верасьня ў Луцку пройдзе фэст беларускага року «Права быць свабодным». Ці можна будзе відэа-вэрсію пабачыць на канале «Белсат»? Пытаюся, бо сам, на жаль, не змагу трапіць на гэты фэст. witaut**

— Мы плянуем гэта.

### ТВ «Белсат» («Беларусь TV»)

першы ў гісторыі беларускі незалежны спадарожнікавы тэлеканал. Пачатак яго вяшчаньня заплянаваны на сьнежань і мае адбывацца з тэрыторыі Польшчы. Галоўная задача каналу — забясьпечыць беларусаў незалежнай і аб'ектыўнай інфармацыяй. Асноўная мова вяшчаньня — беларуская. Будзе вяшчаць спачатку 15 гадзінаў на суткі.

# Цуд не адбыўся

У гарадзенскіх школах сёлета зноў ня будзе ніводнай беларускамоўнай клясы. Залічэньне першаклясьнікаў скончылася 20 жніўня, але гарадзкія школы дачакаліся ад бацькоў толькі адной заявы на беларускамоўнае навучаньне.

Аднак актывісты гарадзенскага Руху За свабоду, якія два месяцы ладзілі інфармацыйную кампанію «Запішы дзіця ў беларускую клясу», ня лічаць гэта сваёй паразай. «Безумоўна, мы былі б вельмі ўсьцешаныя, калі б бацькі панесьлі заявы на беларускамоўнае навучаньне дзяцей. Але гэта быў бы цуд, пры той моўнай палітыцы, якую вядуць мясцовыя ўлады, — гаворыць Павал Мажэйка, сябра Рады Руху За свабоду. — Мы ставім на пэрспэктыву. І важны якраз гэты першы этап — актыўна інфармаваць бацькоў пра магчымасьць адукацыі на роднай мове, візуалізацыя і фармаваньне іміджу беларускай мовы, як добрай інвэстыцыі ў будучыню іх нашчадкаў».

### Спуск на тармазах

Яшчэ ў траўні гарадзенская Рада Таварыства беларускай мовы дамовілася з гарадзкім аддзелам адукацыі пра стварэньне беларускамоўных першых клясаў у гімназіях №№4, 6, 7, школах №№10, 26, 32.

Аднак ужо праз пару тыдняў ТБМ «забіла ў званы»: ні адміністрацыя школаў, ні чыноўнікі ад адукацыі не праводзяць ніякай інфармацыйнай кампаніі. Незалежная гарадзкая газэта «Ведамасьці» вяла сталы маніторынг сытуацыі, і высьветліла: кіраўнікі многіх школаў нават ня ведалі, што іх установы вызначаныя для стварэньня беларускамоўных клясаў. «Не-не, гэта ня ў нас! — пераконвала журналістаў намесьніца дырэктара СШ №26, апошняй у свой час беларускай школы ў горадзе. — У нас ужо гадоў пяць у беларускамоўныя клясы заяў...




# На Віцебшчыне зьнікла апошняя беларускамоўная гарадзкая школа

У Глыбокім працуе беларускамоўная школа №3, але й там па распараджэньні Міністэрства адукацыі сёлета ствараюцца клясы з навучаньнем па-расейску.

— Пытаньне пра мову навучаньня час ад часу паўстае, — кажа дырэктарка, спн.Моўчун. — Але мы ўгаворваем бацькоў, тлумачым, што мы беларусы, што вучыцца на беларускай мове — не заганна. Але сёлета пераканаць бацькоў не ўдалося: яны пайшлі вышэй за школу, вышэй за райаддзел адукацыі — у міністэрства. І адтуль атрымалі распараджэньне ствараць клясы з расейскай мовай навучаньня. Бо паводле закону аб адукацыі, бацькі маюць на тое права.

Зрэшты, ініцыявалі гэтую акцыю ня толькі бацькі, а нават дзядулі будучых першаклясьнікаў: адзін — чыноўнік Гандлёвай палаты, другі — дэпутат у абласным савеце. Яны арганізавалі збор подпісаў у дзіцячым садку №5, каб была сфармаваная першая кляса з навучаньнем па-расейску. Другая кляса арганізавалася пад іхным уплывам: у асноўным сюды трапілі дзеці глыбоцкіх прадпрымальнікаў і прадстаўнікоў камэрцыйных структураў.

Лідэр глыбоцкай суполкі Таварыства беларускай мовы В.Гарановіч выклаў пратэст супраць русіфікацыі беларускамоўнай школы ў лісьце, які надрукавала недзяржаўная газэта «Вольнае Глыбокае».

Тыя школы былі як адгаворка: людзі б самі аддавалі дзяцей вучыцца пасвойму, каб беларускамоўных людзей бралі на працу ў дзяржаўныя і сілавыя структуры, каб былі беларускамоўныя ўнівэрсытэты і мове вярнулі паважны статус. А так чыноўнікі й дэпутаты, бачыш, куды гнуць.

**Алена Штраль, BulletinOnline.org; МБ**

ваў ня пішуць!» У лепшым выпадку школы разьмяшчалі невялічкую аб’яву пра магчымасьць беларускамоўнага навучаньня на дошцы інфармацыі. Большасьць школьных функцыянэраў спасылаліся на тое, што ў заяве на залічэньне ў першую клясу ёсьць пункт пра мову навучаньня і «гэтага дастаткова».

Да фармаваньня беларускіх клясаў больш-менш адказна паставілася толькі школа №32. Кіраўніцтва школы наведвала бацькоўскія сходы ў выпускных групах дзіцячых садкоў, размясьціла аб’яву ў гарадзкой газэце. Дый абвестка на дошцы інфармацыі была зробленая відавочна не «абы з рук» — заўважная, вялікі аркуш і тлусты шрыфт.

Менавіта ў гэтую школу і была пададзеная адзіная ў горадзе заява на беларускамоўнае навучаньне. Аднак гэты першаклясьнік будзе вучыцца ў расейскай клясе, бо ён так і застаўся адзіным.

## «Мы нікога не зьбіраемся ўгаворваць!»

На працягу ліпеня-жніўня ў мікрараёнах вызначаных школаў рэгулярна зьяўляліся каляровыя абвесткі гарадзенскага Руху За свабоду «Запішы дзіця ў беларускую клясу».

«Беларуская мова — гэта мова эліты. Беларуская мова — гэта мова будучыні» — гэтыя тэзісы аўтары пацьвярджалі аргумэнтамі: «Самая дарагая рэкляма на беларускім рынку робіцца па-беларуску. Сапраўдны рок у Беларусі — беларускамоўны. Павялічваецца колькасьць выпускнікоў, якія здюць цэнтралізаванае тэставаньне па-беларуску. У замежных ВНУ павялічваецца набор студэнтаў на вывучэньне беларускай мовы».

«Выбар беларускамоўнай клясы для дзіцяці — гэта сьвядомы выбар з боку бацькоў. Мы нікога не зьбіраемся ўгаворваць! — кажа Павал Мажэйка. — Пры сёньняшнім стаўленьні ўладаў да беларускасьці навучаньне ў беларускамоўным садку не гарантуе таго, што дзіця зможа працягнуць адукацыю па-беларуску ў школе, а тым больш не гарантуе беларускамоўнай вышэйшай адукацыі. Можна казаць, што, аддаючы дзяцей у беларускую клясу, бацькі цяпер пагаджаюцца на купу праблемаў. Таму мы ставім задачай паказаць, што сёньняшняя моўная сытуацыя ў краіне — часовая, і добрае валоданьне беларускай мовай будзе несумненнай перавагай для кожнага, хто будзе тут жыць і працаваць».

Гарадзенскі Рух За свабоду распрацаваў шэраг мерапрыемстваў па папулярызацыі ня толькі мовы, але і ў цэлым беларускай культуры. Цалкам верагодна, што ўжо налета ў Горадні набяруцца тыя самыя дзесяць заяваў на беларускамоўнае навучаньне, якіх дастаткова для стварэньня асобнай клясы.

## Бацькі робяць працу чыноўнікаў

Але відавочна галоўныя праблемы ў стварэньні беларускамоўнай клясы з гэтага толькі пачнуцца. Гэта пацьвярджае досьвед ініцыятыўных бацькоў, што ўжо год дамагаюцца ў горадзе стварэньня беларускамоўнага садку.

Іх знайшлося якраз 10 трохгодак — столькі патрэбна для стварэньня асобнай беларускамоўнай групы. Але паводле словаў аднаго з бацькоў, гарадзенскага юрыста Ігара Кузьміча, гарадзкое ўпраўленьне адукацыі заявіла, што няма падрыхтаваных выхавацеляў, няма вольнага садку, няма рэсурсаў.

«Садок патрэбны ня дзеля таго, каб дзеці проста вывучалі беларускую мову. Папершае, гэта стварэньне для іх беларускамоўнага сацыяльнага асяродзьдзя. А па-другое: якасьць іх выхаваньня павінна быць вельмі высокай. Бо да іх і патрабаваньні будуць вышэйшыя, чым да іншых дзяцей, яны ж будуць вылучацца з агульнай масы. І вылучацца яны павінныя ў лепшы бок».

Цяпер бацькі робяць працу чыноўнікаў, шукаюць пералічаныя «няма» — прычым зусім без гарантыі, што іх высілкі ня будуць марнымі, напрыклад, што ўпраўленьне адукацыі прыме на працу прапанаваную бацькамі выхавацельку.

Немалаважнае для бацькоў месцазнаходжаньне іх будучага садку: ён павінен быць недалёка ад той школы, у якой урэшце будзе створаная першая ў Горадні беларускамоўная кляса.

**Раман Суліма**

# СЬЦІСЛА

## Студэнтам дадуць па 6200 рублёў за здыманьне жытла

Пачынаецца навучальны год, і пачынаюцца праблемы з жытлом для студэнтаў. Пэдунівэрсытэт забясьпечвае месцамі ў інтэрнаце 36% студэнтаў, БДУІР — 50%. Нават у ВНУ №1, БДУ, толькі 60% іншагародніх студэнтаў будуць заселеныя ў інтэрнаты. Тым, хто не атрымаў інтэрната, дзяржава выплачвае кампэнсацыю на аплату здыманага жылля. У БДПУ яна складае 25% базавай велічыні — 7750 руб. У БДУ 6200 руб. Зьняць пакой каштуе каля ста даляраў... Інтэрнатаў бракавала адвеку, бракуе і сёньня, але нічога з гэтым не мяняецца.

**МБ**

## Мільён эўра для беларускіх студэнтаў

Столькі вылучыла нідэрляндзкае Мінадукацыі на стыпэндыі для беларусаў, якія з палітычных прычынаў ня могуць вучыца на радзіме. Праграма разьлічаная і на маладых зымбабвійцаў. Ахвотныя вывучыцца на бакаляўра ці магістра могуць падаваць заяўкі на стыпэндыю цягам усяго акадэмічнага году. Дадатковая інфармацыя і анкета прэтэндэнта — на сайце «Studying in Holland».

**Ягор, АК**

## Першая ў Беларусі праваслаўная гімназія

31 жніўня ў Бабруйску адкрыецца першая ў Беларусі праваслаўная гімназія. Праект рэалізуецца ў рамках дамовы між экзархатам РПЦ і Міністэрствам адукацыі. За парты сядуць 17 хлопчыкаў і дзяўчатак. Тэрмін навучаньня — чатыры гады. Мова расейская (анягож).

## Бацькі паўсталі супраць аддзелу адукацыі

Яны ня згодныя з тым, што іх дзяцей пераводзяць у іншую школу, пра што ім паведамілі перад самым пачаткам навучаньня. У Карэлічах дзьве школы, разьмешчаныя па розныя бакі пасёлку. Бацькі, чые дзеці мусілі пайсьці ў школу №2, падалі заявы яшчэ ў чэрвені. Адказ з райаддзелу адукацыі ды адміністрацыі школы быў станоўчы. Аднак пры канцы жніўня са школы пачалі тэлефанаваць і папярэджваць, што частку дзяцей перавядуць у гімназію, былую школу №1. «Нашы дзеці — ня статак авечак, што можна пераганяць зь месца на месца», — абураецца бабуля першаклясьніцы. Іх сям’я жыве літаральна праз дарогу ад 2-й школы. Пасьля званкоў журналістаў, адміністрацыя паабяцала вырашыць пытаньне на карысьць бацькоў.

**СП**

# Самі з вусамі

А.Лукашэнка загадаў згарнуць замежныя інвэстыцыі ў півапарную галіну.

На думку А.Лукашэнкі, у нас дастаткова ўласных сродкаў і магчымасьцяў.

Стратэгія далейшага разьвіцьця піваварнай галіны Беларусі стала нагодай для нарады ў прэзыдэнта. А. Лукашэнка паставіў пытаньне: «Нам важна вызначыцца: прыцягваць замежныя кампаніі ў гэты выключна высокапрыбытковы бізнэс або самім разьвіваць гэтую галіну». І тут жа дылему разьвязаў. «Якая дзяржава, маючы такі вялікі рынак, як у нас, незадаволены попыт, адмовіцца ад гэтага высокапрыбытковага бізнэсу? Дык чаму мы адмаўляемся і аддаём яго ў рукі замежным кампаніям? Для таго, каб выйсьці на самы сучасны ўзровень, як, дапусцім, на ААТ «Крыніца», нам неабходна каля $125 млн. Усяго $125 млн на мадэрнізацыю ўсяго сэктара, каб атрымаць піва, якое мы хочам!». Свае словы прэзыдэнт падмацаваў думкай, што мадэрнізацыя піўзаводаў на сродкі дзяржавы дазволіць у будучыні пры неабходнасьці прадаць прадпрыемствы значна даражэй. Аб'ём спажываньня піва сярод беларусаў узрастае штогод на 20%.

Як адзначае БелТА, урад прадставіў прэзыдэнту ўякасьці выйсьця з сытуацыі варыянт прыватызацыі бровараў замежнымі кампаніямі, аднак «дыскусія, якая разгарнулася на нарадзе, паказала, што аргумэнты прыхільнікаў продажу вядучых прадпрыемстваў піваварнай галіны замежным інвэстарам аказаліся недастаткова важкімі і не выглядалі пераканаўча». Між іншага, такі варыянт прадугледжваў шэраг умоваў, сярод якіх – захаваньне працоўных месцаў і спэцыялізацыі прадпрыемстваў, вытворчасьць піва з уласнай сыравіны ды нарошчваньне экспартнага патэнцыялу. Кіраўнік Акадэміі навук выказаўся, што пры неабходнасьці можна прыцягнуць у галіну замежныя інвэстыцыі і бязь зьмены формы ўласнасьці прадпрыемстваў.

Варта адзначыць, што яшчэ год таму Лукашэнка даручыў ураду распрацаваць умовы конкурсу інвэстыцыйных прапановаў, у тым ліку па ўваходжаньні замежных кампаніяў на беларускі піваварны рынак. Патэнцыйныя інвэстары адрэагавалі апэратыўна: прыканцы мінулага году ВВН набыў за $18,5 млн 30% акцыяў ААТ «Піўзавод «Аліварыя», і тэмпы росту гэтага бровару адразу сталі найвышэйшымі ў краіне. Так паводле вынікаў першых 6 месяцаў 2007 году аб'ём продажу прадукцыі ўзрос на 26 % у параўнаньні зь мінулым годам, а аб'ёмы вытворчасьці за гэты ж пэрыяд вырасьлі на 29 %. Усяго цягам бягучага году інвэстар плянуе ўкласьці ў «Аліварыю» $9,7 млн. Тое самае і з бабруйскай кампаніяй «Сябар», утворанай пры ўдзеле Detroit Investment Ltd. Цягам году бабруйская кампанія ўпэўнена пасунула нядаўніх лідэраў рынку. Між тым тэмпы росту збыту прадукцыі «Крыніцы», куды заходнія інвэстары не прыйшлі, сёлета найніжэйшыя, калі не лічыць паміраючых дробных бровараў.

Справа ў тым, што заходнія бровары інвэстуюць ня толькі ў тэхналёгіі, але і ў маркетынг, у чым маюць немалы досьвед.

Са словаў Лукашэнкі вынікае, што з прыватызацыяй пры ўдзеле замежных інвэстараў можна пацярпець, а капіталізацыя гэтых прадпрыемстваў у будучыні дазволіць прадаць іх даражэй.

На сёньня ж галоўная праблема бровараў — закрэдытаванасьць. Тая ж «Крыніца», маючы рэнтабэльнасьць каля 40% ды працуючы ў рэжыме 100%-й загружанасьці, адчувае дэфіцыт абаротных сродкаў.

На сёньня свае паслугі беларускаму боку акрамя вышэйпамянёных кампаніяў прапанавалі Heineken, SABMiller і кампанія Group Soufflet. Апошняя цікавіцца магчымасьцю прыватызаваць «Белсолад», Heineken — разглядала магчымасьць укласьці сродкі ў ААТ «Берасьцейскае піва» ды «Лідзкае піва».

Да першай дэкады верасьня А. Лукашэнка даручыў удзельнікам нарады выпрацаваць адзінае рашэньне па дадзенай праблеме, падмацаванае праектамі адпаведных нарматыўных дакумэнтаў.

**Сямён Печанко**

**У Беларусі вытворчасьцю піва** займаюцца 12 спэцыялізаваных арганізацыяў розных формаў уласнасьці, зь іх 6 буйных беларускіх кампаніяў выпускаюць амаль 97% ад усяго піва. Праграма разьвіцьця піваварняў прадугледжвае рост вытворчасьці піва да 60 млн дал (27,2 млн дал у 2005 г.).



СЯМЁН ПЕЧАНКО

# Як Польшча вырашае кватэрнае пытаньне

Польскі прэм'ер прэзэнтаваў новую праграму жыльлёвага будаўніцтва: «Кватэру ў растэрміноўку — кожнаму па кішэні».

Прэм’ер Качыньскі паведаміў пра пачатак новай праграмы жыльлёвага будаўніцтва. Дзяржава зьбіраецца інвэставаць пабудову сацыяльнага жытла. Акрамя таго, бюракратаў пазбавяць уплыву на выдзяленьне пляцаў пад будоўлі.

Стратэгія ўраду — будаўніцтва кватэраў, якія жыхары будуць аплачваць у растэрміноўку некалькі дзесяцігодзьдзяў. Праз 10—20—30 гадоў такія кватэры будуць пераходзіць ва ўласнасьць жыхароў. Паводле словаў прэм’ера, трохпакаёвая кватэра будзе каштаваць сям’і 700 злотых штомесяц (каля 260 даляраў).

Міністар будаўніцтва Міраслаў Баршч паведаміў, што падрыхтаваны новы закон. Паводле яго зь сельскагаспадарчага фонду аўтаматычна выводзяцца ўсе землі 4—6 разрадаў у межах гарадоў і прыгарадах. Усе яны аддаюцца пад індывідуальную забудову. Згодна з законам, мясцовыя ўлады мусяць выдаваць дазвол усім ахвотным пабудавацца індывідуальна на працягу двух месяцаў. Калі такога дазволу ня выдадзена, рашэньне прымаецца на карысьць хадайніка аўтаматычна.

Гэты крок мае спыніць карупцыю ў сфэры выдзяленьня пляцаў, калі чалавека мурыжылі бюракраты.

Урад спадзяецца, што гэтыя крокі зробяць жытло даступным для палякаў з даходамі ніжэйшымі за сярэднія.

Рынкавыя цэны на кватэры ў Польшчы прыкладна ў 1,5—2 разы вышэйшыя, чым у адпаведнага памеру гарадах Беларусі. Праўда, і сярэдні заробак у Польшчы ў 2,5 разы вышэйшы за беларускі, і сярэдняя забясьпечанасьць жытлом лепшая на 20%.

**Марына Салавей**

# Беларусы зрабілі тралейбус XXI стагодзьдзя




**На Сьвяце гораду, 8 верасьня менчукі змогуць упершыню падзівіцца на тралейбус новага пакаленьня, які можа рухацца без падключэньня да крыніцы току. Улетку 2008 году такая мадэль зьявіцца і на гарадзкіх маршрутах. Тралейбус падтрымлівае камфортную для пасажыраў тэмпэратуру ў салёне і аўтаматычна паведамляе пра непаладкі на дыспэтчарскі пункт.**

## СЬЦІСЛА

### «Сябар» будзе выпускаць сок

Фінансуе праект Міжнародная фінансавая карпарацыя (IFC). На першым этапе плянуецца ўкласьці ў прадпрыемства па выпуску соку і напояў з утрыманьнем соку $20 млн. Новае прадпрыемства паўстане на базе Бабруйскага кансэрвавага заводу, які прастойвае. У плянах — выпуск каля мільёна гекталітраў у год. Гэта больш за агульны аб’ём соку, спажытага беларусамі ў 2006 г. Міжнародная фінансавая карпарацыя (IFC) займаецца падтрымкай прыватнага сэктару эканомікі ў краінах зь пераходнай эканомікай.

### Айчынныя вытворцы мяса нясуць страты

За першае паўгодзьдзе аб’ём экспарту мяса ў Расею скараціўся на 36,5%. Рост складзкіх запасаў сягае 90%. Экспэрты вылучаюць дзьве прычыны — палітычную і эканамічную. Ад пачатку году Рассельгаснагляд не атэставаў шэраг мясакамбінатаў, да таго ж цэны беларускага мяса не заўжды канкурэнтныя.

**СП, паводле «Белорусы и рынок»**

### Меншчына пераходзіць на ветракі

Мінскі аблвыканкам абмяркоўвае будаўніцтва ветраэнэргетычных агрэгатаў у 2008—2010 гадах. Найбольш мэтазгодным будаўніцтва прызнана ў Дзяржынскім, Валожынскім, Менскім, Маладачанскім і Лагойскім раёнах. Усяго маюць збудаваць 705 агрэгатаў агульнай магутнасьцю 705 МВт.

### «Белвылічтэхніку» прадалі за $3 млн

Пакет акцый ААТ «Белвылічтэхніка» прададзены па цане Br6 млрд. «Белвылічтэхніка» займаецца рамонтам і абслугоўваньнем сродкаў вылічальнай тэхнікі і арггэхнікі.

**СП; БЕЛТА, «Звязда», «Белорусы и рынок»**

# Усёмагутны рубель

Расійская эканоміка перажывае добрыя часы, і ім не відаць канца. Піша **Эндру Крамэр** з газэты «Нью-Ёрк Таймс».

Расія штодня атрымлівае 530 млн даляраў ад экспарту нафты. Калі цана нафты зьнізіцца, упадзе й вартасьць рубля. Калі ж не — бум, выкліканы наплывам «лёгкіх» грошай, можа пагражаць іншаю небясьпекаю. Шмат дзе празьмерны спадзеў на «нафтадаляры» прывёў да недаінвэставаньня прадпрыемстваў нянафтавага сэктару і заняпаду прамысловасьці. Кіраўніцтва Расеі, здаецца, распараджаецца даходамі даволі разумна.

## Рэзэрвавы фонд

Каб пераадолець нэгатыўныя зьявы, выкліканыя павелічэньнем вартасьці рубля, Расія адкладае на чорны дзень грошы, атрыманыя з гандлю нафтаю, папаўняючы імі Стабілізацыйны фонд. У ім ужо больш за 120 млрд даляраў. У студзені Масква падзеліць яго на два меншыя фонды: Рэзэрвавы фонд і Фонд нацыянальнага дабрабыту. Апошні мае выкарыстоўвацца для дзяржаўных інвэстыцыйных праграмаў.

Расія мае валютнымі рэзэрвамі, улічваючы й рэзэрвы Цэнтрабанку Расіі, памерам 413 млрд даляраў, што ў пераліку на душу насельніцтва — самы высокі паказьнік сярод усіх дзяржаваў сьвету. У выпадку абвалу цэнаў на нафту Масква будзе скарыстоўваць гэтыя рэзэрвы, каб захаваць стабільнасьць рубля. Разам з тым, у вачох інвэстараў наяўнасьць рэзэрваў надае эканоміцы аўру стабільнасьці.

## Стабільная эканоміка

Расійская эканоміка стаіць на трывалых фундамэнтах. Перш за ўсё, экспарт нафты — не адзіная крыніца павышэньня вартасьці рубля. Так было да 2007 г., але на сёньня важкім чыньнікам сталіся замежныя інвэстыцыі. Прыплыў замежнага капіталу за першыя 6 месяцаў гэтага году павялічыўся ў параўнаньні з аналягічным пэрыядам 2006 г. на 360%. Паводле Дзяржкамітэту РФ па статыстыцы, толькі 30% інвэстыцыяў зьвязаныя са здабычаю нафты ды іншае сыравіны.

Аналітыкі бяруць пад увагу і тое, што называюць «здароваю расійскаю макраэканомікаю». Інфляцыя застаецца ў разумных межах. А жорсткі кантроль над грамадзтвам не дазваляе палітычным сілам і сацыяльным групам вылучыць патрабаваньні росту выдаткаў на сацыяльныя мэты. Такая сыстэма кіраваньня нагадвае аўтарытарную «азіяцкую мадэль» эканамічнага разьвіцьця.

Сёлета валавы ўнутраны прадукт вярнуўся да ўзроўню 1990 г. Заводы, трубаправоды, дарогі, порты ды іншыя прамысловыя аб’екты, што некалі бязьдзейнічалі, цяпер працуюць з максымальнаю даходнасьцю. За даляр можна набыць 25,47 рублёў, за апошні час вартасьць расійскае валюты ўзрасла на 20%.

## Заніжаны курс рубля

А калі вымяраць парытэтам купляльнае вартасьці, даляр мусіць сёньня каштаваць каля 15 рублёў, паведамляецца ў дакладзе фірмы Merrill Lynch. Рубель — другая паводле недаацэненасьці сусьветная валюта. Першая— кітайскі юань.

Колькасьць прыватных ашчадных рахункаў у расейскіх рублёх узрасла ў першым квартале 2007 г. на 6,8 %, колькасьць укладаў у іншых валютах засталася нязьменнаю. Усё гэта натуральным чынам вядзе расійскую адміністрацыю да галавакружэньня ад посьпехаў.

## Рызыка залежнасьці ад замежных інвэстыцыяў

Аднак трывалы эканамічны рост залежыць ад пастаянства замежных інвэстараў. Інакш аб’ёмы імпарту ўжо ў 2010 г. могуць перавысіць паступленьні ад экспарту нафты, перасьцерагае міністар фінансаў Расіі Аляксей Кудрын.

Калі так станецца, Расія зробіцца залежнаю ад замежных інвэстыцыяў, якія дазваляюць утрымаць моц рубля й зьвязанае зь ім павышэньне жыцьцёвага ўзроўню. Падобная сытуацыя назіраецца ў Злучаных Штатах, але расійская эканоміка значна менш стабільная.

Мінулым летам Расія скасавала абмежаваньні ў гандлі рублём, што ператварыла яго ў свабодна канвэрсаваную валюту й зрабіла магчымым прыток капіталу. Памер прыватнага капіталу, які скіраваўся ў Расію цягам першых 6 месяцаў гэтага году, склаў 67,1 млрд даляраў — болей, чым за ўсе першыя дзесяць гадоў па развале Савецкага Саюзу.

Хаця расійскія ўлады пастаянна палохаюць нацыяналізацыяй нафтавага сэктару, інвэстары, тым ня менш, мяркуюць, што грошы, якія можна ў ім зарабіць, **вартыя рызыкі**.

**Пераклала Марына Салавей**

## Ісламіст — кіраўніком Турцыі



У аўторак у Турцыі адбыўся трэці тур прэздэынцкіх выбараў. Перамогу на іх атрымаў міністар замежных спраў Абдула Гюль. Ён стаў першым прэзыдэнтам сучаснай Турцыі зь ісламіцскім мінулым. Ваенныя і сьвецкія колы бачаць у перамозе Гюля — прававерната мусульманіна — пагрозу прынцыпу аддзяленьню рэлігійных інстытутаў ад дзяржавы.

Жонка Гюля носіць мусульманскую хустку, што забаронена ў дзяржустановах Турцыі, у тым ліку і прэзыдэнцкім палацы.

Але сам Гюль неаднаразова заяўляў, што ня будзе мяняць канстытуцыі і зьяўляецца прыхільнікам прынцыпу падзелу рэлігійных інстытутаў і дзяржавы.

Гюль, які заваяваў рэпытутацыю вопытнага дыпляматa ў перамовах аб уступленьні ў Эўрасаюз, абяцаў стаць прэзыдэнтам усяго турэцкага народу.

У левалібэральных колах ў абраньні Гюля бачаць перамогу малазабясьпечаных слаёў насельніцтва, якія трымаюцца больш кансэвартыўных поглядаў, якіх да гэтай пары ў палітыку не пускала сьвецкая эліта, якая падтрымліваецца арміяй.

**АГ**

## Беларусы ратуюць грэкаў усё лета

У сувязі з пажарамі ў Грэцыі наша краіна паслала на падмогу верталёт Мі-26. Ён штодзённа знаходзіцца ў певетры па 8-10 гадзін. Выконваюцца задачы па тушэнні ўзгаранняў як на астравах, так і на матэрыковай частцы краіны.

**МБ**

# Мін'юст перабблытаў партыі

Міністэрства юстыцыі вынесла афіцыйныя папярэджаньні шасьці палітычным партыям Беларусі.

Сярод іх ёсьць як апазыцыйныя (Партыя БНФ, БСДП (Г), Беларуская партыя «Зялёных»), так і тыя, што калісьці ствараліся ўладамі, а цяпер нікому не патрэбныя: (Сацыяльна-спартыўная партыя, Сацыял-дэмакратычная партыя народнай згоды, Рэспубліканская партыя).

Усім партыям папярэджаньні былі вынесеныя за адну і тую ж правіну: парушэньне артыкулу 10 Закону «Аб палітычных партыях». Згодна з новай рэдакцыяй гэтага закону кожная партыя мусіць мець арганізацыйныя структуры ў большасьці абласьцей краіны (ня менш, чым у чатырох), а таксама Менскую гарадзкую структуру. Партыі былі папярэджаныя, што ў выпадку далейшага ігнараваньня іх дзейнасьць можа быць прыпыненая ці яны могуць быць ліквідаваныя.

Юрыст Партыі БНФ Уладзімер Лабковіч кажа, што насамрэч ягоная партыя мае структуры толькі ў Гомельскай, Берасьцейскай і Менскай абласьцях. «Мы ня раз рабілі спробы зарэгістраваць структуры, але сутыкаемся з праблемай юрыдычных адрасоў. Нават калі знаходзім памяшканьне, то праз пэўны час прыходзяць людзі, якія кажуць, што праблемы з тэхпашартам ці з чым-небудзь яшчэ і ўсё пачынаецца наноў. У сьнежні 2005 году нам ужо выносілі папярэджаньні за гэтае самае парушэньне. Лічу, што гэта зьвязанае з парлямэнцкімі выбарамі. Перад выбарамі 2004 году ва ўсёй краіне закрылі сотні недзяржаўных арганізацыяў, перад леташняй прэзыдэнцкай кампаніяй прынялі папраўкі ў Крымінальны кодэкс, цяпер прыйшла чарга партыяў», — мяркуе Ўладзімер Лабковіч.

Кіраўнік справаў БСДП (Г) Анатоль Сідарэвіч лічыць, што ягонай партыі папярэджаньне было вынесенае памылкова. «Мы атрымалі афіцыйны ліст ад Міністэрства юстыцыі, дзе гаворыцца, што на падставе папярэджаньня ад 29 лістапада 2005 году нам выносяць яшчэ адно паўторнае папярэджаньне. Але за тую дату мы не атрымлівалі ніякіх папярэджаньняў ад Мін'юсту. Лічу, што папярэджаньне накіраванае нам не па адрасе. Тым больш, што летась мы зарэгістравалі Гарадзенскую абласную структуру БСДП (Г), якая стала чацьвертай у краіне, таму не разумею, якія прэтэнзіі могуць быць да нас. Здаецца, што нас проста пераблыталі з БСДГ Станіслава Шушкевіча», — кажа Анатоль Сідарэвіч. Нагадаем, што БСДП (Г) сёлета ўжо атрымлівала адно папярэджаньне – ад 1 лютага за правядзеньне аргкамітэту «Саюзу левых партый» за межамі Беларусі.

Ціск на палітычныя партыі за апошнія месяцы стаў ледзь ня нормай. Вярхоўны суд Беларусі прыпыніў на шэсьць месяцаў дзейнасьць ПКБ, бліжэйшымі днямі пачнецца разгляд аналягічных справаў Беларускай экалягічнай партыі БЭЗ і Беларускай жаночай партыі «Надзея». Таксама сын старшыні ФПБ Леаніда Козіка Андрэй судзіцца з Аб'яднанай грамадзянскай партыяй.

Нагадаем, каб ліквідаваць дзейнасьць партыі ці яе прыпыніць дастаткова ўсяго аднаго папярэджаньня.

**Зьміцер Панкавец**

### Міністэрства юстыцыі папрасіла прабачэньня ў казулінцаў

**У панядзелак офіс БСДП (Г) наведала прадстаўніца Міністэрства юстыцыі. Яна папрасіла вярнуць ліст Міністэрства ад 22 жніўня «Аб вынясеньні пісьмовага папярэджаньня БСДП (Г)». Кабета растлумачыла, што ліст быў накіраваны памылкова, а насамрэч папярэджаньне было вынесенае сацыял-дэмакратам Станіслава Шушкевіча.**

## СЬЦІСЛА

### Беларусь уводзіць візавыя абмежаваньні для амэрыканскіх чыноўнікаў

«У адказ на непрыязныя дзеяньні Злучаных Штатаў Беларусь будзе ажыцьцяўляць адпаведныя візавыя абмежаваньні ў дачыненьні да пэўных катэгорый амэрыканскіх афіцыйных асобаў», — паведаміла Міністэрства замежных спраў Беларусі ўвечары 22 жніўня. Адначасова ўлады Беларусі плянуюць у аднабаковым парадку спрасьціць афармленьне візаў грамадзянам ЗША для ўезду з гасьцявымі і дзелавымі мэтамі.

### «У Берасьці я яшчэ не сядзеў»

Судзьдзя Маскоўскага раёну Берасьця Вольга Сьмірнова вынесла прысуд Паўлу Севярынцу: 15 сутак арышту. Севярынца зьвінавацілі паводле арт. 23.34 АК «Парушэньне парадку арганізацыі або правядзеньня масавых акцый». Паўла і яшчэ 30 чалавек затрымалі ў нядзелю ў Берасьці падчас сходу актывістаў Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі. «У Берасьці я яшчэ не сядзеў», — пажартаваў Павал.

### У «Родным слове» новы рэдактар

Загадам Мінадукацыі на пасаду галоўнага рэдактара часопісу «Роднае слова» прызначаны Ўладзімер Куліковіч, кандыдат філялягічных навук. Раней ён займаў пасаду дацэнта катэдры сучаснай беларускай мовы філфаку БДУ. З прыходам у рэдакцыю новага кіраўніцтва тут зьявілася новая пасада — адказны сакратар. Загадам новага галоўнага рэдактара ад 13 жніўня яе заняў Дзьмітры Літвіненка, які прыйшоў у «Роднае слова» зь БелТА.

Калегі сп.Куліковіча і Літвіненкі ацэньваюць іх погляды як вельмі блізкія да цяперашняй улады. Сп.Куліковіч славуты таксама тым, што выклікаў замяшаньне на адной з алімпіядаў па беларускай мове. Ён рыхтаваў заданьні для яе, сярод іх было: хто большы, карлік ці ліліпут?

### У КДБ ёсьць карта зь месцамі расстрэлаў

Храм у гонар навамучанікаў будзе створаны ў крыпце праваслаўнага сабору ў горадзе Мазыр. У 1937 г. саветы расстралялі тамака больш за 2 тысячы чалавек. Сьпісы забітых маюцца ў архіве ўпраўленьня КДБ па Гомельскай вобласьці. Дарэчы, у архівах спэцслужбаў маецца і карта месцаў расстрэлаў.

**ЗП, СП, Эўрарадыё.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Моладзь парвала Пуціна

У аўторак прайшла прэс-канфэрэнцыя моладзевых лідэраў, якія ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы «Эўрапейскага маршу» 14 кастрычніка.

Першым выступіў Яўген Афнагель. Ён заявіў: «Учора пасол Расеі Сурыкаў дазволіў сабе заявыо, што на тэрыторыю нашай краіны зноў будзе ўведзеная ядзерная зброя. Гэта робіцца ў той час, калі Станіслава Шушкевіча вылучаюць на Нобэлеўскую прэмію міру акурат за тое, што ён вывеў зь Беларусі стратэгічную ядзерную зброю. У сувязі з гэтым мы вырашылі крыху зьмяніць лёзунгі, пад якімі пройдзе акцыя 14 кастрычніка. Марш пройдзе пад лёзунгамі: «Не — расейскім вайсковым базам, не — ядзернай зброі!».

Пасьля гэтых словаў усе пяцёра ўдзельнікаў прэс-канфэрэнцыі ўзялі ў рукі партрэты Пуціна і публічна парвалі іх.

**ЗП**

# Першакурсьнікі ўскруцілі цэны

Арэнда сталічнага жылля падаражэла на 20—50 даляраў за адзін месяц.

Трэці год запар менавіта ў жніўні адбываецца скачок цэнаў на арэнду жытла.

Сёньня мінімальная цана арэнды аднапакаёўкі ў найгоршых раёнах дасягнула 220—230 даляраў.

Мінімальны кошт арэнды двухпакаёвак дасягнуў 250—260 даляраў, трохпакаёвак — 300 даляраў плюс, вядома, камунальныя выплаты.

Пакойчык з мэбляй «пад ключ» сёньня каштуе ад 70 даляраў у Шабанах да 150 даляраў каля мэтра ў ахайных будынках.

На думку рыэлтэраў, высокія цэны захаваюцца і пасьля засяленьня студэнтаў.

## 23 жніўня

### Тацяне Севярынец не дазволілі працаваць

Віцебская абласная судовая калегія адмовіла **Тацяне Севярынец** ва ўзнаўленьні на працы, пацьвердзіўшы рашэньне Першамайскага раённага суду пра законнасьць ейнага звальненьня. Спн.Севярынец лічыць вырак палітычна матываваным. Маці Паўла Севярынца звольнілі зь сярэдняй школы №40 нібыта за прагулы.

### Акцыя супраць затрыманьняў прайшла без затрыманьняў

Акцыя пратэсту супраць пазапраўных затрыманьняў і зьбіцьця маладых актывістаў апазыцыі прайшла на скрыжаваньні вуліцаў Няміга і Гарадзкі Вал. Дваццаць чалавек разгарнулі расьцяжку «Пакуль ты сядзіш дома, яны зьбіваюць дзяўчынак» і плякаты, на якіх была інфармацыя аб падзеях 16 жніўня. Акцыя доўжылася 15 хвілінаў і скончылася без затрыманьняў.

### Не зарэгістравалі «Вясну»

**Міністэрства юстыцыі** адмовіла ў рэгістрацыі **грамадзкаму праваабарончаму аб'яднаньню «Вясна»**. Арганізацыю не зарэгістравалі, бо 20 з 69 заснавальнікаў мелі адміністрацыйныя пакараньні, а некаторыя зь іх нават пяць разоў. Таксама незадаволенасьць у Мін'юсьце выклікаў статут «Вясны», бо «зьмяшчае не канкрэтныя мэты і прадугледжвае магчымасьць дадзенага аб'яднаньня дзейнічаць у дасягненьні іншых, не ўказаных у статуце, мэтаў». Прыкладна па той самай прычыне месяц таму было адмоўлена ў рэгістрацыі і менскай гарадзкой арганізацыі «Маладога фронту».

### Кадэбісты дапытваюць «каліноўцаў»

20-гадовага пінчука **Ігара Салаўя** міліцыянты выклікалі ў ГУУС да **маёра Нікалайчанкі**. Пасадзілі ў аўтамабіль, але адвезьлі не ў ГУУС, а ў гатэль «Прыпяць». Там трое людзей у цывільным, зь якіх пасьведчаньне супрацоўніка КДБ паказаў толькі адзін, вялі перакрыжаваны допыт хлопца. Распытвалі пра навучаньне ў Польшчы. Пры гэтым яны пагражалі хлопцу вялікімі непрыемнасьцямі ў выпадку, калі камусьці раскажа пра гэтую «гутарку».

## 25 жніўня

### Падтрымалі Азарку

У ноч зь пятніцы на суботу ў Нясьвіжы міліцыянты затрымалі **Насту Палажанку**, **Арцёма Дубскага** і **Аляксандра Жукава** для праверкі дакумэнтаў і абвінавацілі ў нанясеньні надпісу «Беларусь — гэта сьвятое». Маладыя людзі прыехалі падтрымаць **Насту Азарку**, супраць якой узбуджаная крымінальная справа за палітычную дзейнасьць. Н.Палажанку, як няпоўнагадовую, адправілі дамоў. Астатнія ноч правялі ў пастарунку.

## 26 жніўня

### Начное затрыманьне вернікаў у Гомелі

У Гомелі міліцыянты заблякавалі прыватны дом, у якім праходзіла сустрэча жыхароў гораду з былым вязьнем ГУЛАГу, пастарам закрытай уладамі Беларускай эвангельскай царквы **Эрнэстам Сабілам**. Затрымалі дзевяцёх удзельнікаў сустрэчы. Кіравалі затрыманьнем маёр **Уладзімер Гасімаў** з Чыгуначнага райаддзелу міліцыі Гомеля зь лейтэнантам **Анатолем Лоем.** Абодва ня мелі ордэру на ператрус, свае дзеяньні тлумачылі тым, што шукаюць злачынцаў.

## 27 жніўня

### Шыдлоўскага зноў у турму

Міліцыя затрымала актывіста дэмакратычнага руху **Аляксея Шыдлоўскага** і павезла ў турму на Акрэсьціна. Ён мусіць адседзець яшчэ пяць сутак паводле рашэньня суду.

Нагадаем, што напярэдадні сьвяткаваньня Дня незалежнасьці 27 ліпеня А. Шыдлоўскі цягам дня быў двойчы затрыманы. Двойчы на яго складалі пратаколы. Паводле другога быў вынесены прысуд — 15 сутак. Гэты тэрмін зьняволеньня апазыцыянэр адбыў. Цяпер Аляксей Шыдлоўскі павінен адседзець 5 сутак — прысуд паводле першага пратаколу. У абодвух выпадках ён абвінавачваўся ў дробным хуліганстве.

### Міністэрства юстыцыі выбачылася

Офіс БСДП (Г) наведала прадстаўніца Міністэрства юстыцыі.

Яна папрасіла вярнуць ліст Міністэрства ад 22 жніўня «Аб вынясеньні пісьмовага папярэджаньня БСДП (Г)». Пры гэтым супрацоўніца Мін'юсту патлумачыла, што ліст быў накіраваны памылкова — насамрэч папярэдзілі сацыял-дэмакрата **Станіслава Шушкевіча**.

### Пісаць «Беларусь — гэта сьвятое» — не злачынства

Судзьдзя Нясьвіскага раённага суду **Дзьмітры Гвозд** спыніў справаводзтва паводле адміністрацыйнай справы **Насты Азаркі**, **Алеся Жукава** і **Арцёма Дубскага**. Суд не знайшоў у матэрыялах справы доказаў віны.

**СП**

## КАЛІ Б...

**...амон творча падышоў да разгону «Свабоднага тэатру».**



— ...і ніякіх енкаў кшталту «Ўсім ляжаць, б..!». Крычаць будзем «Ня веру!».

МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

# Якубовіч лічыць Суздальцава шпіёнам

Рэдактар газэты Адміністрацыі прэзыдэнта Павел Якубовіч, адказваючы на пытаньні чытачоў выданьня, падкрэсьліў цікавы факт біяграфіі расейскага аналітыка Андрэя Суздальцава і пагадзіўся, што «пасьлядоўныя размовы Пазьняка пра «шпіёнаў» небеспадстаўныя».

Падкрэсьліўшы, што ён жадае Суздальцаву хутчэйшага выздараўленьня (той захварэў на няясную хваробу, «НН» №29), Якубовіч зьвярнуў увагу на факт з публікацыі «Нашай Нівы»:

«Суздальцаў лечыцца ў шпіталі Міністэрства абароны Расіі. Значыцца, А.Суздальцаў — старшы афіцэр запасу, бо толькі яны маюць права лячыцца ў вайсковых шпіталях? Не, Суздальцаў, як вынікае з яго біяграфіі на сайце «НН», у войску не служыў. Застаецца адно: Суздальцаў — дзйны афіцэр. Танкіст, сапёр, лётчык? Не. Факт зьмяшчэньня палітоляга ў вайсковы шпіталь сьведчыць аб тым, што Суздальцаў — афіцэр спэцслужбы, хутчэй за ўсё, ГРУ Генштабу МА Расіі. Цяпер зразумела шмат з таго, што было загадкай. І асаблівая, відавочна афарбаваная ў разьведколеры дзейнасьць Суздальцава ў Менску, і яго тэрміновая дэпартацыя, якая па форме аналягічная зь дзейнасьцю ўладаў, калі з краіны высылаецца разьведчык... Варта таксама прызнаць, што пасьлядоўныя размовы Пазьняка аб «шпіёнах» небеспадстаўныя».


PHOTO.BYMEDIA.NET


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Суздальцаў: Я не шпіён**

Палітоляг Андрэй Суздальцаў адказаў на абвінавачваньні ў шпіёнскай дзейнасьці ў інтэрвію радыё «Рацыя»:

«Я ніколі не працаваў, не служыў у дзяржаўных органах. Цяпер я выкладчык дзяржаўнага ўнівэрсытэту — Вышэйшай школы эканомікі. Гэта першая за ўсё жыцьцё мая «дзяржаўная» пасада. Да гэтага я ў дзяржавы браў грошы толькі, калі быў студэнтам. Гэта была стыпэндыя». Паводле словаў Суздальцава, у Якубовіча няма ніякіх падставаў лічыць яго супрацоўнікам спэцслужбаў: «Усё выссана з пальца». Што датычыць вайсковага шпіталя, у якім лечыцца Суздальцаў, то, паводле ягоных словаў, гэта зьвязана зь ягонымі сувязямі ў Радзе фэдэрацыі і Радзе бясьпекі Расіі: «Калі са мною здарылася бяда, гэтыя дзьве ўстановы паклапаціліся аб тым, каб я атрымаў высокакваліфікаваную мэдычную дапамогу. Нічога гэтага я не хаваў. Калі б я быў супрацоўнікам спэцслужбаў, паверце, ніхто б ня ведаў, дзя я лячуся».

Спадар Суздальцаў у сваю чаргу абвінавацію рэдактара «СБ»:

«Я разумею ўвагу Паўла Ізотавіча да майго лёсу, паколькі менавіта ён зрабіў усё, каб прыбраць мяне зь беларускага палітычнага поля. Менавіта ён са старонак сваёй газэты абвінавацію мяне ў аўтарстве нейкіх ананімак. Павал Ізотавіч цудоўна ведае, што піша хлусьню. Яны пазбавілі мяне дому, на гады адарвалі ад сям'і, а цяпер шукаюць сабе апраўданьня. Я дзіўлюся, як некаторыя людзі могуць так хлусіць».

# Яшчэ раз пра А.Суздальцава і расійскую выведку

Рэдактар «Советской Белоруссии» зьмясьціў на сайце nn.by свой дадатковы камэнтар да справы А. Суздальцава, які, як мяркуе П. Якубовіч, працаваў на расійскую выведку ў Беларусі. Прапануем яго ўвазе чытачоў.

Шаноўная рэдакцыя!

Дзякую за ўвагу да сайту «СБ», у тым ліку за праяўлены інтарэс да маёй перапіскі з чытачамі. Цяпер да справы. Адказваючы наведнікам сайта на пытаньне наконт ступені маёй «варожасьці» да А.І.Суздальцава, а таксама пэрспэктывы ягонай хваробы, я, сапраўды, адказаў цалкам недвухсэнсоўна: Суздальцава я не лічу ворагам (увогуле мне не даспадобы такая ацэначная катэгорыя) і жадаю яму хутчэйшага выздараўленьня. Таму дазвольце не згадзіцца са сцьвярджэньнем шаноўнай рэдакцыі «НН», якая надрукавала ўсю гэтую гісторыю пад загалоўкам «Павал Якубовіч выкрыў шпіёна». Шпіёнаў выкрываюць так званыя «кампэтэнтныя органы», а не журналісты. Але ў тым, што А.Суздальцаў, падчас знаходжаньня на тэрыторыі Беларусі, выконваў «далікатныя» і цалкам акрэсьленыя даручэньні, сумневаў у мяне няма. Усе, хто меў неасьцярожнасьць непасрэдна кантактаваць са сп. Суздальцавым, мелі магчымасьць пераканацца ў канкрэтнасьці дзеяньняў «палітоляга». Я таксама! Успамінаю і нашумелы артыкул пра грубую «дыскрымінацыю рускай вуліцы» ў Беларусі, а таксама і час яе публікацыі — пачатак канфлікту з «Газпромам»! Помніцца, пасьля прачытаньня гэтага выбуховага матэрыялу я праз Сеціва «выйшаў» на Суздальцава, запрасіў яго ў рэдакцыю. Доўгі час даводзіў, што, па-першае, «рускую грамаду» на Беларусі ніхто не

дыскрымінуе, што, па-другое, моўныя і некаторыя іншыя культуралягічныя працэсы, наадварот, выклікаюць непакой у беларускай творчай інтэлігенцыі, і, па-трэцяе, што гэтак груба і мэтаскіравана разьдзімаць «нацыянальнае пытаньне» ў нашай краіне можа толькі чалавек (альбо арганізацыя), які мае нядобры «інтарэс». Мае аргумэнты сутыкнуліся са сьцяной. Увогуле, даволі хутка я пераканаўся, што маю справу з самым што ні на ёсьць прымітыўным, нягледзячы на фразэалёгію, шавіністам. Адзінае, што я сказаў тады з горыччу:

— Андрэй Іванавіч, магчыма, у вас ня склаліся адносіны зь цешчай-беларускай? Але гэта не падстава для таго, каб перанесьці непрыязнасьць на Беларусь.

Празь некалькі дзён я надрукаваў «Калёнку», дзе публічна перасьцярог сп. Суздальцава ад практыкаваньняў у нацкоўваньні фантастычнай «рускай вуліцы» на «злых беларусаў».

Мне здаецца, што тыя, хто шмат піша й гаворыць пра «беларушчыну», але ня ў стане адрозьніць шалёную крытыку Суздальцавым «лукашызму» ад ягонага імкненьня апраўдаць і ўзмацніць энэргетычную анэксію «Газпрому», нешта зразумеюць...

Але ставіць знак роўнасьці паміж «патрыятызмам» і разьведдзейнасьцю было б брутальнасьцю. У сваім адказе наведніку сайту «СБ» я напісаў, што ў ваенна-мэдычных установах Расіі не прымаюцца на лячэньне людзі, якія ня маюць адносінаў да ваеннай службы. Не мяняю пункту гледжаньня! Вартыя жалю намаганьні сп. Суздальцава спаслацца не нейкія «сувязі» нічога, акрамя сьмеху, у абазнаных людзей выклікаць ня могуць. «Высокія сувязі» ў Маскве гарантуюць лячэньне ў клініках сыстэмы Кіраваньня справамі прэзыдэнта Расіі. Але не ў закрытых шпіталях Мінабароны. Яшчэ раз паўтараю: цывільнага чалавека ў вайсковую мэдустанову не разьмесьцяць — на гэта ёсьць адпаведныя й строгія нарматыўныя акты. Больш на гэтым спыняцца не буду, усё ясна і так! Хто ня верыць, няхай паспрабуе «пралячыцца» ў цэнтральным шпіталі МА Беларусі. У Маскве з гэтым яшчэ больш строга. У іншым выпадку замест афіцэраў і генэралаў (іх, уключна з арміяй адстаўнікоў, — многія дзясяткі тысяч) у маскоўскіх шпіталях лячыліся б толькі «блатныя». Але шышкі нашмат больш значныя, чым нейкі Суздальцаў — знакамітыя акторы, пісьменьнікі, нават палітыкі рангу Жырыноўскага, — лечацца ў цывільных клініках, па месцы «прапіскі». Значыць, Суздальцаў мае афіцыйнае права на вайсковую «лечпрафдапамогу»! Значыць, ён — служыць! Але дзе можа служыць «цывільны чалавек», які саромеецца права на ваенную лечпрафдапамогу? Толькі ў спэцслужбе. Я выказаў меркаваньне, што гаворка ідзе пра Галоўнае разьведупраўленьне Генштабу расійскай арміі — ГРУ. Суздальцаў абвяргае. Што ж, магчыма, Суздальцаў служыць у іншых спэцслужбах. Ня буду пярэчыць, гэта ня так важна і мяне мала цікавіць. Адно ведаю дакладна: Суздальцава выдварылі зь Менску паводле ўсіх фармальных канонаў узаемаадносінаў спэцслужбаў. З фармулёўкамі, якія істотна адрозьніваюцца ад тых, якімі вытлумачвалася выдварэньне Ступнікава, напрыклад, альбо нават чэскага і латвійскага дыпламатаў (не ўзгадаю іхныя прозьвішчы), якія ў Менску «забаўляліся» з хлопчыкамі. У адносінах жа да Суздальцава ўсе маглі прачытаць, што падставы дэпартацыі зьвязаныя выключна з пытаньнямі нацыянальнай бясьпекі. Зьмест гэтых «пытаньняў» — зразумела, таямніца, вядомая толькі Суздальцаву, ягонаму маскоўскаму начальству і тым у КДБ па вул. Камсамольскай , хто гэтым займаўся.

Перад тым, як паставіць кропку, скажу: «шыць справу», чапляць цэтлікі Суздальцаву не зьбіраюся, прывёў толькі шырока вядомыя факты. Маралізаваць таксама ня стану: выконваў «рускі патрыёт» у Беларусі сваю задачу — сэрцу не загадаеш, «пагарэў» — здараецца. Ніхто ж не сумняецца, што нават вельмі па-сяброўску настроеная да Беларусі расійская выведка мае на нашай тэрыторыі свой «інтарэс». Нашыя контрразьведчыкі, напэўна, таксама стараюцца не дарэмна жаваць свой прафэсійны хлеб. Лягічна?

Яшчэ раз жадаю Суздальцаву выздараўленьня.

Але толькі ў стане моцнай ліхаманкі можна было сьцьвярджаць, што рэдактар «СБ» «зрабіў усё, каб прыбраць мяне зь беларускага палітычнага поля». Пра дэпартацыю Суздальцава я, насамрэч, даведаўся, як і ўсе, з прэс-рэлізу КДБ. Сьмешна, калі мяне «дэманізуюць» і надаюць мне ляўры чалавека, які «прымае рашэньні». Напісаць артыкул у газэту — я магу, але прыбраць кагосьці «з палітычнага поля»? Гэта ўжо занадта. Гэта, як любіць выказвацца паэт Зянон, — бздура!

Улічваючы хваробу, а таксама тыя абставіны, што праўда коле вочы, можна было і не заўважыць дурнаватай інвэктывы нездаровага «паліглёта» наконт «выдварэньня з палітычнага поля». Але ягоны наступны пасаж ня лезе, пардон, ні ў якія вароты. Цытую: «Менавіта ён (Якубовіч — П.Я.) са старонак сваёй газэты абвінавацілу мяне ў аўтарстве нейкіх ананімак... Ён... ведае, хто зьмяшчаў тыя ананімкі. Там было задзейнічана КДБ, і ўжо высьветлілі, што гэтым займаўся «другі чалавек». Уважліва прачытаўшы гэты блёкат, я так і ня змог зразумець, пра якія «ананімкі» і пра якое «высьвятленьне» размова? Адзінае, што цьвёрда ведаю і гатовы пацьвердзіць на любым судовым паседжаньні — ніякіх «ананімак» пра Суздальцава ці ад яго імя падчас майго рэдактарства «СБ» не публікавала. Увогуле, глыбога пагарджаю ананімкамі, адразу кідаю іх у сьметніцу — іх прыходзіць па 5 штук на дзень. Нават сумна вядомы «Белый аист» быў у свой час адміністрацыйна навязаны рэдакцыі, пра што я тады ж палічыў неабходным паставіць чытача ў вядомасьць, назваўшы арганізацыю, якая была аўтарам матэрыялу.

Суздальцаў піша: «Павал Ізотавіч цяпер проста апраўдваецца». Перад кім? Перад Суздальцавым? Ды калі б наведнік сайту «СБ» не спытаў майго меркаваньня, то я ніколі б і не ўзгадаў пра Суздальцава. Ці мала было ў маім жыцьці «стукачоў», засакрэчаных і адкрытых, якія спрабавалі зрабіць на мне кар’еру? Перабрэхвацца з кожным? Ня хопіць часу на журналістыку, асабістае жыцьцё і ўсё астатняе, што пакуль яшчэ цікавае мужыку маіх шаноўных гадоў. Так што сьпіце, Андрэй Іванавіч, спакойна. У сэнсе, папраўляйцеся і перастаньце ўдаваць зь сябе фігуру, перад якой патрэбна «апраўдвацца».

Шаноўная рэдакцыя!

Сьціпла спадзяюся, што вы зьмесціце (у газэце альбо на сайце) ліст, мэта якога расставіць некаторыя «акцэнты» ў гэтай гісторыі. Адзін з наведнікаў сайту «НН» «Несьвядомы Беларус» зыранізаваў:

— Якубовіч і Пазьняк... Цікавы тандэм.

Сапраўды «цікавы», але не «тандэм». У мяне ёсьць шмат падставаў не адчуваць да Пазьняка піетэту, думаю, у яго — ня менш. Але гэта ня значыць, што я павінен бачыць у З.С. «ворага» і закрываць вушы, калі ён гаворыць цалкам разумныя, з майго пункту гледжаньня, рэчы. Пра «шпіёнаў» у тым ліку.

З павагай да рэдакцыі і чытачоў «НН»,

**Павал Якубовіч**

# Нашы асілкі

Усе мэдалі нашы суайчыньнікі ўзялі ў тых відах лёгкай атлетыкі, якія набліжаюць гэты від спорту да цяжкай атлетыкі.

Удала для беларускай зборнай пачаўся адзінаццаты чэмпіянат сьвету па лёгкай атлетыцы ў японскім горадзе Осака. Цягам трох першых дзён спаборніцтваў нашы атлеты ўзялі тры мэдалі і разьмясьціліся на трэцім радку агульнага заліку, саступаючы толькі амэрыканцам і этыёпам.

Штопраўда, усе мэдалі нашы суайчыньнікі ўзялі ў тых відах, якія хутчэй набліжаюць гэты від спорту да цяжкай атлетыкі — штурханьне ядра і кіданьне молату.

Першы мэдаль Осакі для беларусаў завяваў Андрэй Міхневіч. Ён не лічыўся фаварытам спаборніцтваў, але ўжо ў першай спробе зашпурнуў ядро на 21 мэтар 27 сантымэтраў. Гэтага выніку хапіла для таго, каб узяць бронзавую ўзнагароду. Свой посьпех Андрэй прысьвяціў жонцы Натальлі Харанэцы, таксама кідальніцы ядра, і нядаўна народжанаму сыну Ільлю.

У адсутнасьці Натальлі Харанэкі ў жаночым сэктары па кіданьні ядра на першыя месцы выйшла іншая беларуска — Надзея Астапчук. Яна мела лепшы вынік сэзону і ня без падставаў разьлічвала на чэмпіёнства ў Осаку. Магутнымі кідкамі яна адразу захапіла лідэрства. Здаецца, з тым, што менавіта Астапчук стане чэмпіёнам сьвету зьмірыліся ўсе суперніцы, апроч адной — новазэляндкі Валерыі Вілі. Пасьля яе апошняй спробы ядро заляцела на рэкордныя для сэзону 20,54 м. Астапчук яшчэ мела шанец на добры вынік, але яе кідок аказаўся на шэсьць сантымэтраў бліжэй, чым у суперніцы — «срэбра».

Спаборніцтвы па штурханьні ядра сталі адметнымі яшчэ тым, што ў сэктар пасьля допінгавай дыскваліфікацыі і нараджэньня дзіцяці вярнулася алімпійская чэмпіёнка Сыднэю Яніна Карольчык-Правалінская. Аднак яе форма пакуль далёкая ад аптымальнай, у выніку яна аказалася на 10-м радку.

Затое ў панядзелак беларусаў па-сапраўднаму парадаваў Іван Ціхан. У нашага асілка ня добра клеіліся справы ў кваліфікацыі, у фінале ён таксама толькі з апошняга месца трапіў у першую восемку, якой даваліся тры лішнія спробы. Перад апошнім кідком Іван быў толькі на пятым месцы, але вырашальная спроба ў яго атрымалася настолькі добрай, што пытаньне пра пераможцу было зьнятае канчаткова — 83,63 м, так сёлета яшчэ ніхто не кідаў. Такім чынам, ураджэнец Слонімшчыны Іван Ціхан трэці раз запар стаў чэмпіёнам сьвету.

Яшчэ адзін наш малатабоец Вадзім Дзевятоўскі разьмясьціўся на крыўдным чацьвертым месцы.

Разам з тым, адзначаючы посьпехі ў кідальных дысцыплінах, трэба заўважыць, што ў Осаку не паляцеў ніводзін беларускі скакун, такога не было яшчэ ніколі. Няма ніводнага беларуса і ў мужчынскіх спаборніцтвах па бегу.

**Зьміцер Панкавец**

**Іван Ціхан**

нарадзіўся 24 ліпеня 1976 г. у вёсцы Глаўсевічы (Слонімшчына). Дагэтуль Ціхан двойчы станавіўся чэмпіёнам сьвету — у 2003 г. (Парыж) і ў 2005 г. (Хельсінкі). У 2004 годзе ён стаў другім на Алімпійскіх гульнях у Афінах. У ліпені 2005 г. Іван Ціхан кінуў молат на адлегласьць 86 мэтраў 73 сантымэтры, што толькі на адзін сантымэтар саступае лепшаму выніку ў гісторыі чалавецтва, які ў жніўні 1986 г. усталяваў савецкі малатабоец Юры Сядых. Трэніруецца Ціхан у алімпійскага чэмпіёна Сэулу–1988 Сяргея Літвінава. Жыве ў Горадні.



BBC.CO.UK

# Сямён Шарэцкі: «Лукашэнка хацеў стаць на чале БНФ»


PHOTO.BYMEDIA.NET

Былы старшыня Вярхоўнага Савету Сямён Шарэцкі вось ужо 6 гадоў жыве ў штаце Каліфорнія ў ЗША. Ён зьехаў зь Беларусі ў 1999 г. у Вільню, а ў 2001 г. атрымаў палітычны прытулак у ЗША. Цяпер былы палітык жыве жыцьцём пэнсіянэра. Сочыць за падзеямі на радзіме, але вяртацца туды намеру ня мае.

**— Сп. Шарэцкі, пра Вас у Беларусі ўжо даўно не было чуваць. Чым вы займаліся ўсе гэтыя гады?**

— Я не працую. Мне ўжо за 70 гадоў. Я атрымліваю дапамогу ад дзяржавы, а сам займаюся творчай дзейнасьцю. Да 125-годзьдзя Купалы й Коласа я напісаў артыкул «Песьняры зямлі беларускай». Неўзабаве ў кліўлэндзкай газэце «Проспект» мае быць надрукаваны матэрыял пра Рыгора Шырму.

**— Ці шмат у Каліфорніі беларусаў, якія займаюцца беларушчынай?**

— Тут увогуле мала беларусаў, але з тымі, хто жыве непадалёк ад мяне, я кантактую. Падтрымліваю кантакт з кліўлэндзкімі беларусамі, беларускімі габрэямі.

**— А ці сочыце за падзеямі ў Беларусі?**

— Крыху сачу, наколькі гэта магчыма. Падтрымліваю сувязь зь віленскімі беларусамі. Сытуацыя ў Беларусі зараз такая, як і была за маім часам. Там нічога не зьмянілася, сёньня там кажуць адно, а заўтра другое. Сёньня Лукашэнка едзе ў Маскву, цалуецца там, а заўтра адкрывае ў Воршы мэмарыяльную дошку ў гонар Канстанціна Астроскага. Гэта ж такі ўжо чалавек. Калі ён яшчэ быў дэпутатам Вярхоўнага Савету 12 скліканьня, калі Зянон Пазьняк неяк быў захварэў, то Лукашэнка хадзіў у БНФ і хацеў стаць на чале гэтай партыі. Ад таго часу, на мой погляд, там нічога не зьмянілася.

**— А ці зьмянілася апазыцыя? Як бы вы ацанілі цяперашні стан беларускага апазыцыйнага руху?**

— Ведаеце… цяжка працаваць, нават тады калі й я яшчэ быў у Беларусі, было цяжка нешта зрабіць. Апазыцыя раздробленая й ня можа аб'яднацца, а ўлады ім спрыяюць, каб тыя сварыліся. А людзі атрымліваюць аднабаковую інфармацыю, таму й ня могуць зразумець, што ж адбываецца. У свой час я ніяк ня мог зразумець амэрыканскага ладу жыцьця, пакуль я сюды не прыехаў і не паглядзеў. І людзям, якія жывуць у вёсцы й нідзе не былі як па-за раённым цэнтрам, цяжка зразумець сытуацыю. Калі няма вайны, то ўсё й добра, калі хлеб у краму прывозяць раз на тыдзень, таксама добра.

**— Пасьля шасьці гадоў жыцьця ў ЗША ці зразумелі Вы Амэрыку? Ці падабаецца жыць у гэтай краіне?**

— Падабаецца. Калі ўдумацца ў іх законы, у сыстэму аховы асобы й іншыя рэчы, то вельмі падабаецца. Цяжка казаць пра прычыну посьпеху ЗША, для гэтага трэба добра ведаць гісторыю гэтай краіны. Тут народ працалюбівы і ўсё зроблена для таго, каб чалавек мог пасьпяхова працаваць. Некалі ў СССР прыяжджаў генэральны сакратар Кампартыі ЗША, і калі ён прайшоўся па маскоўскіх заводах, дык сказаў: «Ну, я бачу ў ваш працоўны час такую самую карцінку, як у нас у час перапынку». Тут чалавек калі працуе, дык максымальна, таму й заробкі добрыя атрымліваюць. А ў Савецкім Саюзе неяк рабочага запыталіся: «Як вы жывяце?», дык ён кажа: «Ня горш, як працуем».

**— Ці складана вам было прызвычаіцца? Усё ж Амэрыка гэта, так бы мовіць, іншы сьвет?**

— Тут усё зроблена, каб табе дапамагчы, каб ты адаптаваўся. Існуе мноства розных арганізацыяў, якія спрыяюць чалавеку, каб ён не адчуваў сябе адзінокім. Працуюць школы для эмігрантаў. Усё гэта бясплатна. Нам у СССР тлумілі галаву, што ў Амэрыцы нічога без даляра ня зробіш, а тут музэі, бібліятэкі, шмат даступных інстытуцыяў працуюць бясплатна. Я тут такімі бібліятэкамі карыстаюся, што ў Беларусі я аб іх мог толькі марыць.

**— А Вы, у прыватнасьці, спрабавалі вывучаць ангельскую мову?**

— Дык я хаджу ў школу, нават цяпер. Вывучаю мову й нават часам пішу невялікія артыкулы па-ангельску. Пра Касьцюшку, пра Купалу, пра чарнобыльскую бяду. Навучаньне для мяне бясплатнае. І

Працяг на старонцы 41.

**Пра сваё жыцьцё-быцьцё:**

«Нам у СССР тлумілі галаву, што ў Амэрыцы нічога без даляра ня зробіш, а тут музэі, бібліятэкі бясплатна, мне як старому апэрацыю на вочы зрабілі бясплатна».

**Пра Амэрыку:**

«Тут народ працалюбівы і ўсё зроблена для таго, каб чалавек мог пасьпяхова працаваць».

**Пра палітычную сытуацыю:**

«Расея будзе трымацца, як цэпка, за Беларусь».

**Пра вяртаньне:**

«Куды я паеду? У турму? Дзе Ганчар?»

## Пагоны супраць шортаў

У Гомелі наведнікаў у шортах не пусьцілі на разгляд справы аб парушэньні правілаў дарожнага руху. Людзі мусілі ехаць пераапранацца. У Гомельскім УДАІ нам паведамілі, што дзеяньні дзяжурнага супрацоўніка рэглямэнтаваныя загадам начальніка ДАІ. Гэты загад прадугледжвае наведваньне адміністрацыйнай установы «ў належным выглядзе»: «Прыходзіць чалавек у шортах, як на пляж, на прыём, ці на разгляд камісіі, дзе сядзяць салідныя асобы ў пагонах. Гэта несалідна».

## Зборная згуляе ў Гомелі

Нацыянальная зборная Беларусі згуляе адзін з наступных матчаў за межамі Менску. 13 кастрычніка нашыя футбалісты прымуць зборную Люксэмбургу ў Гомелі. Гэта каб папулярызаваць спорт. А магчыма, таксама каб разьвесьці з Эўрапейскім маршам, які адбудзецца 14 кастрычніка.

## Найгарачэйшыя дні стагодзьдзя

У Менску і ўсіх абласных цэнтрах 23 жніўня пастаўленыя новыя тэмпэратурныя рэкорды. Палі абсалютныя максымумы, што трымаліся ад 39 да 69 гадоў. Найгарачэй жа было ў Лельчыцах (Гомельская вобласьць) — плюс 36 градусаў.

## Менск разьвітваецца з «Ікарусам»

Гэтыя аўтобусы ад'езьдзілі ў нашай сталіцы роўна 40 гадоў. Цяпер іх цалкам замянілі айчынныя МАЗы. Апошні аўтобус праедзе па сталічных вуліцах 4 верасьня.

## Конь растаптаў легкавік

Незвычайнае ДТЗ адбылося на аўтатрасе паміж гарадзкімі пасёлкамі Рось і Краснасельск Ваўкавыскага раёну: на капот аўтамабіля «Опэль» нечакана скочыў конь. Ён разьбіў лабавое шкло, праламаў дах, саскочыў на багажнік і зьбег. Кіроўца, жыхар Ваўкавыску, з траўмамі лёгкай і сярэдняй цяжкасьці трапіў у больніцу. Аўтамабіль пацярпеў больш: яго кузаў аднаўленьню не падлягае. Конь, які справакаваў ДТЗ, толькі крыху спалохаўся. Ён уцёк быў з племзаводу «Рось», але яго ўжо злавілі і зьмясьцілі ў стойла.

## У Горадні кот пакусаў сабаку і яго гаспадароў

Абараняючыся ад сабакі, кот пакусаў ды падрапаў і ягоных гаспадароў. Пакуль невядома, ці быў кот шалёным.

## У Грузію — авіярэйсам болей

«Белавія» з 26 жніўня павялічыла колькасьць рэйсаў у Грузію да трох разоў на тыдзень. Дадатковы рэйс будзе выконвацца ў нядзелі на самалёце CRJ-100.

## Мытнікі сканфіскавалі ў расейца 70 тысяч эўра

Буйная партыя незадэклараванай валюты затрыманая ў цягніку «Адлер—Калінінград». У мытнай дэклярацыі ён напісаў, што вязе 1200 расійскіх рублёў і 100 эўра, а ў торбе мытнікі знайшлі яшчэ 39270 эўра і больш за мільён рублёў. Распачата крымінальная справа.

## Беларускаму навукоўцу прысудзілі прэмію імя Сакрата

Эўрапейская асамблея бізнэсу прысудзіла прэмію імя Сакрата дырэктару Інстытуту фізыка-арганічнай хіміі НАН Аляксандру Більдзюкевічу. Навукоўцы інстытуту стварылі новае пакаленьне мэмбранных матэрыялаў, якія мяняюць традыцыйныя тэхналёгіі падрыхтоўкі вады для цеплаэлектрастанцыяў.

## Самыя камфортныя для жыцьця гарады сьвету

Рэйтынг апублікаваў часопіс The Economist. Пяты год запар на першым месцы — канадзкі Ванкувер. На другім месцы — аўстралійскі Мэльбурн, на трэцім — сталіца Аўстрыі Вена.

У першую дзясятку таксама ўвайшлі: аўстралійскія гарады Пэрт, Адэлаіда і Сіднэй, канадзкі Таронта, а таксама сталіца Даніі Капэнгаген і швайцарскія Жэнева з Цюрыхам.

Першае месца ад канца заняў Алжыр, на радок вышэй — сталіца Бангладэш Дака, яшчэ на адзін — сталіца Нігерыі Лагос. У дзясятцы самых няўтульных гарадоў — Карачы, Катманду, Абіджан, Дакар, Пнампень, Тэгеран і Багота. Гарады ацэньваліся з пункту гледжаньня ўзроўню стабільнасьці, наяўнасьці пагрозы тэрарызму, якасьці транспартнай інфраструктуры і іншых парамэтраў. Мэгаполісы не занялі высокіх месцаў менавіта праз вялікую колькасьць транспарту і высокі ўзровень злачыннасьці.

## Пра продкаў чалавека і гарылы

Японскія і эфіёпскія навукоўцы знайшлі 8 карэнных зубоў і адзіныікол у тэктанічным расколе Афар у Эфіёпіі. Для антраполягаў і дасьледчыкаў эвалюцыі чалавека гэтае месца — сапраўдная крыніца скамянелых рэштказў нашага біялягічнага гатунку. Ад часоў Люсі (Australopithecus afarensis), якая жыла тут 3,4 млн год таму, адкапанай у 1974 г., якая лічыцца праматкай ўсяго чалавецтва, выяўлены амаль усе часткі ланцуга відаў, які вывеў да чалавека. Ад старэйшага ад аўстралапітэкаў ардзіпітэка kadabba, існуючага больш як 6 млн год, праз ягонага нашчадка з гатунку ramidus – 4,5 млн год таму, вялікай колькасьці аўстралапітэкаў далей праз усё больш людзкія віды Homo, аж да найдаўнейшага прадстаўніка Homo sapiens, які жыў 200 тыс. год таму. Такім чынам, людзкая эвалюцыя на сёньня найлепей падмацаваная крыніцамі.

А апошняе адкрыцьцё японцаў у Афары, магчыма, выявіла продкаў чалавекападобных малпаў. Гэтыя дзевяць зубоў — ім каля 10 млн. гадоў — першыя рэшткі істотаў, якія наўпрост можна зьвязаць з жывымі сёньня гарыламі. Эфіёпскія зубы паходзяць з часоў, якія папярэднічалі моманту разыходжаньня галінаў чалавека і гарылаў. Паводле генэтычнага датаваньня агульнапрынятым лічылася, што гэтае разыходжаньне адбылося каля 8 млн год таму. Новыя адкрыцьці дазволілі выказаць меркаваньне, што супольны продак чалавека і гарылы значна старэйшы, чым лічылася.

**Генадзь Семянчук**
**СП; ЗП; МБ; БЕЛТА, «Звязда», Эўрапейскае радыё для Беларусі, радыё «Рацыя», БелаПАН**

## Фінал «Міс Менск» — у Дзень вайсковай славы

**На тым тыдні ў Нацыянальнай школе прыгажосьці прайшоў кастынг дзяўчат у фінал конкурсу «Міс Менск». З сотні прыгажунь было выбрана 16 фіналістак. Сярод іх, дзівіцца сябры журы, аж пяць рудавалосых прэтэндэнтак. Для конкурсаў прыгажосьці (апроч, відаць, «Міс Ірляндыя») гэта вялікая рэдкасьць. Фінал «Міс Менск» з дэфіле ў купальніках пройдзе 8 верасьня.**


GAZETABY.COM

# Валэнса вылучыў Шушкевіча на Нобэлеўскую прэмію міру

«Сытуацыя разьвівалася вельмі хутка і нечакана для мяне, — паведаміў «Нашай Ніве» былы старшыня беларускага парлямэнту. — Напрыканцы мінулага году я чытаў лекцыі ў Познаньскай вышэйшай палітычнай школе, якую патрануе былы лідэр «Салідарнасьці» і прэзыдэнт Польшчы Лех Валэнса. У адзін дзень я зайшоў у кабінэт канцлера школы ў той момант, калі ён размаўляў па тэлефоне з Валэнсам. Лех папрасіў, каб слухаўку перадалі мне, ён запрасіў прыехаць у той жа дзень да яго ў Гданьск. Мяне вызвалілі ад заняткаў і я насамрэч паехаў да Валэнсы. Мы сустрэліся ў ягоным бюро, якое разьмяшчаецца ў цудоўным двухсотгадовым будынку. Валэнса амаль адразу паведаміў, што хоча вылучыць мяне на Нобэлеўскую прэмію міру за 2007 год. Прызнаюся шчыра, што для мяне гэта было поўнай нечаканасьцю, бо па тэлефоне ён нічога мне не сказаў. Валэнса мае права вылучаць на Нобэля, бо сам атрымліваў прэмію ў 1983 годзе. Ён папрасіў мяне напісаць невялікія біяграфічныя зьвесткі. Пасьля чаго і накіраваў заяву ў Нарвэскі нобэлеўскі камітэт. Я пакуль не хачу называць тых людзей, якія яшчэ выступаюць за маю кандыдатуру. Скажу толькі, што сярод іх некалькі дзейных кіраўнікоў краінаў сьвету, былыя генэральныя сакратары, прэзыдэнты, прэм’еры, прафэсары ўнівэрсытэтаў».


PHOTO.BYMEDIA.NET

Шушкевіч на Нобэлеўскую прэмію міру быў вылучаны па пяці наступных пунктах: 1. Ініцыятыва і рэалізацыя вываду тактычнай і стратэгічнай ядзернай зброі з тэрыторыі Беларусі; 2. За ініцыятыву сустрэчы ў сьнежні 1991 году кіраўнікоў Беларусі, Расеі і Украіны, якія падпісалі Белавескія пагадненьні, што фактычна замацавалі развал СССР; 3. За актыўны ўнёсак ў мірны раскол расейскай каляніяльнай імпэрыі, якая існавала ў выглядзе Савецкага Саюзу; 4. За ўклад у бесканфліктнае пераўтварэньне СССР у незалежныя рэспублікі; 5. За адданасьць прынцыпам міру, дэмакратыі, правоў чалавека і прапаганду гэтых прынцыпаў.

Ляўрэат Нобэлеўскай прэміі ў галіне міру стане вядомы ў другой палове кастрычніка ў Осла (Нарвэгія).

Усяго на прэмію штогод вылучаецца каля 200 кандыдатаў. Сярод вядомых намінантаў гэтага году — экс-віцэ-прэзыдэнт ЗША Альбэрт Гор за сваю дзейнасьць у абарону навакольнага асяродзьдзя, міратворац Намібіі, Ачэху й Косава Марці Ахцісаары, чачэнская юрыстка Лідзія Юсупава. Праўда, фаварыты рэдка аказваюцца абранымі.

Летась на Нобэля міру вылучалі кіраўніка незарэгістраванай праваабарончай арганізацыі «Вясна» Алеся Бяляцкага.

Шушкевіч успрымае свае шанцы як ня самыя высокія. «Маю шанцаў паўпрацэнту, – сьмяецца Шушкевіч. – Мне вельмі прыемна, што я трапіў у гэты сьпіс, але застаюся рэалістам, што апроч мяне шмат годных кандыдатураў. Калі ўсё ж атрымаю, то найперш хачу дапамагчы «Нашай Ніве» і іншым незалежным выданьням».

**Зьміцер Панкавец**

# Герой і ягоныя ахвяры

У Эстоніі заведзена крымінальная справа на першага эстонскага Героя Савецкага Саюзу Арнольда Мэры. Яго вінавацяць у генацыдзе.

Мэры **(на фота)** вінавацяць у падрыхтоўцы дэпартацыі жыхароў Хіюмаа ў 1949 г.

Пракуратура зазначае, што 25 сакавіка 1949 г. на востраве Хіюмаа савецкія ўлады затрымалі 251 жыхара. Назаўтра іх накіравалі ў порт Палдыскі, а адтуль — на пажыцьцёвае высяленьне ў Сібір. Паводле зьвестак пракуратуры, 25—27 сакавіка 1949 г. з Эстоніі выслалі 20702 чалавекі. Кожны шосты ў Сібіры і загінуў.

Мэры быў у ЦК эстонскай кампартыі і сакратаром ЦК Камсамолу. Ён не адмаўляе, што ў 1949 г. быў накіраваны на Хіюмаа кантраляваць перасяленьне. Аднак віны не прызнае, сьцьвярджае, што толькі правяраў сьпісы падлеглых перасяленьню.

Калі абвінавачаньне здолее даказаць, што Мэры кіраваў дэпартацыяй, яму пагражае пажыцьцёвае зьняволеньне.



Арнольд Мэры ў 1941 г. стаў першым эстонцам, які атрымаў званьне Героя Савецкага Саюзу. Ён удзельнічаў у баях у Пскоўскай вобласьці і быў чатыры разы паранены, але не пакінуў поля бою.

У 1951 г. партыйнае кіраўніцтва атрымала данос на Мэры і палічыла, што ён недастаткова актыўна ўдзельнічаў у дэпартацыі на Хіюмаа. Яго выключылі з партыі і пазбавілі ўзнагародаў. Праз пяць гадоў яго аднавілі ў партыі і вярнулі ўзнагароды.

Стрыечны брат Арнольда Ленарт Мэры быў першым прэзыдэнтам Эстоніі (1991—2000). Арнольд кіруе Антыфашысцкім камітэтам краіны. Зь Ленартам яны не кантактавалі змалада: занадта разышліся ў палітычных поглядах.

**АГ**

з ь б я р ы « К н і г а р н ю « Н а ш а Н і в а »




**Найясьнейшая Рэч Паспалітая:** Цывілізацыя—Культура—Рэлігія—Палітыка—Авантура—Героіка—Успамін.




**Наталка Бабіна. Крыві не павідна быць відна.**




**Паветраны шар**: беларускае мужчынскае апавяданьне.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

КВІТАНЦЫЯ

Агулам

Касір М.П.

# Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Па пытаньнях атрыманьня газэты пытайцеся Рамана.

## Адказ галоўнага дырэктара Першага каналу радыё Я.Саламевічу

Старшыні ГА «ТБМ імя Ф.Скарыны» А.А.Трусаву

Паважаны Алег Анатольевіч!

Работнікі радыё зь цікавасьцю і зьдзіўленьнем пазнаёміліся з артыкулам Я.Саламевіча, «выдатнага», як Вы яго ганаруеце, «знаўцы» мовы. Што ж, магчыма, для Вас Я.Саламевіч такім і зьяўляецца.

А асабіста мне публікацыя Я.Саламевіча, як і Ваш ліст, сталі добрай нагодай зрабіць тлумачэньні па пытаньнях беларускай мовы на радыё і расказаць Вам пра тое, чым жыве Беларускае радыё сёньня. І зьмест ліста Я.Саламевіча, і Ваш ліст мяне ўразілі: аказваецца, пра якасьць праграм Беларускага радыё і іх мову можна выказваць меркаваньні нават і ня слухаючы наш эфір. Таму тлумачу дэталёва.

Па-першае, пачатак артыкулаў Я.Саламевіча: *«Калі я ляжаў у бальніцы, на вялікае зьдзіўленьне (як такое прапусьцілі?!) пачуў па радыё словы настаўніцы з Камянецкага раёну: «Раней я казала сваім вучням: «Слухайце беларускае радыё. Там самая чыстая беларуская літаратурная мова». Цяпер кажу ім: «Ні ў якім разе ня слухайце беларускага радыё. Чаму вы там навучыцеся?! Там суцэльная непісьменнасьць: і ў скланеньні, і ў спражэньні, і ў націсках, і ў плойме русізмаў, якія дыктары-вядоўцы сёньня «ляпаюць» у эфір, ня думаючы нават, што пра іх непісьменнасьць падумаюць тыя, хто мову добра ведае, зусім ня думаючы, што гэтым самым абражаюць, крыўдзяць слых сваіх слухачоў, тых, хто адбірае, слухае іхную непісьменную мову»* — зьяўляецца проста паклёпніцкім, альбо (у лепшым выпадку) прадуктам уяўленьняў чалавека, які на момант напісаньня артыкулу быў нездаровы, што, уласна кажучы, ён і сам прызнае. Падобнае не гучала і не магло гучаць у эфіры.

Цікавыя асацыяцыі ўзьнікаюць і пры далейшым прачытаньні. Тое, што аўтар «дзьвюхмоўе» лічыць «уведзеным глупствам», сьведчыць пра яго элемэнтарную непісьменнасьць, бо «дзьвюхмоўе» не было ўведзена, а стала вынікам плебісцыту. Каму падабаецца, каму — не, але факт ёсьць факт.

Паведамляю Вам таксама, што ўжо многія гады праграмы радыё вядуць пераважна не дыктары, а журналісты. І што большасьць праграм дзеля іх апэратыўнасьці выходзіць у прамым, жывым эфіры. Вось тут сапраўды маем праблему: на жаль, часам здараюцца памылкі... «Праскокваюць» і русізмы, і калькі, і няправільныя націскі... Дзеля пазбаўленьня ад гэтага на радыё створаная група стылістычных рэдактараў, рэдактараў эфірнага дня, існуюць курсы павышэньня кваліфікацыі работнікаў, на радыё пэрыядычна запрашаюцца выкладчыкі мовы з аналізам нашых праграм.

Наконт таго, што чыноўнікі ў эфіры гавораць выключна на рускай мове: і гэта абсалютна не адпавядае рэчаіснасьці. Слухайце радыё, і Вы ўпэніцеся ў гэтым.

Далей аўтар піша, што *«вясковых бабулек прымушаюць гаварыць на «трасянцы»*. А што, з бабулькамі гаварыць на лаціне? Дарэчы, Беларускае радыё свае перадачы вядзе на пяці мовах: на дзьвюх дзяржаўных, ды на польскай, нямецкай і ангельскай 107 гадзінаў штодня.

Я.Саламевіч закрануў у публікацыі багата пытаньняў: і націскі, і ўжываньне фразэалягізмаў, і мову рэклямы, і адсутнасьць у эфіры той альбо іншай тэматыкі. Нешта слушна, нешта штучна, нешта спрэчна... Але галоўнае ня ў гэтым. Галоўнае ў тым, што ЁН НЯ СЛУХАЕ РАДЫЁ!

Цытую: *«Чаму ігнаруецца беларуская літаратура, якая мае творы ня толькі эўрапейскага, але і сусьветнага ўзроўню? Дзе перадачы «Тэатар перад мікрафонам», канцэрты на заяўкі слухачоў, фэстывалі гумару накшталт аўцюкоўскага ды многае іншае? Ці даўно вы чулі канцэрт Ф.Шаляпіна, М.Забэйды-Суміцкага, Л.Русланавай, А.Александроўскай, казкі для дзяцей у выкананьні Г.Глебава, Л.Ржэцкай, «Паўлінку» з карыфэямі сцэны Г.Глебавым і У.Дзядзюшкам, «Навальніцу» А.Астроўскага з удзелам М.Савінай, В.Далматава, Г.Фядотава, А.Яблачкінай, п'есы Горкага, ігру геніяльнага Б.Платонава ў творах К.Крапівы, А.Макаёнка, Янкі Купалы і многае іншае...»*

Адказваю: «Тэатар Беларускага радыё» гучыць штотыдня, у суботы у 21.00. Гучала там і «Паўлінка», і галасы памянёных аўтарам артыстаў у іншых радыёспэктаклях, гучалі прэм'ерныя работы сучасных драматургаў.... Гучыць штодня і «Калыханка» ў выкананьні прызнаных майстроў слова, гучыць і музыка былых часоў... Дарэчы, а на якой з 20–30 недзяржаўных радыёстанцый краіны Вы падобнае чулі? Дзе яшчэ гучыць народная музыка, аўтэнтыка, дзе гучыць беларуская паэзія? Хто гэтак рупліва запісвае і зьберагае для нашчадкаў літаральна ўсе музычныя, тэатральныя здабыткі?

А мову, напрыклад, беларускай службы «Радыё Свабода», мову яе сайта, вы аналізавалі, паважаны Алег Анатольевіч? Вось дзе клопат, вось дзе праблемы...

Словы Я.Саламевіча пра тое, што *«патрабуюць сур'ёзнага кантролю нашы радыёжурналісты, дыктары, рэдактары»*, якія і Вы паўтараеце ў сваім лісьце, нагадваюць ня надта далёкія часіны татальнага кантролю над беларускім словам, чаго, на шчасьце, сёньня нашы радыёжурналісты не адчуваюць.

Ліст Саламевіча не зьвярнуў бы на сябе ўвагі — падобныя творы час ад часу зьяўляюцца. Абурыла тое, што паклёп складзены чалавекам, які ня слухае і ня ведае перадач радыё. Ня буду пераказваць Вам праграму перадач, яна даступная на нашым сайце, друкуецца ў многіх рэспубліканскіх газэтах. Артыкул, думаю, меў на мэце паказаць, што ў краіне няма нацыянальнага радыё. А яно было, ёсьць і будзе...

Калі Я.Саламевіч у стане больш-менш адэкватна ацаніць напісанае ім, дык нават па выніках абмеркаваньня артыкулу на сайце ён павінен папрасіць прабачэньня ў работнікаў Беларускага радыё.

Вось такія думкі наконт артыкулу Я.Саламевіча! Дык каму, з дазволу сказаць, такія «рэцэнзіі» патрэбныя? Проста засьвярбела рука? Захацелася, ня слухаючы, не разьбіраючыся, паліць гразьзю Беларускае, сапраўды, народнае радыё?

А што да Вашага, Алег Анатольевіч, пытаньня пра юбілей вялікіх песьняроў — дык слухайце, калі ласка, наша радыё: там і Купала, і Колас гучалі і гучаць, і пра іх словы гаворацца... Існуюць тэматычныя перадачы, рыхтуюцца і новыя да ўгодкаў.

З найлепшымі зычэньнямі

**Галоўны дырэктар Першага нацыянальнага каналу Беларускага радыё Пётар Раманчук**

**Ад Рэдакцыі.** Сп.Саламевіч пісаў перадусім пра мову абласнога радыё, а не агульнанацыянальнага. Адказ жа падыктаваны, як нам падаецца, прафэсійнай крыўдай, а ня клопатам пра культуру мовы.

## Як нас заганяюць у БРСМ

Добры дзень, дарагая рэдакцыя! Во які факс атрымала наша камэрцыйная фірма з райкаму БРСМ.

**Мікола Р., Менск**


Грамадскае аб'яднанне
БЕЛАРУСКІ РЭСПУБЛІКАНСКІ САЮЗ МОЛАДЗІ
МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ
МАСКОЎСКІ РАЁННЫ КАМІТЭТ
вул. Волаха 9, к. 2
тэл.: (017) 200-33-30; факс (017) 200-85-50

Общественное объединение
БЕЛОРУССКИЙ РЕСПУБЛИКАНСКИЙ СОЮЗ МОЛОДЁЖИ
МИНСКАЯ ГОРОДСКАЯ ОРГАНИЗАЦИЯ
МОСКОВСКИЙ РАЙОННЫЙ КОМИТЕТ
ул. Волоха 9, к. 2
тел.: (017) 200-33-30; факс (017) 200-85-50

...оля 2007 г № 01-26/79
№ ____________

Руководителю

Реализация государственной молодежной политики Республики Б... является одним из приоритетных направлений на пути построения силь... процветающего государства. В последнее время правительство и Г... Республики Беларусь уделяют данному направлению повышенное внимание.

Во исполнение Протокола поручений Президента Республики Беларусь А.Г. Лукашенко № 10 от 22.02.2007г., Московский районный комитет Общественного объединения «Белорусский республиканский союз молодежи» просит Вас, оказать помощь в создании первичной организации ОО «БРСМ» на Вашем предприятии, и с этой целью организовать группу инициативной молодежи для встречи с представителями Московского районного комитета ОО «БРСМ».

**Контактные телефоны:**
Второй секретарь Московского РК ОО «БРСМ»
Рамля Ольга Георгиевна:
200-41-41, [illegible]5-58, (029) 751-2[illegible]14, (029) 688-27-87

Наста Азарка.

# Мама

МАМА

Мы з табою чужыя, матуля,
Не прасі, не скаруся зьверу!
Не для гэтага з соннага плену
Я прачнулася ўначы,
Каб зацяцца тваім праклёнам,
Каб праклёнам тваім зьнемагчы...
Я прыехала на хвілінку...
Мама, дай я цябе абдыму,
Вытру дай з твайго твару сьлязінку...
Мяне кліча мая Беларусь.

* * *

Магчыма, усё было йначай
І я не была такою...
Мо ты мяне перайначыў,
Але мне няма спакою.
Ня будзе спакою, ведай,
Пакуль мы глытаць будзем пыл,
Пакуль мы ня ўстанем з каленяў,
Пакуль з нас цягнуць будуць жылы!
Ня будзе спакою, помні,
Пакуль мы маўчаць будзем крыўды,
Пакуль забывацца на мову
Мы будзем з жахліваю гідай!
Спакою ня прыйдзе збавеньнем
Пад маскай сьляпога каханьня
Што потым дасі пакаленьням —
Аблічча празрыстае зданi?
А можа, табе даспадобы
Ганебная чорная сіла,
Што робіць вясельле з жалобы,
Што гоніць дзяцей у магілы?!
Спыніся, ты чуеш, спыніся,
Пакуль шчэ спыніцца ня позна,
Навокал сябе азірніся —
Ты ўбачыш адны толькі сьлёзы!
Магчыма, усё было йначай.
І я не была такою...
Але як краіна плача,
Ня можна жыць у спакоі!

ГОНАР

Наш прэзыдэнт гуляе ў хакей.
У гонар і павагу ўсіх людзей.
І мы на гледзішча скідаем усе выдаткі
І з захапленьнем пляскаем у ладкі.
І мы жывем на зайздрасьць усім суседзям,
Мы п’ем віно, ня смалім цыгарэты,
Гуляем усёй краінаю на сьвята —
Выконваем бацькоўскія загады.
Наш прэзыдэнт гуляе ў хакей,
А іхні — у тэніс, гольф і каратэ...
Усё нармальна ў нас, няма турботаў,
Наш прэзыдэнт гуляе для народу.
Ён для людзей стараецца. Ірвецца
Над кожным грошыкам не для сябе
трасецца.
За будучыню сьветлую краіны
Зь сябе апошнюю кашулю скіне.
Калі гуляе — значыць, усё а’кэй.
Узводзім файныя лядовыя палацы,
Усё нармальна, можна... пасьмяяцца.

**У 2007 годзе, годзе 125-годзьдзя Купалы і Коласа, «НН» штонумар друкуе творы беларускіх паэтаў. У ранейшых нумарах пабачылі сьвет творы Генадзя Бураўкіна, Андруся Храпавіцкага, Юрася Пацюпы, Міхала Анемпадыстава, Сяргея Прылуцкага, Сяргея Сыса, Алеся Макрацова ды іншых аўтараў. Чакаем Вашых твораў.**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Наста Азарка (першая зьлева).**

# Цароў унук

Аляксандра Самца ў Карэлічах ведаюць. І ня дзіва. Адным зь першых ён заснаваў тут на пачатку 90-х будаўнічы каапэратыў. У 1993-м дзякуючы ягоным высілкам у раёне пачала дзейнічаць суполка Партыі БНФ. Такія асобы ў невялікіх местах не застаюцца па-за ўвагай.



СЯМЁН ПЕЧАНКО

Аляксандар Самец — не гарадзкі чалавек, вялікія гарады яго ня вабяць. Нарадзіўся на Карэліччыне, у вёсцы Ярэмічы. Адвучыўшыся ў Менскім архітэктурна-будаўнічым тэхнікуме, ды адслужыўшы ў Маскве ў войску, на пэўны час вярнуўся ў Менск. Але ня ўседзеў, вярнуўся дамоў: «Трэба жыць там, дзе твае карані».

Дзеда па бацьку Аляксандар ня бачыў — той загінуў у вайну. Нехта здаў, што сын-партызан наведваўся дамоў. Немцы застрэлілі старога проста ў хаце, паставіўшы таго да печы. Небарака пражыў пяць гадзінаў з кулямі ў грудзёх і галаве. У вёсцы дзеда праз яго мажную постаць і незвычайную сілу звалі Царом.

Сям'я Аляксандра перабівалася, як кажуць, з хлеба на квас. Бацька Кастусь меў адукацыі пяць клясаў. Працаваў кавалём, у калгас уступіў адным з апошніх, рана пайшоў з жыцьця. «Сядуць, бывае, з брыгадзірам, гэткім самым грамацеем, ды лічаць, колькі каваль зарабіў», — узгадвае Самец. Адзін хоча, каб болей, другі, каб недаплаціць. Як брыгадзір сыходзіў, бацька браў свой мізэрны заробак, прыгаворваючы: «Вось жа гэтыя саветы! І за што я вошы ў зямлянцы карміў?»

## «Я верыў у камунізм, але ня быў у партыі»

У першым сваім кабінэце малады праграб адшукаў за шафай партрэт Леніна і пачапіў яго на сьцяну. Ішлі апошнія гады савецкай імпэрыі. «Шчыра верыў у ідэі камунізму, хоць у партыю так і не ўступіў», — узгадвае ён. Потым, калі пабачыў, хто кіруе раённай камуністычнай арганізацыяй, то й думаць перастаў, каб стаць партыйцам. На пачатку пераломных 90-х выпрашыў сысьці на вольны хлеб, ды заснаваў першы ў Карэлічах будаўнічы каапэратыў. «Цяжка было — грошай хапіла толькі на тэчку для збору неабходных папераў, але потым пачаў няблага зарабляць», — з усьмешкай прыгадвае спадар Аляксандар.

## «У газэтах пра апазыцыю пісалі, як пра зьвяроў»

Акурат тады, як бізнэс пачаў прыносіць прыбытак, Аляксандар зацікавіўся палітыкай. Увагу прыцягнула яшчэ ня цалкам вольная прэса, у якой дэмакратычную апазыцыю малявалі, як тых дзікуноў. Пабачыўшы недзе абвестку пра сьвята ў Купалаўскім сквэры, што ладзілі «зьвяры», наважыўся паехаць у сталіцу і ўсё пабачыць на свае вочы. Там сустрэў прыстойных маладых людзей пад бел-чырвона-белымі сьцягамі, пачуў добрую беларускую мову і вярнуўся дамоў іншым чалавекам. З сабою прывёз значкі, сьцяжкі ды газэты.

Палітыка пачала засмоктваць, і, не задаволіўшыся зборам подпісаў за перавыбары ў Вярхоўны Савет, Аляксандар стварае раённую суполку БНФ. Наладзіў для землякоў сустрэчу зь Зянонам Пазьняком. Пры канцы сустрэчы ў партыю запісалася больш за паўсотні чалавек. Старшынём суполкі без ваганьняў абралі Самца.

## Ня той Самец

Суполка папаўнялася па-рознаму. У 1996 г. Карэлічы ўскалыхнуў скандал — замест анансаванага баевіка мясцовае кабэльнае тэлебачаньне паказала «Звычайнага прэзыдэнта». Да старшыні мясцовага БНФ пацягнуліся па камэнтары журналісты са «Свабоды», БелаПАН, Reuters. Адну з тых перадачаў на «Свабодзе» пачуў кіроўца з суседняга калгасу. Выпрашыў далучыцца да арганізацыі. Узяў тэлефонны даведнік ды патэлефанаваў А.Самцу. На ягоную беларускую мову на другім канцы дроту суха адказалі: «Гэта не да мяне, званіце па іншым нумары». Гэта быў намесьнік старшыні Карэліцкага райвыканкаму, таксама Аляксандар, і таксама Самец, якому той кінасэанс дарагога каштаваў.

## Непрафэсійная дэмакратыя

Першым сур'ёзным выпрабаваньнем для новаўтворанай суполкі сталі прэзыдэнцкія выбары 1994 г. Вынік быў неблагі — Пазьняк атрымаў у Карэліцкім раёне другое месца, першае — Лукашэнка. Аднак Самец не ўважае гэта за перамогу, нават больш — упэўнены, што ў цэлым тады дэмакраты прайгралі ўсур'ёз і надоўга. Прычынай той і наступных паразаў лічыць палітычнае аматарства: «Мы працавалі напаўсілы, бо ў кожнага была яшчэ й асноўная праца, у большасьці — гаспадарка. Уявіце магчымы вынік, калі б кожны з нас быў цалкам аддадзены справе, ды не зай-

маўся зарабляньнем грошай на жыцьцё». Будучы абраным у абласную Раду і Сойм, ён неаднойчы казаў пра неабходнасьць забесьпячэньня партыйцаў сродкамі на існаваньне, што б вызваліла час уласна на палітыку. Спрачаўся з Пазьняком. Але Зянон Станіслававіч адрэзаў: палітыка і грошы — несумяшчальныя. У Горадні яго яшчэ паслухалі ды падтрымалі, але ў сталіцы ідэю правінцыйнага старшыні праігнаравалі. Рэфэрэндумы, раскол Фронту ды няўцямны кандыдат ад апазыцыі на выбарах-2001 падарвалі веру ў здольнасьць апазыцыі вырвацца з заганнага кола паразаў. «Народ ня любіць тых, хто прайграе, таму нам усім жыцьцёва неабходная перамога», — упэўнены былы ўжо старшыня Карэліцкага БНФ. Ён так і не далучыўся ні да аднаго з аскепкаў партыі.

### Выгадаваў сына, пабудаваў дом, пасадзіў сад

Дом Самцоў прыцягвае ўвагу — вялікі, двухпавярховы драўляны будынак. Будавалі яго на дзьве сям'і разам з братам. У двары — невялікі садок, акуратны газон. Цяпер будуюць дом для сына, што ў чэрвені скончыў унівэрсытэт. Сын, дарэчы, увесь у бацьку: на дзяржаўную працу — настаўнічаць, ісьці не жадае, марыць пра ўласную справу.

«Думаў, што ўжо ня буду сам будаваць, ажно вось давялося ўзяцца за старое», — усьміхаецца Аляксандар. Дзеля гэтага з адной з суседніх вёсак перавезьлі зруб. Разьбіраць старое жытло ён любіць, бо часта кінутыя хаты хаваюць у сабе дробныя і вялікія таямніцы: старыя рэчы, спарахнелыя паперы, газэты. Дэманструе апошнія знаходкі — царскія ды савецкія грошы, старыя акуляры, дакумэнты. «Цікавей за гэта мне няма нічога», — кажа ён і дадае, што з задавальненьнем заняўся б пошукам даўніны. Некаму трэба гэтым займацца — зьбіраць старыя рэчы, запісваць за дзядамі, пакуль яны з намі, іхныя гісторыі, мяркуе сп.Аляксандар. Такое захапленьне невыпадковае — яго жонка працуе ў раённым краязнаўчым музэі.

### «Я не прападу, былі б Сьцяг ды Мова»

Цяпер Аляксандар ізноў на вольным хлебе. Партыі няма, як і ня дзейнічае суполка ТБМ, якую ён таксама арганізоўваў. На палітыку аднак не забыўся зусім. Езьдзіць у Менск на акцыі, заходзіць у партыйныя офісы. Потым вязе незалежныя газэты, каб раздаць землякам.

Былога актывіста не хвалюе эканоміка, бо лічыць што пры любым рэжыме на сябе можна зарабіць: «Важна, каб мы былі адукаваныя, а найперш ведалі сваю гісторыю, карані, шанавалі мову, свае сымбалі, а тады і эканоміка запрацуе».

У яго талент знаходзіць аднадумцаў у любым калектыве, нават сярод будаўнікоў. Неяк пазнаёміўся зь вясковым шабашнікам, які проста з халявы боту выцягнуў сшытак з уласнымі вершамі. Некаторыя зь іх прагучалі потым на «Свабодзе», ды трапілі на старонкі «НН». Аляксандар Самец мае багатую бібліятэку беларускай літаратуры, гістарычных твораў. Пры кожным новым знаёмстве дае чалавеку штосьці пачытаць.

Размаўляем ля брамы Аляксандравага двору, побач па дарозе едзе на ровары ўнук суседкі. «Едзь сюды — возьмеш бабе газэтаў пачытаць», — дастае з салёну аўто апошнія нумары «НН» ды «Народнай волі» Аляксандар Канстанцінавіч. «Зерне кінутае ў ніву...» — першае, што пры гэтым прыходзіць на розум.

**Сямён Печанко**

# Аршанская бітва—2007



Фэст беларускай аўтарскай песьні й паэзіі «Аршанская бітва—2007» пройдзе на Крапівенскім полі **8 верасьня.**

Фэстываль пачнецца а 20–й на гістарычным месцы Аршанскае бітвы 1514 году — левым беразе Дняпра пры ўпадзеньні ў яго рэчкі Крапівенкі. Праходзіць ён на адкрытым паветры, таму варта падумаць пра адпаведную вопратку, запас ежы і намёт. Запас дроў для вогнішча будзе на месцы.

**Даезд:** з чыгуначнага вакзала на аўтобусе ці маршрутцы № 11 да аўтавакзалу (канец маршруту). Далей — аўтобусам «Ворша – Дуброўна» да прыпынку «Гацькаўшчына». Гуртам можна наняць маршрутку з чыгуначнага вакзалу проста да Гацькаўшчыны.

Таксама аўтобусам або маршруткай можна ад'ехаць ад прывакзальнае плошчы да прыпынку «Цэнтр», затым ад Цэнтральнай плошчы, што ля «Дому гандлю» (прыпынак за помнікам Леніну) можна сесці на аўтобус ці маршрутку Ворша — Дуброўна» і ехаць да прыпынку «Гацькаўшчына». Ад прыпынку «Гацькаўшчына» да месца фэсту каля 1 км.

Спадарожныя цікавосткі: **па два бакі Цэнтральнае плошчы знаходзяцца музей Уладзіміра Караткевіча і Прыдняпроўскі парк з помнікам Караткевічу на месцы дому, дзе прайшло ягонае дзяцінства.**

У парафіяльным касцёле Сьв.Язэпа (вул.Савецкая) экспануецца адзіная на Беларусі каляровая ксэракопія ў натуральны фармат вядомай карціны XVI ст. «Аршанская бітва» (арыгінал у Варшаве).

**Даведкі:** (029) 291–62–38 (Юрка), (029) 319–65–74 (Генадзь), (029) 666–75–42 (Віктар).

# Уладзімер Содаль: «Мне маё будзе!»

Дасьледчык творчай спадчыны Дуніна-Марцінкевіча і Багушэвіча, сябра Саюзу беларускіх пісьменьнікаў, мовазнаўца, актыўны сябра ТБМ Уладзімер Содаль 13 верасьня будзе адзначаць 70-годзьдзе.

Пяру Ўладзімера Содаля належаць кнігі «Людзьмі звацца», «Сьвіранскія крэскі», «Жупранская старонка», «Бачу свой край», «Сьвяты куточак фальварак Сьвіраны», «Волат зь Мігаўкі». Шлях да творчай дзейнасьці пачынаўся ў яго з поўнага горычы і пакутаў дзяцінства, з ваеннага ліхалецьця, якое назаўжды пакінула невылечныя раны...



**— На долю Вашага пакаленьня выпалі цяжкія выпрабаваньні?**

— Нарадзіўся я ў суворым 1937 годзе, 13 верасьня. Бацькі мае паходзілі зь мястэчка Мормаль, каля Жлобіна. У дзеда Паўла была вялікая сям'я — тры сыны і пяць дачок, усе дзяўчаты сталі настаўніцамі. За невялічкі капітал, які ён здабыў сваёй працай, пабудаваў на вёсцы паравы млын, для сябе і людзям на дапамогу, дзе сам гаспадарыў. Час быў цяжкі, сям'ю раскулачылі, млын канфіскавалі, тату, яшчэ хлопцам, выслалі ў Сыбір. Дзяўчаты зьбеглі ва Ўкраіну і павыходзілі замуж. Але без гаспадара праца на млыне не ішла. Тады мясцовае начальства пачало клапаціцца, і яго вярнулі з высылкі. Тата быў сапраўдным майстрам, добрым мэханікам і кавалём. Калі яго забіралі на вайну, памятаю, як я, маленькі хлопчык, бег за машынай з гары з апошніх сілаў, з масточка ледзь не зваліўся ў пясок.

«Тата, татачка, не ўхадзі», — крычаў я.

Потым, у 1945, мы, дзеці, былі радыя кожнаму салдату, які вяртаўся дадому, бацьку чакалі да апошняга. Але ён не вярнуўся. Ён крыху недачуваў, яму было цяжка арыентавацца сярод выбухаў, таму, відаць, ён і загінуў.

Да гэтага часу ў маёй памяці — гул самалётаў, выбухі снарадаў, страляніна. Бог ведае, як выжылі ў франтавой паласе. Аднойчы снарад разарваўся вельмі блізка. Сьветла-сьветла зрабілася. З тае пары я ўжо забыў, калі бачыў абодвума вачыма. Ацалела толькі адно, і тое хварэе на глаўкому.

Але самае крыўднае тое, што празь семдзесят гадоў, што мінулі з тых цяжкіх часоў, нас, мірных беларусаў, зноў гоняць у сьпіну карніцкія атрады, як гэта адбылося на сьвяткаваньні Дня абвяшчэньня Незалежнасьці — 27 ліпеня.

**— Як зьявілася ў Вас цікавасьць да роднай мовы?**

— З маленства я быў вельмі чуйны да слова. Памятаю, уразіла назва вёсачкі, дзе мы хаваліся ў бежанцах — Жарабцы. Думалася, быццам адны коні там жывуць. Пасьля вайны вучыўся ў вясковай школе. У дзяцей была вялікая цяга да газэт, часопісаў, пісалі і дасылалі туды свае вершы. І я дасылаў свае допісы ў «Піянер Беларусі».

Упершыню я паверыў у сілу друкаванага радка, адчуў, што ў горадзе працуюць больш сьвядомыя і дасьведчаныя людзі, вось пры якіх абставінах. У 1953-54 годзе пачалі патрабаваць плату за навучаньне ў школе. Мне плаціць не было чым, бо на дваіх мы з мамай мелі пэнсію ўсяго 56 рублёў, а дырэктар і ведаць не хацеў, што сям'я страціла кармільца. Тады я напісаў ліст у газэту. З рэдакцыі паведамілі мне, што дзеці тых, хто загінуў на вайне, ад платы вызваляюцца, і гэтым лістом я дамогся справядлівасьці.

**— Але працягнуць навучаньне Вы змаглі не адразу?**

— Пасьля школы ў пошуках рамантыкі мае сябры паехалі на Цаліну, а я падаўся ў 1956 годзе ў іншы край — у далёкі паўночны Мурманск, дзе служыў мой дзядзька — афіцэр. Там я працаваў, капаючы траншэю, прабіваючы вечную мерзлату. Вечарамі хадзіў вучыцца на токара. Але токарам працаваць не давялося, бо падводзіў зрок. Сустрэўся добры чалавек, які ўладкаваў мяне электрыкам на вайсковы сударамонтны завод. Скончыўшы курсы, я працаваў у ліцейным цэху. У порце на прычале стаялі падводныя лодкі, эсьмінцы. У абавязкі электрыка ўваходзіла абслугоўваньне портавых кранаў. «Сальто» — гэта значыць «портавы кран» — так называлі мяне, яшчэ хлапчыну.

У Мурманску я таксама цікавіўся грамадзкім і культурным жыцьцём у Беларусі і адтуль напісаў праграмны ліст Нілу Гілевічу са сваімі пытаньнямі. Малады, але вядомы паэт адчуў, што нейкаму юнаку баліць за Беларусь, за родны народ. Ён захаваў гэты ліст, на доўгія гады, а ў 1987 годзе на маёй творчай вечарыне агучыў яго і падараваў мне копію гэтага ліста.

Празь некалькі гадоў з Мурманску мяне накіравалі навучацца ў Менск, у Пэдагагічны інстытут, на філялягічнае аддзяленьне. Вядомы мовазнаўца Фёдар Янкоўскі, старшыня прыёмнай камісіі, паспачуваў мне. «Вазьміце і вывучыце яго», — параіў ён і сваім калегам. Так пачаўся мой лёс у мовазнаўстве і літаратуры.

Пасьля трэцяга курсу, перавёўшыся на завочнае, я паехаў настаўнічаць у Астрашыцкі Гарадок, бо ўжо меў сям'ю. (Дарэчы, там дагэтуль жыве мая матуля.) Інспэктар зь

Міністэрства адукацыі, што прысутнічаў на занятках, падтрымаў мяне і сказаў паўжартам: «Вы як рознаспрагальны дзеясловў, ні пад адно спражэньне не трапляеце (значыць, маеце незалежны погляд)! Трымайцеся гэтак далей». Словы яго запалі мне ў душу.

**— Ваша першая кніжачка называлася «Людзьмі звацца»?**

— Гэты зборнічак нарысаў выйшаў у 1977 годзе. Ён пабываў у космасе разам з нашым касманаўтамі П.Клімуком і У.Кавалёнкам. Я даслаў ім кніжку, каб яны памяталі пра зямлю, што іх узгадавала. А цяпер я рыхтую кнігу «Прага мовы», у якую ўвойдуць такія часткі, як «Філёляг з маленства», «Казка без канца», «Пытаньні зь юнацтва», «Моўныя абразкі» і іншыя.

**— Раскажыце, калі ласка, як зьявілася ў Вас цікавасьць да асобы і творчасьці Багушэвіча?**

— Больш за трыццаць гадоў я працаваў на тэлебачаньні. Вёў перадачу «Роднае слова», узначальваў студыю «Ліцэй», мы рыхтавалі навучальныя перадачы для школы. У праграме быў і Францішак Багушэвіч. Пачалі пісаць сцэнар, зрабілі фільм. Гэты фільм паслужыў імпульсам усёй далейшай дасьледчыцкай дзейнасьці. Праз яго я мусіў цікавіцца адвакатурай, працай сьледчых, тым адвакацкім асяродкам, дзе працаваў Ф.Багушэвіч. Яго душой, яго вачыма я перачытваў Біблію, Эвангельле, Пушкіна, Міцкевіча, Салтыкова-Шчадрына, Лока, Пірагова, каб зразумець, разгадаць, пра што ён думаў і пісаў.

Мая апантанасьць вынікае з высокіх грамадзянскіх пазыцыяў Багушэвіча. І ня толькі. Яна ідзе з адчуваньня гарманічнай цэльнасьці гэтай асобы. Да Багушэвіча гарнуліся людзі самых розных заняткаў: юрысты, навукоўцы, літаратары, мастакі, журналісты. Для ўсіх ён быў непаўторным аўтарытэтам. Ф.Багушэвіч, яго літаратурная і юрыдычная спадчына — гэта той грунт, на якім я вырас як дасьледчык, і, можа, нават падсьвядома жыву паводле яго маральных прынцыпаў.

**— З чым можна параўнаць дасьледчыцкую працу?**

— Заўсёды адчуваю, што мною нешта водзіць, надараюцца сытуацыі, дзіўныя моманты, неспадзяванкі, імгненна ўзьнікае завязка... Люблю распытваць людзей, прыслухоўваюся да іх гаворкі. Аднойчы ў лесе, зьбіраючы грыбы, я сустрэў жанчыну і пачуў ад яе знаёмы выраз. Аказалася, што кабета была з нашых мясьцінаў, і нават калісьці яна працавала з маім дзядзькам, які ў вайну загінуў.

Даўно мяне цікавіць куточак пад назвай Бараўцы, недалёка ад Вячы ў Менскім раёне. Іншыя купалаўскія мясьціны даўно ўшанаваныя і апісаныя, а Бараўцы, дзе вынасілася «Жалейка», дзе стварыў Купала «Адвечную песьню», дзе акрэсьліўся ягоны псэўданім, пакуль яшчэ не атрымалі належнай увагі. Займальны ланцуг назваў Баравая — Бараўляны — Бараўцы...

**— Вандроўкі і пошукі зьяўляюцца для Вас своеасаблівым стымулам, які дазваляе пераадольваць хваробы, цікавіцца жыцьцём?**

— На першай старонцы маіх кніжачак пазначана: ня п'ю, не палю, кнігі выдаю за свае грошы з пэнсіі. Прашу Бога і людзей — спрыяйце мне! Нягледзячы на гіпэртанію і цукровы дыябэт, застаюся аптымістам. Праца жывіць і надае мне сілы!

Мой дэвіз: «Мне маё будзе!». Гэта значыць, што ня трэба асабліва прагнуць матэрыяльнага дабрабыту, а працаваць на творчай ніве, дзе ўсё зь цягам часу ўдаецца зьдзейсьніць.

Але яшчэ адзін стымул і мая радасьць — унук Сержык (усяго ў мяне іх чатыры). Ён таксама ўважлівы да слова, піша вершы, падарожныя нататкі і замалёўкі, і ўжо ўбачылі сьвет дзьве яго кніжачкі. «Сьвятло маёй крынічкі» і «Кветка мая, Беларусь»

**— Нядаўна Вам удалося выдаць кнігу пра першага рэдактара «Нашай Нівы» Аляксандра Ўласава?**

— Не аднойчы мы з тэлевізійнай групай наведвалі Мігаўку, дзе жыў Аляксандар Уласаў, езьдзілі туды з М.Лавіцкім. Кожная паездка адкрывала штосьці новае пра гэты кут і пра самога колішняга гаспадара. Я быў натхнёны ўсьведамленьнем, што хаджу па тых сьцяжынках, па якіх хадзіў калісь самаахвярны беларускі асьветнік.

**— Дазвольце падзякаваць Вам за працу, якую Вы робіце, і зычым Вам добрага здароўя і творчага плёну!**

**Гутарыла Эла Оліна**

# Мірон

Першы Мірон быў у Багушэвіча. Піша **Уладзімер Содаль**.

Хто ж на Беларусі ня чуў ці ня ведае гэтага імя. Мірон — гэта легенда нашага часу. Ён, бясстрашны і пакуль няўлоўны, разьвешвае на самых высокіх, амаль недасягальных вышынях, наш бесьсьмяротны сымбаль — бел-чырвона-белы сьцяг. Усталюе і бясьсьледна, як цень, зьнікае. Як мне падаецца, ягонай мужнасьцю, ягонай рашучасьцю захапляюцца нават ягоныя незычліўцы.

...Мірон! Скуль ён узяўся? Гэтага ніхто ня ведае.

Ёсьць жа ў Францішка Багушэвіча верш «Хрэсьбіны Мацюка». Дык вось, у згаданым вершы, апрача непакоры Мацея, фігуруе таксама і Мірон (Мірун). Гэты Мірун на прапанову царскіх апрычнікаў зьмяніць веру адказвае:

«Спытайце, кажа, — вун Мацея;
Як ён ды скажа перавярнуцца,
Дык усе вёскі на яго здадуцца».

І што адказаў Мацей?

«...каб сто катоў
Дралі мне скуру, пяклі на агню,
Я веры сваёй тыкі не зьмяню!»

Так адказаў Мацей. Гэтак жа мусіць адказаць і Мірон. Гэтак жа ён сказаў: «Калі Мацей скажа перавярнуцца, дык на яго ўсе вёскі здадуцца». Але такога ад Мацея не пачулі. І Мірон загадзя добра ведаў, што ад Мацея ніколі такога не пачуюць, і ён, Мірон, разам з Мацеем кажа сваім «дабрадзеям»:

«...Эй, біце ж мацней,
Мацнейшы ад веры нашай Мацей».

Мацнейшы ад веры чужой і Мірон. Ён жа ва ўсім гатовы ісьці за Мацеем!

...Над сёньняшняй Беларусьсю то там, то тут узьлятаюць да высяў Хрыстовы сымбалі — бел-чырвона-белыя сьцягі. Кажуць, гэта іх усталёўвае легендарны Мірон. Цікава, а ці ведае ён і ягоныя сымпатыкі, што быў на Беларусі ў яго папярэднік, які гарой стаяў за сваю веру, не мяняў веры ні за якія спакусы. Калі ня ведаем, то ведайма!

Хай жа табе, Міроне, скрозь і ўсюды і ва ўсім шчасьціць. Шануй жа, Божа, яго для Беларусі! Ня дай нікому яго зглуміці.

Імя Мірон вельмі рыфмуецца зь імем Зянон! Наздароў, Божа, іх абодвух! Міронава імя даўно сталася на Беларусі сымбалем нашай няскоранасьці.

# 37 працэнтаў гетэрасэксуалаў

Аляксей Бацюкоў. Апавяданьне.

Яны лашчыліся на першым сядзеньні, якраз перада мной. Пачалося з таго, што мужчына справа крануў нагой другога і папрасіў прабачэньня. Той другі засьмяяўся ў адказ. Цяпер, калі я расплюшчыў вочы, мужчына справа казытаў патыліцу мужчыны зьлева. Кіроўца маршруткі зрэдчас азіраўся на іх зь лёгкай усьмешкай, а калі мужчыны пераставалі мілавацца, кіроўца гладзіў таго мужчыну, які сядзеў побач зь ім, па руцэ.

Я адвярнуўся да вакна. Даўно праехалі Бялынічы, мінулі паваротку на Друць, абапал шашы пакуль паўзло балота, хутка мусіла быць Бярэзіна.

У Менск я гэтым разам ехаў зь лёгкім наперад яшчэ расчараваньнем. Заяўку на ўдзел у конкурсе падаў, што называецца, для масавасьці, а паехаў выключна таму, што паабяцалі заплаціць за дарогу. Аніякае асаблівае карысьці, у прынцыпе, і ня мусіла быць, хаця, канечне, было лёгкае спадзяваньне, што ўсталююцца нейкія самыя натуральныя і лягічныя кантакты, якія і так мусілі б даўно існаваць, аднак чамусьці, як заўсёды, не існавалі, і гэта таксама выглядала натуральна. Каб не сапсаваць сабе настрой, я ня стаў працягваць гэтую думку, так што зноўку выйшла, што думаць мне няма аб чым. Таму я проста сядзеў і назіраў, імкнучыся дарэшты выключыць сваю прысутнасьць тут, пакінуўшы сабе адно толькі карцінку перад вачыма. Калі б я быў каля вакна, я даў бы дрэўцам расплывацца і сасьлізгваць з майго позірку ўправа і долу, калі б я сядзеў на пярэдніх крэслах, я даў бы дарозе енчыць і падаць на мяне, а так я сядзеў і глядзеў, як мужчына зьлева цяпер ужо лашчыць нагу кіроўцы сам.

«Не, — падумаў я, — простае, чыстае сузіраньне людзі толькі псуюць». Але вочы не заплюшчваліся. На сваім крэсьле я здолеў неяк павярнуцца паўбокам і пакласьці галаву на сьпінку. Дзяўчына каля мяне глядзела фота на сваім мабільніку. Скручаныя ў пацалунак жаночыя губы. Высокая, бледная шыя з акраечкам вуха, зь лёгенькай пасмай белявых валасоў. Да гэтага вуха па плячы, і ўжо нават па шыі, паўзе язычок. Праткнутая пірсінгам, ружовая і разьняволеная смочка на маленькай мокрай грудзі. У гэты момант зусім нечакана я заснуў.

Вось ён, Менск, ад якога заўсёды чакаеш большага, а бачыш практычна тое ж, што дома. Але ж ты тут ня дома. Калі выходзілі ля мэтро, мужчына, які выйшаў перада мной, — каржакаваты і важкі, але нечакана даўганогі — азірнуўся і звыклым жэстам падаў мне руку. Спачатку я неяк пацягнуў сваю руку насустрач, але ж я ўжо ў Менску, падумаў я, і, усьміхнуўшыся, падзякаваў і адмовіўся прымаць яго далонь. Мужчына, аднак, не зьвярнуў на гэта асаблівае ўвагі, толькі павольна павёў па мне, па ўсім маім целе позіркам, і шырокім крокам пайшоў у мэтро. Гэтая тыповая менская лёгкасьць і сьмеласьць мяне так тады пераканалі самога, што я абсалютна спакойна павярнуўся назад, каб падаць руку дзяўчыне сьледам. Яна, аднак, ужо спусьцілася, прытрымаўшыся за дзьверцы.

Але я не адпусьціў яе так. Калі мы абое падышлі да мэтро — а я наўмысна не сьпяшаўся — я ўзяў і прапусьціў яе перад сабой. Позірк у дзяўчыны быў каменны, ці заўважыла яна мой жэст, я не зразумеў.

Нарэшце, вось ён, першы менскі твар, у вакенцы з жэтончыкамі. На пульхнай руцэ касіркі кожны пазногаць пафарбаваны вясёлкай. Ярка-ружовы пінжак, відаць, на голае цела. Размаляваная так, што толькі спаласаваная зморшчынамі шыя выдавала сапраўдны ўзрост. Яна мала чым розьнілася ад нашых магілёўскіх касірак.

У мэтро падалося, што на сядзеньні побач зь дзьвярыма абдымаюцца хлопец і дзяўчына. Прыпынкі абвяшчаў нармальны нізкі мужчынскі голас, хоць адзін раз уключыўся нейкі другі голас, каб ад імя міліцыі папярэдзіць пра крадзяжы мабільных тэлефонаў. Гэты голас ужо і скуголіў, і енчыў, і зрываўся на звычайныя гі-гі-гі, так што не было ясна, мужчына гэта ці жанчына, пакуль гэты чалавек не засьмяяўся — напружана, ненатуральна, як звычайна па тэлевізіі разьвітваюцца камэнтатары. Дзяўчына нахілілася да хлопца, яе дэкальтэ адышло ад цела, і я расчаравана адвярнуўся.

Крыху спазьняўся, але ня вельмі. Выйшаў на плошчы Перамогі і разгубіўся каторы раз, у які бок ісьці на выхад. Насупраць «Вячэрняга Мінску», каля пераходу, жанчына папрасіла мяне паднесьці сумку. Я адразу зразумеў, што гэта за чалавек, і не зьвярнуў увагі. Зноўку тут гэта зрабіць было лягчэй, чым звычайна ў Магілёве.

Восьмы будынак я, як заўсёды, прапусьціў, а патрэбны ўваход знайшоў толькі па плякаце, налепленым на вакно знутры — бацька і маці разам з сынам і маленькай дачкой ідуць па полі. Надпіс я не пасьпеў прачытаць, але сама ідэя адразу спадабалася.

— О, а вы, напэўна, з Магілёва, — стары, круглатвары мужчына ў шэрым строі крочыў насустрач, працягваючы руку. — Я ўзгадваю ваш здымак, які мы на сайце павесілі.

Я ня ведаў, што адказваць, і ці трэба, і проста паціскаў ягоную руку — моцна, як умеў, — але ня дужа доўга, каб не засмуціць. Людзей наагул яшчэ не было, я аказаўся першым з гасьцей. Яшчэ за круглым сталом сядзела дзяўчына. Пацалаваць руку мне дала лёгка, адразу, як я пасунуўся да яе, і ўсьміхнулася, калі я крыху прытрымаў сваімі пальцамі яе далонь. Выдала мне грошы.

Павольна, нават, напэўна, цяжка, я павёў позіркам па пакоі. За ўсе свае — колькі: дзесяць, восем — гадоў актыўнасьці я быў тут упершыню. На бюсьце Караткевіча каля вакна было напісана, што гэта Ларыса Геніюш. Карціны на сьценах разглядаць было нязручна, а бязь іх пакой ператварыўся б у бледную пляму і наўрад ці хто знаходзіў бы моцы адарваць позірк ад гэтага вугла, які выступаў на самую сярэдзіну, навязваючы сваю груваскую прысутнасьць. Ложкаў нідзе не было, не было таксама канапаў ці хаця б раскладных крэслаў.

Я выйшаў у пярэдні пакой. Вялікі стэляж з кнігамі цяпер стаяў за сталом прадаўца, так што падыходзіць стала зусім нязручна. Збоку да яго ўсё ж прабраліся двое, маладыя хлопец зь дзеўкай, і гарталі часопіс. «О, глядзі», — сказаў хлопец, і на карцінцы мільганулі постаці жанчыны і мужчыны. Дзеўка прытрымала старонку рукой, каб не адбівалася сьвятло, і заківала — можна паспрабаваць. Я пагляд-зеў некалькі касэтаў на стэляжах — у асноўным нямецкія фільмы, пару польскіх, але я іх усе ўжо збольшага бачыў. Была яшчэ, праўда, зусім пек-

ная цацачка — хоўм з Пэрыс Хілтан і Памэлай Андэрсэн, але я толькі закусіў губу ад цаны.

Людзі падыходзілі з хуткасьцю адзін чалавек за дзьве хвіліны, так што праз паўгадзіны палова задніх крэслаў была занятая. Марудзіць далей ня змог нават мужчына ў шэрым строі, і хаця некаторыя зь першых гасьцей пасьпелі ўжо сысьці, ён паводзіў сябе надзіва прыўзьнята. Як хутка высьветлілася, яго радавала статыстыка, згодна зь якой, нягледзячы на тое, што колькасьць зьмяшаных клясаў у школах зноўку скарацілася ў параўнаньні зь мінулым годам, колькасьць рэгістрацыяў разнаполых шлюбаў вырасла на некалькі тысячаў па краіне.

Жанчынаў у залі цяпер было чатыры, зь іх адна з мужам, а другая з татам і сынам. Трэцяя сядзела за мной. Здаецца, чарнявая. Чацьвертая была спартоўкай з пэдагагічнага ўнівэрсытэту. Яна таксама сядзела ззаду, але як бы міжволі я патрапіў агледзець яе. Доўгія валасы, крыху шыракаватыя плечы, натуральна ж, рашучы твар.

Круглявы мужчына адразу пачаў уручаць дыплёмы, прычым першы ж сунуў Нілу Гілевічу, які сядзеў побач зь ім і завяршаў такім чынам прэзыдыюм. Потым была адна з жанчынаўканкурсантак, і калі агучылі колькасьць студэнтаў, якія пасьля заняткаў зь ёю актыўна пачалі выкарыстоўваць гетэрасэксуальнасьць, я зразумеў, што мая плянка — гэта які-небудзь дыплём.

— Мы былі на яе сэмінарах па тэхніцы міжполавых зносінаў, — мужчына ў шэрым строі ніяк не выпускаў дыплём з рук, хоць муж той выкладчыцы даўно ўжо стаяў каля ягонага калена, — і я вам скажу, што гэта вельмі дасьведчаны, высокаадказны практык. І вельмі шкада, што мы ня маем магчымасьці перадаць гэты дыплём ёй асабіста. Ну, што тут зробіш, Ірына Іванаўна цяпер у дыспансэры.

Хутка запрасілі спартоўку. Яна агледзела ўсю залю з прыступак, удзячна ўсьміхнулася. Круглатвары мужчына нарэшце ўзяў яе за талію, і, трымаючы пацалунак, яны абнялі адно аднаго, абапіраючыся на стол. Хтосьці ззаду закрычаў, усе запляскалі. Я нарэшце азірнуўся. Жанчына ззаду сустрэла мой позірк. Не чакаючы, калі скончацца дыплёмы, мы выйшлі. Яна была зь Менску, яе імя Жэня. Калі мы вярнуліся, мяне ўжо чакаў дыплём зь гербамі беларускіх гарадоў. Пачыналася ўганараваньне.

Нейкі чалавек прамаўляў, зь ім вальяжна перакрыкваўся таўстун побач са мной.

— А ведаеце, — казаў таўстун, робячы выгляд, што ў прамове моўцы была паўза, — як гэта ў нас на Гарадзеншчыне было. Прыходзілі нашыя хлопцы на танцы. А побач была вайсковая частка — саветы ж хітрыя, гэта ўсё было прадумана. І вось нашыя запрашаюць дзяўчатаў, танцуюць зь імі, праводзяць дадому, а там аказваецца, што гэта пераапранутыя салдат. Першы раз гэта бянтэжыла, а потым ужо пачалі прывыкаць. Дык я гэта да чаго, — ён раптам падняўся з выцягнутай і накіраванай на Гілевіча рукой, — гэта мы з вамі, старэйшае пакаленьне, вінаватыя. Такія, як мы. Ну, правільна?

Калі ўрачыстасьці скончыліся, і паставілі шампанскае зь віном, з каньяком, з бутэрбродамі, аказалася, што людзей прыйшло ня так ужо мала. Ва-

> Дык я гэта да чаго, — ён раптам падняўся з выцягнутай і накіраванай на Гілевіча рукой, — гэта мы з вамі, старэйшае пакаленьне, вінаватыя. Такія, як мы. Ну, правільна?

кол Жэні стаялі людзі, спартоўка ўжо ўцякла. Адзін хлопец з Баранавічаў папрасіў тост.

— Слухайце, — сказаў ён, — вось мы тут з вамі цяпер сабраліся, а разьедземся — і ўсё. І ніякіх кантактаў. Трэба неяк падтрымліваць сувязь, вось што я хачу сказаць. Вам у Менску гэта, вядома ж, ня так адчуваецца. А людзі з рэгіёнаў, яны застаюцца проста адны, — ён адчайна глядзеў на нас.

Усе выпілі моўчкі і сталі размаўляць з суседзямі. Я пайшоў. Так і скончылася гэтая бязглуздая паездка. Па Менску хадзіць не хацелася, хаця час быў. Міліцыянт на рагу вуліц пасьцёбваў сябе шыпаванай плёткай па зацягнутых у скураныя чорныя нагавіцы галёнках. Я падышоў спытаць хуткую дарогу на Ўсходні аўтавакзал. На бэджыку ён быў з нафарбаванымі вуснамі і ў белым парыку, але пазнаць яго было лёгка па рудых вусах. Шляху ён ня ведаў альбо яму не цікава было ўзгадваць. Так што я паехаў, як заўсёды, праз чыгуначны вакзал.

У маршрутцы я хацеў сесьці каля вакна, але з задняга сядзеньня гукнулі — аднаклясьнік махнуў рукой. Я амаль успомніў яго імя, хоць яно ўсё роўна не спатрэбілася. Дзе ты цяпер? Я ва ўнівэрсытэце. А ты? Я ў гандлёвым прадстаўніцтве расейскай фірмы. Ты ўжо сямейны? Не яшчэ, а ты? Я — так. Мы нядаўна разам. Вось, глядзі — ён паказаў па мабільніку фатаздымкі. Хлопец быў прыгожы, з добрымі вачыма. На руках ён трымаў малое з банцікамі на галаве. Як дзіця завуць? — спытаў я, баючыся не здагадацца, хлопчык гэта ці дзяўчынка. Глеб. Хутка будзем у школу аддаваць. Вы ў Менску жывяцё? Так. А ў якую клясу? У першую. У сэнсе — у хлапечую ці ў разнаполую? У хлапечую, канечне, — маё пытаньне яго зьдзівіла, і ён заўважыў расчараваньне на маім твары. Ён абыякава цёпнуў плячом, але яўна не хацеў канфліктаваць: а што гэтыя разнаполыя клясы, — сьмяяўся ён, — калі ў нас нават Гэты бяз жонкі жыве. Ведаеш, — сказаў я яму, — аднойчы я чуў, як адзін сын спытаў свайго бацьку, чаму і ў ангельскіх сем’ях, і ў амэрыканскіх, і ў нямецкіх, і нават у прыбалтаў ёсьць і мама і тата, а толькі ў беларускіх альбо тата і тата, альбо мама і мама. Твой табе такія пытаньні не задаваў? Ён працягваў абыякава ўсьміхацца. Дык што, ты хочаш гэта ўсё зьмяніць? Я наагул ані разу ў жыцьці гетэрасэксуала не сустракаў, — працягваў ён.

— Ага, — сказаў я, чамусьці, аднак, не раздражняючыся. Пачынала цямнець, кіроўца ўключыў рамантычную музыку. Толькі на апошнім перапісе трыццаць сем працэнтаў назвалі сябе гетэрасэксуаламі.

— Дык гэта ўсё ў вёсках, — ён хістаў галавой, яўна ня верачы мне. — Там яны самі ня ведаюць, хто яны.

— Так не бывае, — кажу я, — каб чалавек ня ведаў, які ён. Альбо ён такі, альбо гэткі.

У маршрутцы варушыліся. Адзін мужчына нахіліўся, і яго галава пачала хутка рухацца.

— Ну, там часьцей за ўсё і такія, і гэткія, і яшчэ бог ведае якія.

Я ведаў, што можна адказаць і на гэта, але так абрыдла гэта пастаянна рабіць. У Паплавах я купіў сабе піва і выпіў яго адразу. У машыне хутка заснуў і прачнуўся, толькі калі адчуў, што побач варушацца. Я ня стаў расплюшчваць вочы, каб не глядзець. Усё ж такі яны самі сабою, а я сам сабою. Яны самі сабою *ўсе*.



# Баба Ўладзя,

Баба Ўладзя зь вёскі Салацьце Гарадзенскага раёну ўзімку, калі няма гаспадарчай працы, разам са сваёй сястрою тчэ дываны. Нічога не зьмянілася — яна дагэтуль сее лён, з ільну робіць кудзелю, фарбуе яе ў патрэбны колер. Ткуць і прасьціны. Толькі выбельваюць ужо не на возеры ў маразы, а па-простаму, хлёркай.

Бабе Ўладзі амаль восемдзесят. Муж памёр некалькі гадоў таму. Яе энэргіі хапіла б на некалькі чалавек — карова, парсюк, сена возіць на вазку сама ў адрыну: «Дзеці казалі, што касіць больш ня будуць. Дык Бог даў ласкі — прыехаў камбайн, усё скасіў. Дык я сама вось на гэтым вазку ўсё і пацягала». За працай распавядае і пра цяперашні час: «Не грашыце, дзеткі, усё маеце. За намі дактары ня бегалі. Босыя хадзілі на балота журавіны зьбіраць. І зьмеі кусалі. І нічога».

Пра мінуўшчыну ўспамінае цяжкія рэчы: «Пасьля вайны ідзем, бачу — у вакне лямпачка сьвеціцца! Дзіва было. Зайздросьцілі. З лучынай жылі. Бацька скупы быў. Лучыну шклом нават не закрываў — эканоміў. Дзяцей шмат раджалі. Чула, што некаторыя мамкі малака немаўлям не давалі — чакалі, каб памерлі. Цяжкія часы былі. А зараз хто б мог падумаць, што ўсё так зьменіцца!»

Мне яна кажа: «А ты вось усё езьдзіш,





# якая тчэ дываны





езьдзіш. Супакойся. Пабудзь з бацькамі, павесялі іх». А сама ўстае а 5-й раніцы пасьля вясельля ўнука, дзе танчыла да гадзіны ночы. Яна ніколі не стамляецца. Дзеці яе стамляюцца, яна — не. Дзеці кажуць: «Хопіць той працы» — яна на сябе сена цягае.

**Тэкст і фота**
**Андрэя Лянкевіча**







# А ці цыцкі ў іх ёсьць?

Франц Сіўко. Запісы.

* * *

Закадычны сябар, закляты вораг.

Ненавідзяць адзін аднаго, пішуць адзін на аднаго пасквілі, паслухаць каторага, дык няма ў сьвеце горшага чалавека за таго, другога. Але — усюды разам, упобачкі, быццам ланцугом нябачным скутыя, так ужо, відаць, і надалей пойдуць па жыцьці сіямскімі блізьнятамі.

Закадычны вораг? Закляты сябар?

* * *

Гогаль за мэцэната цара меў, Чайкоўскі — Надзею фон Мек, цяперашнія літаратары (не зь бяднейшых, вядома) часьцей за ўсё — сябе саміх. Гэткае зрашчэньне, узаемапранікненьне бізнэсу і мастацтва. Бізнэс выхаду ў несьмяротнасьць праз літаратурныя ды іншыя мастацкія справы шукае, мастацтва ад бізнэсу да заваёвы мастацкае прасторы дзеля забесьпячэньня творчага status quo імкнецца. І чым заможней — тым усё больш з прэтэнзіяй на шыкоўнасьць, ні адзін, ні другі, як калісь Эдыт Піяф, у сукні з залапленымі падпахамі на сцэну ня выйдуць.

* * *

І не дараваць — таксама навука, што немалых часам высілкаў каштуе. Можа, нават ня так не дараваць, як давесьці ненавязьліва, што ты пра той учынак, наўмысна супраць цябе скіраваны, выдатна ведаеш. Гэткім жывым увасабленьнем дакору зрабіцца для кагось. Усё ж лепей, чым удавацца, нібыта нічога ня здарылася, і ўсьміхацца-вітацца штодня, чарвяка крыўды-непрыязнасьці, бы фігу ў кішэні, пры сэрцы носячы. Наўмыснае адчужэньне, адцураньне часам — найлепшы сродак і кропкі над «і» адпаведным чынам расставіць, і здароўе, асабліва калі ўжо і пахваліцца ім ня можаш, захаваць.

* * *

Навінкі францускай публіцыстыкі (паводле «Иностранной литературы»): «Зьмярканьне бажкоў», «Агонія эліты. Францыя ў штопары», «Крах эліты». Ці ў нас магчымыя такія загалоўкі? Толькі ўявіць сабе можна рэакцыю ўладаў на такое ўпадніцтва, на такі замах на «сьвятое», як сама яна, улада ў яе ж вачах.

* * *

Словы Шымборскай пра тое, што дарэмна дзень прайшоў, бо не зьдзівіўся анічому, неяк міжволі ў памяці ўсплылі.

Дома — вершы Я.Дашынай у «Маладосьці» і такое ў адным: «Ваша збруя цісьне на габарыты майго сьвету». І там жа — ад маладзенькай У.Дырды: «Калі скласьці два цені — не станецца аднаго цела».

Ці не знарок Бог дзевак таленавітых, каб зьдзіўлялі старэчаў, пасылае?

* * *

Наконт касьбы — зь вясковага, падслуханага.

— Ну, як, дзядзька, падкасіліся крыху?

— Ага, на паўкаровы, мабыць, ужо набярэцца.

І такая мерка бывае — паўкаровы.

* * *

Можа, фактура зубоў ня тая ў яе была, можа, яшчэ што, але ніяк кабеціне расейскае «т» не давалася. Так і гэтак выкручвае яго, бывала, так і сяк падганяе пад належны стандарт — каб зрух, усё штосьці сярэдняе паміж «т» і «к» атрымліваецца. Прыйдзе на працу ў бібліятэку і да загадчыцы: «Здравствуйке, Валенкина Карповна!»

Тэлевізар глядзіш іншым разам — і тое самае чуеш праз аднаго. Сьмех разьбярэ, і згадаеш міжволі тое дваццацігадовае даўніны:

— Здравствуйке, Валенкина Карповна!

* * *

Сташ сабе ў глухім — глушэйшы нагул ці бывае? — віры па грудзі ў вадзе, нікога не чапаеш, і раптам — скок табе зь берага, зь пеньчыка ў прагалку між алешынамі, з амаль паўтарамэтровай вышыні ледзь не на голаў істота кіло пад дзесяць.

Бобрык-дурылка. Яму — у ваду конча трэба вярнуцца, я — на шляху да роднае стыхіі ў яго апынуўся, купаючыся. Добра, паплысьці не пасьпеў у ягоны бок, а то б, пэўна, на сьпіну мне пляснуўся.

Ня ведаю, хто больш спалохаўся: пэўна, я, але разьмінуліся. Шкада: маглі і пагаманіць.

* * *

Яшчэ адно — папярэднім, пра бабра, у памяці ўскалыхнутае.

Суседка янотападобнага сабаку, што з хмызу на панадворак выйшаў, грацоўкаю забіла.

— Выйшаў і гыркае на мяне, — пасьля распавядала. — Біла-біла, ледзь дала рады ўходаць, гэткая жывучая пачварына.

Сусед на рацэ ўвесну бабра вялізарнага, кілё пад трыццаць, што ў пастку з крыгаў трапіў, багром забіў.

— Думаў, усё, не даб'ю гада, аж не — пашэнціла во.

І сабаку, і бабра ўсёю вёскаю хадзілі глядзець. Мацалі асьцярожліва поўсьць, дзівіліся, хаваючы за воклічамі зьдзіўленьня шкадобу: зусім жа не страшныя істоты, прыгожыя вунь якія.

Ды ні аднаго, ні другога з «забойцаў» і не падумаў ніхто ўшчуваць: што там нейкае дзікае, хай і Божае, стварэньне — чужы, незразумелы сьвет.

* * *

Знаёмая патэлефанавала з радзімы: з настаўніцай, што матэматыцы ў школе мяне вучыла, інсульт здарыўся.

— Як яна? — пытаюся.

— Ужо лепш, — адказвае. — Але не спадзяваліся, што выкараскаецца. Ня жартачкі табе, ляжала ў рэанімацыі, дык з рускага нават бралася гаварыць у бяспамяцтве.

«З рускага» ў нас — значыць па-расейску і заўжды амаль з нотаю няўхвалы.

Як ёсьць.

* * *

Лямус пры руінах колішняга сядзібнага дома ў Міжрэччы пры Саветах ужо пад сілосную яму-лядоўню прыстасаваны. З трох бакоў — каменныя сьцены і толькі з паўднёвага, каб сонца лёд не падточвала, — насып. На стромай гары на стагодзьдзі збудаваны гаспадаром-руплівцам з улікам усіх асаблівасьцяў рэльефу — ды крапіва сёньня паўсюль, ды дзядоўнік, ды рэзрух. Тое самае і з самім сядзібным домам XVII стагодзьдзя. А калісьці ж, пасьля вайны, на пачатку станаўленьня калгаснага ладу ох як спраўна выкарыстоўвалася ўся тая панская спадчына.

Выціснулі ўсё, што маглі, новыя «гаспадары», кінулі на зглум і далей пайшлі ў пошуку новых аб'ектаў эксплюатацыі чужога.

# Сустрэліся дзьве каровы

Раман Абрамчук. Алегорыя.

Неяк нікому не зразумелым чы нам сустрэліся на неабсяжных прасторах Эўропы дзьве каровы — беларуская і швайцарская. Зазначым, што сустрэча адбылася дзесь на памежжы — на абшарах ці то ўсходняй Нямеччыны, ці то заходняй Польшчы. Але, зрэшты, гэта ня мае вялікага значэньня...

Нашая кароўка — звалі яе Лыскай — троху схамянулася, сустрэўшы падобную да сябе замежніцу. Бо тая замежніца, як і ўсе швайцарцы, увесь час усьміхалася, выглядала больш дагледжанай, чыстай, сытай і задаволенай жыцьцём. Але прыродная цікаўнасьць нашае Лыскі перамагла прыродную сьціпласьць — і размова пачалася...

— Добры вечар! — прамукала, пачырванеўшы, Лыска (усё адбывалася ўвечары).

— Добры вечар! — вельмі ветліва адказала швайцарка.

Пасьля звычайнай няёмкай паўзы размова працягнулася:

— Дазвольце пацікавіцца, а Вы адкуль? — далікатна спытала швайцарка (ёй, як і нашай Лысцы, былі ўласьцівыя тыя ж прыродныя цікаўнасьць і сьціпласьць)

— Зь Беларусі.

— А гэта дзе?

— А гэта там, на ўсходзе, за Беласточчынай, за вялікім лесам (Лыска, напэўна, мела на ўвазе Белавескую пушчу).

— А я — са Швайцарыі, — радасна падтрымала размову швайцарка. — Я жыву ў прадмесьці Бэрну.

— А я ў Казянах, на Пастаўшчыне, — прыязна адказала Лыска.

Навасьпечаныя прыяцелькі пільна ўглядаліся адна ў адну. Лысцы падаўся троху хуліганскім хохлік паміж рагамі швайцаркі, а швайцарку троху адштурхнуў заіржавелы званочак на шыі беларускі. Але гэта не скасавала ўзаемнай сымпатыі і прыязная размова пацякла шпарчэй. Кароўкі распавядалі адна адной пра сяброўак, пра пастухоў, традыцыі жывёлагадоўлі ў родных краінах, выпадкі, якія здараліся зь імі ў жыцьці. І тут размова перайшла на больш інтымны, глыбокі ўзровень, бо два наступныя пытаньні былі надзвычай важнымі для ўсіх хатніх жывёлаў.

— Добрыя ў вас гаспадары? — пацікавілася беларуска.


PHOTO.BYMEDIA.NET

— Ну так... добрыя... — троху зьдзіўлена адказала швайцарка. Яна і не здагадвалася, што гаспадары бываюць злыя.

— А сена хапае?

— Так... хапае... — яшчэ больш зьдзіўлена адказала швайцарка на пытаньне, якое ніколі яе не хвалявала. Лыска цяжка ўздыхнула. І тут далікатная швайцарка здагадалася: Лыска жыве ў страшнай бядноце, і хоча, відаць, эміграваць у нейкую заходнеэўрапейскую краіну, дзе пануе дабрабыт і на твары ў людзей не зьнікае ўсьмешка. І швайцарка захацела, па заходнеэўрапейскай завядзёнцы, зрабіць штосьці добрае для новай сяброўкі.

— Слухайце, а Вы б не хацелі цяпер пайсьці разам са мной, у Швайцарыю? Я ведаю, якім чынам Вам можна будзе застацца жыць у нас.

Пачуўшы такую нечаканую прапанову (а Лыска нават і ў думках ня мела жаданьня эміграваць), Лыска сьпярша кінулася ў мроі пра новае жыцьцё, швайцарскія горы, чысты хлеў і сытую вячэру з імпартнымі прысмакамі. Ёй захацелася пакаштаваць гэтага жыцьця, пра якое яна ведала толькі па чутках і размовах гаспадароў, захацелася паляжаць на швайцарскім сене, займець такі ж бліскучы званочак, нават такі ж хохлік між рагамі, захацелася памукаць зь вяршыні Альпаў, заблукаць у тых самых Альпах, каб потым шукалі гаспадары, з твараў якіх не сыходзіць усьмешка, захацелася пазнаёміцца з маладым швайцарскім бычком, завесьці добрую сям'ю, прыдбаць цялятак, а ўвечары весьці ціхія размовы ў стойле з падагравальнікам, захацелася пакаштаваць канюшыны на сонечным полі ... І раптам наша Лыска ўзгадала пра канюшыну, што расьце на лузе пад Казянамі.

— А ў вас расьце канюшына? — узбуджана спытала Лыска.

— Канюшына? А што гэта такое? У нас каля пяцідзесяці відаў розных расьлінаў на пашы, да таго ж кожную нядзелю прывозяць прысмакі з Галяндыі, адмыслова для кароў. Праўда, яны з харчовымі дадаткамі, але смакоцьце якое!...

Лыска апусьціла галаву. На памяць ёй прыйшоў квяцісты луг пад Казянамі, лёгкія аблачынкі ў небе Пастаўшчыны, смуглявы твар дзяўчынкі, што пасьвіла статак, і дарога на Відзы...

— Няма канюшыны?... Няма канюшыны... — зачаравана паўтарала Лыска.

Неяк адразу пацягнула дамоў, да родных пастаўскіх краявідаў, да родных гаспадароў, якія ўсьміхаюцца зрэдку, але шчыра і не ад сытага абеду...

Пакруціўшы мордай, Лыска рашуча, прамукала:

— Дзякую, але мяне чакаюць дома. Была рада пазнаёміцца. Калі будзеце ў нас на Пастаўшчыне, завітвайце да нас, трэцяе стойла справа ад дарогі на Відзы. Бывайце!

І Лыска зь дзявочай лёгкасьцю пабегла на ўсход, кіруючыся на Беласток.

А швайцарка засталася стаяць на месцы, і , пазіраючы ўсьлед сваёй сяброўцы з далёкай Беларусі, думала: «Можа, ня трэба было казаць пра харчовыя дадаткі ў прысмаках з Галяндыі?..»

# Праклятыя паэты



Дык што ж за беды такія, якія пакуты сагнулі нашых паэтаў у барані рог? Ніводзін не зазнаў турэмных нараў, проч выцьвярэзьніка. Ніхто ня быў скалечаны, ня страціў зрок, не аглух...



Анатоль Сыс.

Далі пачытаць стары нумар «Калосься» (1-2006). Ужо больш за месяц мінула, а ўсё круцяцца ў галаве думкі ад прачытанага. Як надакучлівыя мухі. А мо — восы?

Нумар прысьвечаны трагічным лёсам паэтаў — Сыс, Купрэеў, Гадулька, Рубін. Усе яны заўчасна пайшлі з жыцьця — хто сьпіўся, хто наклаў на сябе рукі… (Усе, бо хоць Мікола Купрэеў фармальна пражыў досыць доўга — але ці было гэтае існаваньне жыцьцём?)

Пытаньне, якое мучыла пушкінскага Сальеры — чаму высокі дар Нябёсаў дастаецца слабым і нікчэмным людзям? А няхай бы гэта была ўзнагарода за выдатнае навучаньне і прыкладныя паводзіны! А то — вершы будуць «праходзіць» у школе, а вось біяграфіі аўтараў, як прыклад «делать жизнь с кого», — не.

Варлам Шаламаў, прачытаўшы «Адзін дзень Івана Дзянісавіча», быў абураны: што гэта за лягер такі, дзе ўсе мелі лыжкі? У нашым баланду пілі цераз край! Чаму ходзіць кот? У нашым даўно б зьелі… і гэтак далей. «Зьявіўся яшчэ адзін «лякіроўшчык рэчаіснасьці» — рабіў выснову Шаламаў.

І вось гэтыя людзі, што прайшлі зямное пекла, непараўнальнае з дантаўскім, — не зламаліся. Ні Шаламаў, ні Салжаніцын, ані нашы Ларыса Геніюш ці Лявон Луцкевіч. Дык што ж за беды такія, якія пакуты сагнулі нашых паэтаў у барані рог? Ніводзін не зазнаў турэмных нараў, апроч выцьвярэзьніка. Ніхто ня быў скалечаны, ня страціў зрок, не аглух…

«… калі Сыс атрымаў кватэру», — не зарабляючы і не пазычаючы грошы, не беручы крэдыту — атрымаў, як кветку ў дзень народзінаў. Купрэеў — таксама. Не ў карцары-адзіночцы пісалі вершы, а ў аднапакаёўцы з ваннаю й цёплым клязэтам. Во які зьдзек рэжыму!

Купрэеў, праўда, перажыў сапраўдную трагедыю — Дзяржаўнай прэміі не далі. Як жа тут ня сьпіцца з гора…

І ўсё роўна — калі чалавек губіць сябе, гэта заўсёды драма. Якім бы гэты чалавек ні быў.

Часта цытуюць Пушкіна — як той абураўся, што публіка любіць смакаваць жыцьцяпісы творцаў — маўляў, «он так же мал и мерзок, как мы!». Не, «мал и мерзок — но не так, как вы!» — пярэчыць паэт.

У тым і бяда, што — так. Бомж-паэт сьмярдзіць гэтаксама, як любы іншы. Ці пакрыўдзіць цябе паэт, ці бухгальтар — усё роўна баліць. Толькі крыўда з боку паэта — горшая, бо ад яго чакаеш «разумнага, добрага, вечнага».

Бачыў у кнігарні таўстую кнігу — «Таркоўскі і я». Нейкая дама сабрала пад адной вокладкай усе рахункі вялікаму рэжысэру. Бо на вокладку вынесеная тэза: няпраўда, што «гений и злодейство» несумяшчальныя.

Кнігу я не чытаў, але думаю, што там напісаная праўда. (Дарэчы, гэтыя так часта цытаваныя словы Пушкіна — не ягоная асабістая думка. Яны ўкладзеныя ў вусны Моцарта, каб падкрэсьліць ягоную наіўнасьць.)

Так бы хацелася, каб творцы нашых любімых вершаў і фільмаў былі белымі й пушыстымі, так хацелася б любіць аўтараў — як людзей. А яны найчасьцей злыя, калючыя й кепска пахнуць.

Леў Талстой тлумачыў гэта так — мастак бярэ зь сябе ўсё лепшае і ўкладвае ў свае творы, таму яны «прекрасны, а жизнь его дурна».

Мастак — і такі, і не такі, як усе. Як і ў кожным, у ім гняздуецца цэлы зьвярынец — ня толькі белыя рахманыя галубкі, але й брудныя гіены. І не заўсёды ён мае ўладу над імі.

Але прыгажосьць прыходзіць на гэты сьвет праз яго.

І ня ў нашай моцы накіроўваць яе шляхі.

Быў бы творца ЗЬ «іншага цеста» — як бы ён перадаў і выказаў тое, што робіцца з намі? Калі б не спазнаў усё на ўласнай скуры — гора і радасьць, грэх і раскаяньне?

Творца ня можа пражыць жыцьцё, не пакрыўдзіўшы нікога. Многіх ён зьневажае самім фактам свайго існаваньня. Тым, што пастаянна рвецца на волю — нават ад тых, хто яго ўсім сэрцам любіць.

Нельга апраўдаць брудныя ўчынкі паэта.

Але іх можна — прабачыць.

Няшчасны чалавек, якога пакрыўдзілі. Але той, хто няздольны прабачыць, — няшчасны ўдвая.

Жыцьцё кожнага чалавека — драма. Але драма паэта — падвойная. Бо ён жыве падвойным жыцьцём — зямным і нябесным.

Аднак на судзе над Паэтам у першую чаргу разглядаюцца ягоныя песьні. І кепскі верш для паэта — грэх нашмат большы, чым няшлюбнае дзіця.

Паэт як асоба — наносіць раны.

Паэт як творца — раны гоіць.

Будзьма ж удзячнымі — нягледзячы ні на што.

**Алег Аблажэй, газэта «Свабода»**

# Нотр-Дам дэ Ўладзімер

Піша айцец **Аляксандар Шрамко**.

Праваслаўныя адзначылі дзень шанаваньня Менскай іконы Божай Маці. Сама ікона знаходзіцца ў Менскім катэдральным саборы. Адпаведна легендзе, яна зьявілася ў Менску ў 1500 г. — цудоўна прыплыла з Кіеву супраць плыні ракі і,такім чынам, стала знакам асаблівай Божай міласьці да гораду. Таму на гербе Менску, як вядома, і прысутнічае вобраз Божай Маці. На адным з старадаўніх варыянтаў гербу яна так і намаляваная — ідучы па вадзе.

Але цяпер я не зусім пра гэтае сьвята. I нават не пра менскую ікону. А пра выключна сучасную зьяву.

Раней я неаднаразова чуў, што праваслаўныя іконы апошнім часам сталі вельмі папулярнымі на Захадзе. Бачыў і сваімі вачыма немалую іх колькасьць у асартымэнце касьцельных кіёскаў. Але гэта ў нас. У нас гэта можна сьпісаць проста на ўзаемны ўплыў побач існуючых канфэсіяў. Зусім іншая справа, калі падобнае бачыш у краіне, дзе каталіцтва дамінуе падаўляльна. Напрыклад, на вітрыне каталіцкай крамы, якая выпадкова мне трапілася на вочы ў Варшаве, праваслаўныя іконы займаюць абсалютную большасьць месца **(на фота)**.




Можа ўсё ж і Варшава ня так далёка ад нас? Але вось я ўжо на іншым баку Эўропы. Сабор Нотр-Дам у Парыжы. Першым, што я пабачыў, калі ўвайшоў у гэтую адну з найбуйнейшых і сымбалічных сьвятыняў Захаду, была праваслаўная ікона — на сьцяне за турыстычнай лаўкай. Пры ўваходзе, быццам візытная картка.

Калі потым я пытаўся на гэты конт у французаў, яны пацьвердзілі, што і праўда — праваслаўная ікона карыстаецца папулярнасьцю на Захадзе. I нават ня толькі сярод каталікоў, але і пратэстантаў некаторых дэнамінацыяў. Гаворка ідзе, зразумела, не пра афіцыйнае, а пра прыватнае ўжываньне. Што гэта, проста мода? Так, бывае, што Захад захлёствае нейкая мода на «духоўную містыку» з Усходу. Большай часткай нават з больш далёкага Ўсходу, чым праваслаўе. Але калі гэта і мода, то яна нешта ж і адлюстроўвае. Не пабаюся сказаць — нейкі голад, які ня можа здаволіцца мясцовай традыцыяй.

Так што ж ёсьць такое ў іконе, што робіць яе такой характэрнай менавіта для праваслаўя? У свой час заходняя частка Царквы, якая цяпер вядомая як каталіцкая, зрабіла вельмі значны ўклад у барацьбу супраць самых небясьпечных ерасяў хрысьціянства, у тым ліку і супраць іканаборства. Ды і так вядома, што ў каталіцтве, як і ў праваслаўі, вельмі распаўсюджанае шанаваньне цудатворных іконаў. Бывае, што адзін вобраз прызнаецца цудатворным і праваслаўнымі, і каталікамі. Як, напрыклад, іконы Вастрабрамская, Чанстахоўская, Жыровіцкая…

Але, на жаль, Вялікі раскол адбіўся ня толькі на богаслужбовых традыцыях, але й на дагматычных поглядах і містычным досьведзе. Гэта, дарэчы, робіць утапічнай ідэю сапраўды роўнай і шчырай уніі гэтых дзьвюх галінаў хрысьціянства.

Ікона шануецца і там, і там. Але разуменьне яе не аднолькавае. Праваслаўныя ўспрымаюць ікону больш з погляду вучэньня і малітоўнай практыкі, што адлюстравана ў вучэньні сьвятога XIV ст. Рыгора Паламы. Калі коратка, сутнасьць такая. Бог існуе ня толькі ў недасягальнай для чалавека Існасьці, але і ў энэргіях, якія ўспрымаюцца чалавекам. Гэтыя энэргіі адкрываюцца ў тым ліку і праз ікону. Ікона, такім чынам, разглядаецца як вакно ў сьвет Бога. Ікона служыць ня толькі як сродак лепш пранікнуцца думкамі пра Бога, але Сам Бог зьяўляе Сябе праз ікону ў энэргіях. Такі погляд не зусім у традыцыях заходняй містыкі, што і адбілася на вядомай спрэчцы Рыгора Паламы з заходнім манахам Варлаамам.

Містычныя практыкі Ўсходу і Захаду разышліся, але душа чалавечая адчувае недастатковасьць традыцыі аднаго боку і шукае дапоўненасьці ў іншым баку. Магчыма таму і сярод праваслаўнай моладзі, напрыклад, даволі папулярны заходні манастыр у Тэзэ, дзе яна таксама знаходзіць нейкую дапоўненасьць у досьведзе духоўнай практыкі, якая страцілася на Ўсходзе.

**Айцец Аляксандар Шрамко**

нар. у 1957 у Пінску. Вучыўся на факультэце радыёфізікі БДУ. У канцы 1970-х прыйшоў да Бога. У 1997 г. скончыў Менскую духоўную сэмінарыю. Быў настаяцелем храму ў в.Строчыцы. Першы зь менскіх сьвятароў пачаў на службах чытаць Эвангельле па-беларуску. У 2007 мітрапаліт Філарэт забараніў А.Шрамку служэньне за ўдзел у прэс-канфэрэнцыі па абароне права на свабоду сумленьня і залічыў яго за штат да раскаяньня. А.Шрамко вядзе «Дзёньнік сьвятара» на сайце www.nn.by.

Ганна Чакур.

# Заўважынкі



* * *

Падглядаю. З-за фіранкі. Праз акно. Назіраю, як сястра зьбіраецца адʼяжджаць. Спачатку яна прымацавала рамень бясьпекі, затым пакратала рычажкі машыны. Перахрысьцілася — неяк бегла, нібы крадком. Потым, гледзячыся ў пярэдняе люстэрка, стала маляваць вусны. Рабіла гэта старанна і доўга. Разы ў чатыры даўжэй, чым хрысьцілася. Мая сястра — сапраўдная жанчына.

* * *

У цётачкі Міры, маёй суседкі, ля самага плоту расьце яблынька са смачнымі яблыкамі. Кожную раніцу, ідучы на працу, старанна «рэвізую» траву на прадмет яе сакавітых ападкаў, знайшоўшы якія, доўга і з асалодай смакую. Відаць, заўважыўшы мае штодзённыя пошукі, суседка прынесла аднойчы вечарам цэлую авоську тых самых яблыкаў. Ня ведаю чаму, але яны падаліся мне зусім не такімі смачнымі, як тыя — уласнаручна здабытыя з-пад плоту.

* * *

Іду па «зялёным» мосьце цераз Вяльлю. Ну добра, цераз Нярыс, таму што ў Вільні рэчка мяняе свае «нацыянальнасьць» і назву. На яе левым беразе з бруку, па-літоўску, вядома, выкладзеныя словы: «Я цябе кахаю». Прачытала і далей пайшла ў прыўзьнятым настроі, нібы невядомы майстар прызнаўся пэрсанальна мне. А калі вярталася назад, на правай старане рэчкі заўважыла гэткае ж брукаванае: «І я — цябе».

Выходзіць, гэта берагі, як назаўсёды разьдзеленыя лёсам людзі, толькі і могуць што здалёк шапнуць адзін адному найважнейшыя словы…

* * *

На школьным стадыёне два першаклясьнікі вучацца катацца на лыжах: зь відавочнай цяжкасьцю сьлізгаюць па лыжні нагамі, няўлад крокам перабіраюць палкамі. У трэцяга — лыжаў няма, і ён, імітуючы рухі сваіх больш шчасьлівых сябрукоў, бараніе сьнежную цаліну ўласнымі камашыкамі. А калі хто-небудзь зь яго прыяцеляў падае, ён тут жа кідаецца на дапамогу: падымае яго, абтрасае сьнег, падае згубленыя палкі.

* * *

— Цёця, — пытаецца ў мяне пяцёхгадовая дзяўчынка, — а што такое каханьне?

Маўчу. Думаю. Урэшце шчыра прызнаюся:

— Ня ведаю.

— Ну вось, — крыўдзіцца дзяўчо. — А я думала, ты дарослая.

*Астравец*



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Першыя восеньскія клопаты. Мёрскі раён.**

# ErBe

Дзеячы палітычнай апазыцыі прызыву 90-х асэнсоўваюць сябе. Выдаюцца мэмуары, камэнтары. Свае развагі над літаратурай, пэдагагічнай і грамадзкай дзейнасьцю сёлета выдаў і Яўген Бяласін **(на фота)**. Ад былога старшыні БНФ Берасьця чакаеш нечага запаветнага. Масавага. І памыляесься.

Апошнія 15 гадоў — час, калі эўрапейскія гуманітарныя дасьледаваньні набылі эсэістычную форму, пачалі карыстацца мастацкай мовай. Дасьледаваньні пры такім падыходзе становяцца мэтафарычнымі. На Захадзе гэтак пісалі Ігаб Гасан і Лінда Гатчэан. У Берасьці так піша Яўген Бяласін.

Апошнія 15 гадоў у Беларусі — час «калыханкі». Як піша Бяласін у «Адкрытасьці людзям», выпрабаваньне «пазытыўнасьцю краіны» вымагае ад палітыка — ня стаць банальным, ад пэдагога — захаваць эўрапейскі крэатыў, нават у саўковым унівэрсытэце (зь якога некалькі гадоў таму сп.Бяласіна выціснулі). Ад мастака — не замкнуцца ад Беларусі-reality.



Незвычайна выглядае літаратурная крытыка Бяласіна. У літаратуразнаўстве гэта называецца рэцэптыўнай крытыкай, у якой мастацкае пераплятаецца з жыцьцём аўтара, з надзённымі берасьцейскімі праблемамі. У канцы кнігі сп. Бяласін зьмяшчае «раскрыцьці» і відэомы (графічныя вобразы яго ідэй), якія тлумачаць, па якой схеме пабудаваная кніга: афіцыйны дыскурс («РБ», палітыка, дзяржава), які, безумоўна, хвалюе Бяласіна-палітыка, на працягу ўсёй кнігі мяжуе з паэтычным і лірычным (спадчынай) — як у нямецкім слове Erbe, што месьціць у сабе гучаньне «РБ» і значэньне «спадчына».

Ёсьць у Бяласіна зямляк — з паўднёвага Панямоньня, Адам Міцкевіч. Ён таксама прамяняў працу ва ўнівэрсытэце парыскім на змаганьне з расейцамі ў Турэччыне — і застаўся жыць у вяках.

Урокі ахвярнасьці працягваюцца. Пра іх — усе 12 частак кнігі Бяласіна.

**Наталка Харытанюк**

**Яўген Бяласін. Открытость людям: 15 лет.** — Брест, 2006.

# Ноччу магчыма ўсё

Узятыя паасобку, апавяданьні, надрукаваныя за апошнія 14 гадоў у Нашай Ніве, здаюцца поўнымі роспачы, начной вусьцішы. Героі хаваюцца ад гарадзкіх пачвар у начных вуліцах, цягнуць «свой жа катафалк» па начной дарозе, бачаць у снах жуду таталітарнай сыстэмы, якая нібыта абмінула іх у сапраўднасьці.

Аб'яднаныя ў зборнік, апавяданьні выцягваюць з начнога жаху і нешта вельмі прыцягальнае. Ноччу героі становяцца шчырымі. Ноччу, у адбітках вітрынаў і вокнаў, героі бачаць нарэшце саміх сябе — свае адлюстраваньні, сваіх двайнікоў…

Многія героі зборніка ці самі становяцца двайнікамі, ці раздвойваюцца, ці мяняюць сваё аблічча. І амаль усе яны — з апавяданьня ў апавяданьне — на нешта захворваюць. Такая іх татальная хваравітасьць, зануранасьць у ноч, наводзіць, як ні дзіўна, на вельмі сьветлыя думкі пра сучасную беларускую літаратуру.

«Хворыя» героі — гэта пазытыўна. Гэта скідваньне чужых сэнсаў літаратурай. Гэта ўвасабленьне адвечна беларускага закону ліючайся формы. Што можа быць страшней за цьвёрдыя формы, пытаўся Ігнат Абдзіраловіч сто год таму. Сёньняшнія героі руйнуюць цьвёрдыя формы сваімі пераўвасабленьнямі, двайніцтвам, існаваньнем уначы. Жняя са снапом ператтвараецца ў паўмужчыну-паўваўка, а партызанская мадонна — у бога вайны ў апавяданьні Паўла Касьцюкевіча. У двух розных сьветах адначасова існуе і Казік з апавяданьня Кастуся Траўня: ён сам стварае сабе ўтульны Менск у чужым Мінску, зьбіваючы сваімі словамі ня толькі мінакоў, што пыталіся ў яго дарогі, але і маёра КДБ, які губляе ў выніку рытм і тэмп гаворкі.

Скрозь увесь зборнік героі шукаюць саміх сябе — сваю чыстую, не засьмечаную чужымі сэнсамі форму.

Герою няпроста супрацьстаяць чужой рэальнасьці, чужой уладзе. Шукаючы сытуацыю безуладзьдзя, ён мусіць несьці свае правілы праціўніку, парушаць насаджаныя законы, зьбіваць чужы рытм. А для гэтага яму канечне ўвесь час гаварыць, гаварыць, гаварыць. Ён ня мае права замаўчаць — інача ён згубіць пільнасьць і трапіць у палон, як гэта здарылася з героямі апавяданьня Ігара Сідарука, «кожны зь якіх у маўчаньні чакаў свае чаргі… каб ехаць і ехаць… ехаць і ехаць… ехаць і ехаць скрозь цёмную ноч…» Як толькі герой забудзе, што стварыў свой сьвет насуперак рэчаіснасьці, дзе «стаіць такая вусьціш і гэтак цісьне жуда», што ён абаронены сваім словам, ён трапіць у палон. Паверыць у сваю паразу і счэзьне. У яго, як у Магдачкі зь «Менскай Опэры» Ігара Бабкова, спачатку зьнікне голас, а пасьля і воля.

Ратавацца героі гэтага зборніка сыходзяць у ноч.

У цемры ня бачныя бар'еры і межы.

Героі гэтага зборніка сыходзяць ад сьветлых дзённых праспэктаў у начны горад, у свае кватэры і шпіталі, у дамы афіцэраў і турмы, у каварні і вар'ятні.

Ноч — гэта пачатак. Ноччу ўсё здаецца магчымым.




**Паветраны шар: беларускае мужчынскае апавяданьне** / Вячаслаў Адамчык, Аляксандар Апон, Арцём Арашонак і інш. — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2007. — 334 с. — (Кнігарня «Наша Ніва»).

**Часопіс «Паміж» № 6**

**Чарговы нумар часопісу студэнтаў і выкладчыкаў аддзяленьня факультэту філязофіі і літаратуры Беларускага Калегіюму.** Філязофія ад Пётры Рудкоўскага і Юр'я Андруховіча, проза Вольгі Такарчук, Тараса Прахаські, Ані Самон, Трумэна Капотэ, творы Зьмітра Смалякова, Глеба Лабадзенкі, Тацяны Беланогай, Сержука Мядзьведзева.

# Фэст, скіраваны ў бок Беларусі

На літоўска-беларускім узьмежжы прайшоў міжнародны музычны фэстываль «be2gether» — «Будзьма разам».



WWW.SVABODA.ORG

Мерапрыемства несла і пэўную палітычную нагрузку. Фэст праходзіў за 50 мэтраў ад беларускай мяжы, у літоўскай вёсцы Нарвілішкі. Галоўным спонсарам выступіла Міністэрства замежных справаў Літвы, а лёзунг мерапрыемства «Музыка адчыняе межы» быў відавочна скіраваны ў бок Беларусі.

Заплянаваны фэстываль быў як грандыёзная фіеста — найвялікшы музычны праект у Прыбалтыцы. Ці апраўдала сябе задумка фэстывалю як крок літоўцаў насустрач беларусам — пытаньне, але арганізатары стараліся. Колькасьць удзельнікаў, праўда, відавочна не дацягнула ані да заяўленых 15, ані да 10 тысячаў. Аднак якасьць музыкі і арганізацыі ад гэтага не пацярпела.

Беларускія ўдзельнікі на мерапрыемстве губляліся сярод іншых, таму аб «прабеларускасьці» фэсту можна было здагадацца па асобных заявах выканаўцаў. Яскрава-беларускім момантам стаўся выступ гурту «Ляпіс Трубяцкой». Каля сцэны сабраліся ці ня ўсе беларусы, якія зьехаліся ў тыя дні ў Нарвілішкі. Міхалок салідарызаваўся зь лёзунгамі мерапрыемства — «Будзьма разам» і «Музыка адчыняе межы».

Акрамя гэтага гурту, на фэстывалі ў Літве выступалі яшчэ дзьве беларускія каманды і безьліч заходніх ды літоўскіх гуртоў. Можна сказаць, што просьба беларускага МЗС да арганізатараў фэсту пазьбегчы «антыбеларускіх заяваў і правакацыяў» была задаволеная. Ані парушэньняў дзяржаўнай мяжы, ані якіх-небудзь надта палітызаваных выступаў ці эксцэсаў. Адны намёкі. Ды і тыя — вельмі таварыскія, ну вось хоць бы такія, як з вуснаў аднога з гасьцей фэстывалю, міністра замежных справаў Літвы, былога яе амбасадара ў Беларусі Пятраса Вайцекунаса: «Галоўнае — сказаць усім, і беларусам, і літоўцам, і Эўразьвязу, што мы, эўрапейцы, можам і мусім быць усе разам. Разам зь беларусамі, разам з расейцамі, разам з украінцамі».

Ці прыжывецца фэстываль у літоўскім «апэндыксе», каля самай-самай беларускай мяжы — прагназаваць цяжка. Як камэрцыйны праект «Будзьма разам» наўрад ці ўтрымаецца. Застаецца спадзявацца, што віншаваньні і пажаданьні з боку Эўрапейскай камісіі і прэзыдэнта Літвы і налета будуць падмацаваныя салідным фінансаваньнем. Прынамсі беларусы будуць дакладна «за», каб сяброўства Беларусі і Літвы далей заахвочвалася такімі фэстывалямі.

**Паводле Deutsche Welle**

## СЬЦІСЛА

### Хашчавацкі атрымаў «Сэрца ільва»

На львоўскім кінафэсьце дакумэнтальная стужка Юр’я Хашчавацкага «Плошча» пра сакавіцкія падзеі 2006 г. была адзначаная галоўнаю ўзнагародаю «Сэрца ільва».

Кінафэст прайшоў 25 жніўня і быў прысьвечаны Дню незалежнасьці Ўкраіны.

### Камуністы выдалі зборнік вершаў Гілевіча

Кніжку «Бунт непрыкаянай музы» склалі публіцыстычныя вершы Народнага паэта Беларусі, што друкаваліся ў пэрыёдыцы ў 2001—2006 г. У выданьні дапамагла Партыя камуністаў Беларуская.

### Новы дыск «Крамы»

Новы дыск завецца «Усё жыцьцё — дзіўны сон». Акрамя ўдзельнікаў гурту ў запісе ўзялі ўдзел Руся з «Indiga» і знаны расейскі блюзмэн Мікалай Аруцюнаў.

### Рух За Свабоду заснаваў кніжную сэрыю

Гарадзенскае аддзяленьне Руху За Свабоду заснавала кніжную сэрыю «Горад сьвятога Губэрта», прысьвечаную Горадні. Першымі ў сэрыі маюць выйсьці мэмуары Аляксея Карпюка, падручнік «Гораднязнаўства», зарэзаны цэнзурай, біяграфічны зборнік «Беларускі рух у Горадні ў XX ст.» і «Анталёгія гарадзенскага року».

### Выйшла кніжка Ірыны Шаблоўскай

Ірына Шаблоўская (1939—2004) была першым у Беларусі доктарам філялягічных навук у галіне замежнай літаратуры. У выдавецтве «Радыёла-плюс» выйшаў зборнік яе артыкулаў «Сусьветная літаратура ў беларускай прасторы». Гэтая кніжка — прыклад сучаснага літаратуразнаўства, адрасаванагашырокаму колу чытачоў.

**«Тузін Гітоў», АР, «Товарищ»**

# Сямён Шарэцкі: «Лукашэнка хацеў стаць на чале БНФ»

Працяг са старонкі 21.

мэдычная дапамога, дарэчы, асобам майго веку бясплатная. Гэта іншы сьвет. Нядаўна я меў праблему з вачыма й паклаўся ў шпіталь на апэрацыю. Цяпер бачу «як сокал», і ані цэнту не плаціў за паслугі. Арыенціром для Беларусі павінен быць менавіта такі заходні сьвет. Беларусы, на жаль, абралі для сябе іншы шлях. У свой час яны мелі выбар, але, на жаль… Гэта ня іх віна, але іх бяда ў тым, што яны былі мала інфармаваныя. Калі я працаваў старшынём калгасу, то мяне таксама ніхто нікуды не пускаў. Часам давалі паглядзець горшы ці лепшы калгас.

**— Ці не дакучае Вам настальгія? Ці хацелі б вярнуцца на Бацькаўшчыну.**

— Разумееце, што ж думаць і марыць аб тым, што ніколі ня зьдзейсьніцца? Куды я паеду? У турму? Дзе Ганчар? Сытуацыя гэтая, відаць, захаваецца яшчэ надоўга, бо там няма ніякай сілы, якая б зрушыла гэты стан. А Расея будзе трымацца, як цэпка, за Беларусь і будзе рабіць усё, каб ня даць нашай краіне быць сапраўды незалежнай. Тым больш ёсьць у іх да каго прытуліцца, на каго абаперціся.

**— Ці ня сорамна цяпер Вам за тыя рашэньні, якія Вы ў свой час прымалі, будучы старшынём Вярхоўнага Савету? Сытуацыя тады ў многім залежала менавіта ад Вас.**

— У той час я лічыў, што я раблю ўсё, што ад мяне залежала. А ня ўсё ад мяне залежала. Былі й памылкі, але ж без гэтага чалавек пражыць ня можа. Але тады, калі я гэта рабіў, я рабіў усё сумленна.

**Дзьмітры Гурневіч, Польскае радыё для замежжа**

## КАЛЯНДАР

## Верасень

**1** — Дзень Ведаў.

**8** — Дзень беларускай вайсковай славы.

**8** — Нараджэньне Багародзіцы ў каталікоў.

**13** — пачатак Рамазану ў мусульманаў.

**14** — Чэсны Крыж у каталікоў

**17** — 100 гадоў таму (1907) нарадзіўся паэт і перакладчык Сяргей Дзяргай.

**21** — Эўрапейскі Дзень без машынаў.

**21** — Нараджэньне Багародзіцы ў праваслаўных.

**23** — Рош Ашонэ (Новы год) у габрэяў.

**26** — Эўрапейскі дзень моваў.

**27** — Сусьветны дзень турызму.

**27** — Чэсны Крыж у праваслаўных

**27** — 125 год таму (1882) нарадзіўся Міхаіл Кахановіч, беларускі палітык, пэдагог, публіцыст.

**29** — Сьвятых Арханёлаў у каталікоў.

**30** — У каталікоў ушаноўваецца сьв. Геранім Стрыдонскі, сьвятар й доктар Касьцёлу, апякун ўсіх перакладчыкаў. Гэты дзень лічыцца таксама сусьветным днём перакладу.

**Студэнты з аб’яднаньня «Гісторыка» працягваюць рэстаўраваць замак у Любчы. Дзейнасьць жорстка рэглямэнтуецца: штогод кіраўнік фонду «Любчанскі замак» Ян Пячынскі падае на зацьвярджэньне ў адпаведныя органы праект рэстаўрацыі. Гаворыць гісторык з Рэчыцы Мікола Рудакоўскі: «Мы правялі грунтоўныя дасьледаваньні. Хімічную экспэртызу прайшоў тынк са сьценаў ацалелых вежаў, былі зробленыя архіўныя пошукі, знойдзеныя гістарычныя рысункі замку». Кіраўнік «Гсіторыкі» Зьміцер Рагачоў усьцешаны, што кожны год столькі моладзі адкладае свае справы й прыяжджае на бераг Нёману, каб зрабіць унёсак у адраджэньне гістарычнай спадчыны. Сёлетні летнік скончыўся 25 жніўня традыцыйным канцэртам і рыцарскім спэктаклем. Барыс Гарэцкі**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Сьвяты Патрык і кароль Біл

Як ірляндцы шукаюць узаемаразуменьне. Піша **Ўсяслаў Шатэрнік.**

Вывад брытанскіх войскаў з Паўночнай Ірляндыі азначае канец цэлага пэрыяду ў жыцьці зялёнага вострава. Квінтэсэнцыю гэтай гісторый даў Шэксьпір: «Я... З Ірляндыі, мілорды, // Паведамляю вам. Мяцежнікі паўсталі, узьняўшы зброю на ангельцаў».

Цяпер на першае месца выходзяць канфлікты паміж самімі ірляндцамі. Яны таксама маюць даўнюю гісторыю.

На нацыянальным сьцягу Ірляндыі тры колеры: зялёны, белы, аранжавы.

Зялёны зьвязваюць са сьвятым Патрыкам, які тлумачыў хрысьціянскія дагматы з дапамогай зялёных лісьцікаў. Як тры лісьцікі канюшыны, што вырастаюць з адзінага кораня, так і Бог-Айцец, Сын і Дух Сьвяты складаюць непарушнае адзінства. Такім чынам, зялёны колер сымбалізуе ірляндзкую Каталіцкую Царкву. І ірляндцы шмат зрабілі і робяць для пашырэньня ўплыву Касьцёлу ў сьвеце.

Пратэстанцтва прыйшло з ангельскімі каралямі і пашыралася марудна. Таму ангельскі кароль Джэймз І вырашаў перасяліць на поўнач Ірляндыі сваіх шатляндзкіх падданых — ваяўнічых кальвіністаў. Праз паўстагодзьдзя ягоны ўнук Джэймз ІІ пачаў схіляцца да каталіцызму. Таму падчас рэвалюцыі 1688 г. ірляндзкія каталікі падтрымалі Джэймза, а пратэстанты — яго суперніка Вільгельма Аранскага — караля Біла. 12 ліпеня 1690 г. пратэстанты атрымалі перамогу на рацэ Бойне.

Гэты дзень стаў сымбалем панаваньня пратэстантызму на поўначы выспы, а аранжавы колер — эмблемай аранскай дынастыі, увасабленьнем юніянізму — адданасьці брытанскай кароне. Гэтыя тэндэнцыі ўвасабляе ордэн аранжыстаў, якому належыць галоўная роля ў захаваньні брытанскага панаваньня ў Бэлфасьце. Ордэн будуецца па масонскім прынцыпе і мае філіялы ад Эдынбургу да Новай Зэляндыі. Галоўнымі яго мэтамі зьяўляюцца актыўная матэрыяльная падтрымка пратэстантаў і абарона Брытанскай імпэрыі.

Ня так даўно магістар шатляндзкіх аранжыстаў абвясьціў, што ягоныя браты гатовыя стаць на абарону брытанскай непадзельнасьці, калі Шатляндыя абвесьціць незалежнасьць.

Было б памылкай атаясамліваць пратэстантызм і юніянізм. Сярод ірляндзкіх нацыяналістаў шмат пратэстантаў. Дастаткова назваць пачынальніка ірляндзкага рэспубліканізму Ўолфа Тона, героя барацьбы за гамруль (самакіраваньне) Чарльза Парнэла, песьняра ірляндзкага адраджэньня Ўільяма Батлера Ейтса.

У Дубліне маюцца дзьве пратэстанцкія царквы, дзейнічае знакаміты Трыніты-коледж, які рыхтуе пастараў. Дзень караля Біла прызнаны дзяржаўным, нароўні з Днём сьвятога Патрыка.

Аднак у Дубліне пратэстанты традыцыйна належалі да шляхты або сярэдняй клясы. Наданьне каталікам роўных правоў не пагражала іх становішчу. Ня тое ў Бэлфасьце.

Асноўную масу паўночнаірляндзкіх юніяністаў складаюць рабочыя і сяляне (фэрмэры). У захаваньні ўлады яе Вялікасьці яны бачаць гарантыю працоўных месцаў, кватэраў за кошт суседзяў-каталікоў, якіх лічаць гультаямі, распусьнікамі, бандытамі. Джордж Бэрнард Шоў, які сам паходзіў з ірляндзкіх пратэстантаў, пісаў: «Ірляндзкі пратэстантызм — не рэлігія... гэта ўпэўненасьць у тым, што каталікі — істоты ніжэйшыя, якія трапяць у пекла, калі памруць, і пакінуць рай пратэстанцкім лэдзі і джэнтэльмэнам».

Паўночнаірляндзкіх пратэстантаў часам называюць адзінымі брытанцамі ва ўсім Злучаным Каралеўстве. Толькі яны ўжываюць пастаянна гэты назоў, каб толькі не менаваць сябе «ірляндцамі». Аднак іх стаўленьне да Лёндану, мякка кажучы, неадназначнае. Для іх гэта грэшны Бабілён, адкуль сыходзяць аборты, гомасэксуалізм і іншыя пагрозы пратэстанцкаму ладу жыцьця. Добрыя пратэстанты не глядзяць перадач Бі- Бі-Сі.

Сярод пратэстантаў ёсьць розныя плыні. Адны выступаюць за стварэньне сваёй пратэстанцкай дзяржавы. Другія — за поўную інтэграцыю ў Злучанае Каралеўства. Апошнюю пазыцыю традыцыйна абараняў Іян Пэйсьлі. Ён жа заўсёды падкрэсьліваў неабходнасьць захаваньня прынцыпу непахіснай варожасьці да каталікоў. Пра характар гэтага пратэсту сьведчаць наступныя выказваньні Пэйсьлі: «Д'ябал пазбаўляе нас нашай спадчыны, ставячы на нашым шляху каталіцызм. Усе гэтыя забабоны... імша, шанаваньні Папы разам з такімі заганамі, як забойствы, рабунак, кровазьмяшэньне не пускае нас у зямлю абяцаную». Пэйсьлі бачыць «руку Рыму» і ў Эўразьвязе, бо каталікоў там больш, чым пратэстантаў. Ці трэба пасьля гэтага дзівіцца, што ў гарах Мурн, найпрыгажэйшым кутку Ірляндыі, можна пабачыць надпіс: «Сьмерць усім ірляндцам!»

Увесь сьвет ведае пра тэрарызм ІРА. Менш вядомая дзейнасьць пратэстанцкіх ультра. Рэгулярна на сьвята караля Біла і дзень нараджэньня каралевы аранжысты ладзяць маршы праз каталіцкія кварталы, гучна абяцаючы страляць, паліць папістаў . І гэта не бравада. Рэгулярна на каталіцкіх вулачках зьяўляюцца мэмарыяльныя дошкі, якія нагадваюць пра ахвяраў пагромаў. Да нядаўняга часу аранжысты адмаўляліся хоць неяк зьмяніць праграму сваіх выступаў, спасылаючыся на тое, што гэта іх нацыянальная традыцыя. Затое іх проста трасе, калі дзе-небудзь зьяўляюцца ірляндзкія трыкалёры або майкі каманды «кельты». У такіх выпадках






«добрыя пратэстанты» патрабуюць, каб дамы, дзе былі заўважаныя такія праявы экстрэмізму, былі вызваленыя ад жыхароў. На меншае яны ня згодныя. Нельга не згадаць і пратэстанцкую «Асацыяцыю абароны Ольстэру». Сродкі для сваёй дзейнасьці яна здабывае за кошт гандлю наркотыкамі. Паліцыя ў Бэлфасьце заўсёды была пратэстанцкай, таму па дапамогу каталікі вымушаныя былі зьвяртацца да Арміі, так яны называюць ІРА.

Становішча і настроі ірляндцаў у Ольстэры апісвае адна расейская журналістка: « Уявіце сабе, каб манголататарскае ярмо доўжылася ня дзьвесьце, а васямсот гадоў. Калі б яно прывяло да фактычнага зьнікненьня нашай мовы... калі б вы жылі ў гета без усялякіх надзей на будучыню».

Сёньня сытуацыя шмат у чым зьмянілася. Яшчэ пятнаццаць гадоў таму Ірляндыя лічылася адсталай краінай. Цяпер гэта — «кельцкі тыгр», з голасам якога нельга не лічыцца. Важным крокам наперад стала заява ІРА пра раззбраеньне без папярэдніх умоваў. Іян Пэйсьлі пагадзіўся ўвайсьці ў адзін урад з прадстаўнікамі Шын Фэйн, а значыць ІРА. Як цуд быў адзначаны наступны факт на паседжаньні новага ўраду Ольстэру. Заўзятыя юніяністы былі вымушаныя праслухаць прамову прадстаўніцы Шын Фэйн Барбары дэ Брун на гэльска-ірляндзкай мове. Ці значыць гэта, што ў Бэлфасьце настаў мір, і белая паласа на ірляндзкім сьцягу, якая азначае згоду, нарэшце набудзе рэальны зьмест? Пакажа будучыня.

# Антынікацінавая рэклама: досьвед Эўразьвязу

У нашай краіне нібыта багата ўвагі надаецца сацыяльнай рэкламе, закліканай змагацца з паленьнем тытуню. Але, на жаль, яна не дае адчувальнага эфэкту. Цяжка ўявіць, што бігборд з надпісам «паленьне забівае» і няўцямным малюнкам прымусіць курыльшчыка кінуць пачак у сьметніцу. Тым больш, што бліжэйшы шчыт з цыгарэтным брэндам абяцае штосьці цудоўнае ўжо толькі ад аднаго валоданьня гэтым пачкам. Нашая сацыяльная рэклама ствараецца, відаць, паводле прынцыпу «абы была». Грошы ўкладзеныя, а што эфэкту нуль — дык «галоўнае не перамога, а ўдзел»?

## Досьвед эўрапейскага крэатыву

У Эўразьвязе распрацаваны комплекс мерапрыемстваў дзеля скарачэньня шкоды здароўю і зьмяншэньня спажываньня тытунёвых вырабаў. Існуе магутны дырэктыўна-заканадаўчы пасыл і нацыянальныя праграмы, у тым ліку забарона на паленьне ў грамадзкіх месцах, пастаповае падвышэньне цэнаў на цыгарэты (што робіць іх эканамічна менш прывабнымі), стымуляваньне работнікаў, якія ня паляць. Але Эўракмісія надае сур'ёзную ўвагу і эфэктыўнасьці ўзьдзеяньня сацыяльных антытытунёвых кампаніяў.

Адзін з першых ходаў Эўракамісіі, які забясьпечыў зразумеласьць інфармацыі аб шкодзе паленьня, (ён стаў ужо клясыкай) — увядзеньне нарматываў па афармленьні цыгарэтных пачкаў. Папярэджаньні на цыгарэтных пачках займаюць ня менш за 30% пярэдняй старонкі пачку і 40% — задняй. Не заўважыць складана.

Эўракамісія таксама запатрабавала ўдакладніць маркіроўку шкодных рэчываў і рэчываў, якія выклікаюць залежнасьць. Той жа надпіс аб утрыманьні чаду павінен прымусіць курца лішні раз задумацца пра сваё здароўе.

**Эўракамісія забараніла выкарыстоўваць тэрміны «лёгкія» і «мяккія» — тыя, што ўнушалі спажыўцам думку, нібыта адны цыгарэты менш шкодныя за іншыя.**

Акрамя таго, Эўракамісія забараніла выкарыстоўваць тэрміны «лёгкія» і «мяккія» — тыя, што ўнушалі спажыўцам думку, нібыта адны цыгарэты менш шкодныя за іншыя.

Далей Эўракамісія ініцыявала стварэньне і ўхваліла фотаздымкі і малюнкі, якія варта зьмяшчаць на пачках. Гэта, напрыклад, фатаздымкі чалавека, хворага на рак горла, пачарнелых ад нікаціну лёгкіх курца, высахлы, зморшчаны яблык — як аналяг скуры курца і г.д. Досьвед быў пераняты ў Канады — там пад узьдзеяньнем шакуючых малюнкаў частка курцоў пазбавілася ад шкоднай звычкі.

## Партызанская рекляма і самазатухальныя цыгарэты

Але на гэтых мерах эўрапейцы не спыніліся — кожная краіна прыдумляе свае крэатыўныя хады. Нядаўна бэльгійская агенцыя LG&F распрацавала партызанскую сацыяльную кампанію супраць пасіўнага паленьня для Фонду рэсьпіраторных захворваньняў. Улёткі ў форме цыгарэтаў былі ўторкнутыя ў паштовыя скрынкі Брусэлю. Рэклямны тэкст унутры цыгарэты паведамляў: «Калі вы выходзіце паліць на вуліцу, вы ратуеце жыцьці людзей. Магчыма, не сваё (хаця сьвежае паветра яшчэ нікому не перашкаджала), але жыцьцё сваіх блізкіх — дакладна. Альбо вашага дзіцяці. Гэта сумна, але гэта праўда — большасьць ахвяраў пасіўнага паленьня — дзеці. Ад пнэўманіі, раку і іншых рэсьпіраторных захворваньняў пакутуюць найперш самыя маленькія».

А з 2009 году Эўракамісія прапануе ўвесьці забарону на продаж традыцыйных цыгарэтаў у Эўропе і абавязаць тытунёвыя кампаніі выпускаць самазатухальныя цыгарэты. Калі не зацягвацца, цыгарэта будзе затухаць аўтаматычна. Гэта дазволіць, паводле зьвестак Эўракамісіі, штогод ратаваць жыцьці 2 тысячаў эўрапейцаў. Менавіта столькі чалавек гіне ад пажараў, выкліканых непатушанай цыгарэтай.

Разам з забаронай паленьня ў грамадзкіх месцах творчы падыход дае свае вынікі — колькасьць курцоў у Эўропе з 2003 году няўхільна зьніжаецца прыблізна на 2–3% у год.

Дадзеная публікацыя падрыхтаваная пры спрыяньні Эўразьвязу і не абавязкова адлюстроўвае афіцыйны пункт гледжаньня ЭЗ.
Па дадатковую інфармацыю зьвяртайцеся на сайт www.delblr.ec.europa.eu

# Гурковыя хованкі







Паразьбегліся гуркі
Пагуляць у хованкі.



Капітан Танака ©

http://www.tanakaland.org

Падлічы, колькі гуркоў схавалася ад Танакі.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# ПРАВА БЫЦЬ СВАБОДНЫМ

## АРГАНІЗУЕЦЦА ПАЕЗДКА НА БЕЛАРУСКІ ФЭСТ У ЛУЦК!

**22 верасьня ва ўкраінскім горадзе Луцк** (Валынь) пройдзе фэст беларускага року «Права быць свабодным» з удзелам **«Нейра Дзюбель», «Крама», «Ulis», «Таварыш Маўзэр», «БН», «Сьцяна»** і інш. Даведкі: 649–08–88, fest.svabody@gmail.com Т. 622–57–20.

## КАНЦЭРТЫ

### Зьміцер Вайцюшкевіч

**4 верасьня ў клюбе «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — сольны канцэрт Зьмітра Вайцюшкевіча. **Пачатак — 19.30.** Т.: 671–58–65.

### Аўтограф-сэсія «Крамы»

З нагоды выхаду дыску «Усё жыцьцё — дзіўны сон» Ігар Варашкевіч **(на фота)** зь сябрамі **31 жніўня а 18:00** ладзіць адкрытую прэс–канфэрэнцыю і аўтограф–сэсію **ў дыскарні «Містэрыі гуку», што ў гандлёвым цэнтры «Рыга» (вул. Сурганава, 50)**. Тэлефон для даведак: 671–58–65.

### «Океан Ельзи» ў Менску

**31 жніўня ў Мэдысан-клюбе (Ціміразева, 9)** грае ўкраінскі гурт «Океан Ельзи».

### Шпаркі дэнс

Музычны фэстываль «Шпаркі дэнс» пройдзе **ў клюбе «Стэп» (Прытыцкага, 62) з 31 жніўня да 1 верасьня**. Выступяць **«Bez Білета», «Срэбнае Вясельле», «CherryVata», «Порт Манэ»** і **«Гурзуф»**, а таксама вядомыя дыджэі.

## ВЫСТАВЫ

### Living With Art

**У галерэі «Падземка» (пр.Незалежнасьці, 43) да 1 верасьня** працуе **выстава фатографа «НН» Андрэя Лянкевіча** «Жыцьцё з мастацтвам» («Living With Art»). На здымках — фотавобразы Менску. Аўтарамі работаў зьяўляюцца як знакамітыя фотамастакі, так і творчая моладзь. **Выстава будзе працаваць да 9 верасьня.**

### Мае першыя кніжкі

**1 верасьня ў музэі гісторыі беларускай літаратуры а 12.30** пачнецца **сьвяточнае мерапрыемства, прымеркаванае да Дню ведаў** «Мае першыя кніжкі».

### Навінкі'2007

**У Палацы мастацтва з 1 да 3 верасьня** пройдзе IX міжнародны фэст пэрформансу «Навінкі' 2007».

### Мінск 940. Гэта твой горад!

Фотавыставай пад такой назвай распачынае новы выставачны сэзон **мастацкая галерэя «Ўнівэрсытэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1)**. Выставяць 120 работаў–пераможцаў конкурсу, праведзенага творчым саюзам «Фотамастацтва» і галерэяй «Унівэрсытэт культуры».

### У Палацы мастацтва

**У Палацы мастацтва (Казлова, 3) да 31 жніўня** працуе выстава памяці беларускага мастака **Вэн'яміна Мігаля**, да 2 верасьня — выстава твораў **Яўгенія Каробушкіна і Ўладзімера Гладкова**. Тамсама з 4 да 16 верасьня будзе працаваць выстава беларускага мастака **Ўладзімера Ткачова**. Многія ягоныя творы будуюцца на аснове міталягічных сюжэтаў, паданьняў, казак, з выкарыстаньнем сымбаляў, мэтафараў, гіпэрбалаў…

**Тамсама з 5 да 16 верасьня** — вэрнісаж пэрсанальнай выставы мастака **Мікалая Таранды** «Край мой родны», прымеркаваны да 60–годзьдзя творцы.

### Кітайская вышыўка

**У галерэі «Славутыя майстры» (Камунальная ўзьбярэжная, 6) да 1 верасьня** можна пабачыць вышываныя творы кітайскіх майстроў. Гэта і копіі сусьветных клясыкаў жывапісу, і партрэты на замову, вышываньне якіх патрабуе адмысловай кваліфікацыі.

### Скульптура і графіка Андрэя Асташова

**Да 1 кастрычніка ў мастацкім музэі** прадстаўленая творчасьць мастака Андрэя Асташова. Ягоны аўтарскі стыль вызначаецца ключавым словам «гульня». Пэрсанажы пластычных фантазіяў скульптара маюць не адзін мастацкі і літаратурны прататып, маюць агромністы груз візуальнай і літаратурнай «памяці». Элемэнты тэатру абсурду, гумар часам змрочных адценьняў — таксама складнікі аўтарскага стылю.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

### «Сімпсаны ў кіно»

**Сімпсаны ў кіно** (The Simpsons Movie)

ЗША, 2007, каляровы, 87 хв.

**Рэжысэр:** Дэвід Сілвэрман

**Жанр:** Анімацыйная камэдыя для ўсёй сям'і

**Адзнака:** 7,5 (з 10)

Поўнамэтражная стужка Дэвіда Сілвэрмана, нязьменнага «летапісца» Сімпсанаў, будзе цікавая й гледачам, якія ніколі ня чулі пра вірлавокую сямейку сымпатычных балбесаў.

Ёсьць у мультфільме і рэальныя асобы. Бадзёры Том Хэнкс (агучаны Томам Хэнксам) радасна распавядае пра пэрспэктывы ядзернага зьнішчэньня Спрынгфілду, гораду, дзе жывуць Сімпсаны. А вось Шварцнэгера не рызыкнулі папрасіць агучыць сябе самога. Гэта не перашкодзіла ягонаму анімацыйнаму двайніку, прэзыдэнту ЗША паводле сюжэту, заставацца вельмі пацешным.

Паглядзіце на экране на сямейку Сімпсанаў — і парадуйцеся за сваю.

**Андрэй Расінскі**

# лІтаратурНы сшытак «НН»

*жнівень 2007*


Наста Азарка. Мама ... 27
Сямён Печанко. Цароў унук ... 28
Уладзімер Содаль. Мірон ... 31
Аляксей Бацюкоў. 37 працэнтаў гетэрасэксуалаў ... 32
Андрэй Лянкевіч. Баба Ўладзя, якая тчэ дываны ... 34
Франц Сіўко. А ці цыцкі ў іх ёсьць? ... 36
Раман Абрамчук. Сустрэліся дзьве каровы ... 37
Алег Аблажэй. Праклятыя паэты ... 38
Айцец Аляксандар Шрамко. Нотр-Дам дэ Ўладзімер ... 39
Ганна Чакур. Заўважынкі ... 40
ErBe; Ноччу магчыма ўсё. Рэцэнзіі ... 41


## КАЛІ Б...

**...муж вярнуўся з камандзіроўкі пасьля таго, як было вырашана даваць студэнтам, што ня маюць інтэрнату, 6200 рублёў кампэнсацыі.**



— ...што ты, мілы, які каханак?! Проста я здала з 6000 паліцу студэнту!

МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

## КУР'ЁЗ




**Як па-беларуску Бангладэш?**

**Во такі цэтлік даслалі ў Рэдакцыю чытачы.**

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Гледзячы на тое, да чаго дайшлі нашы браты-украінцы, чалавек пачынае верыць, што і нашы беларусы, наша родная мова, ня згінуць дарма.

**«Наша Ніва». №33. 1907**



# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста падпішыце дамову. Дэталі — **старонка 25.**


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КАНТАКТЫ

**Суполка** «Нашыя Дзеткі» прапануе вам сустрэчы ў коле беларускамоўных дзяцей. Запрашаем вас на супольныя прагулкі, велазаезды, падзеі. Пытаньні можна задаць праз т.: 632-27-43. Крысьціна.

### НАБУДУ

**Набуду** нашыўкі — герб і сьцяг Беларусі. Т.: 373-23-74. Сяржук.

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: 101-03-24. Юрась.

**Якасны набор**, рэдагаваньне тэкстаў на беларускай мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: 101-03-24. Юрась.

**Хлопец** 18 год, студэнт-завочнік, шукае сталую працу. Т.: 572-28-38. Аляксей.

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Зьміцер Касьпяровіч** запрашае ў падарожжа 16 верасьня (нядзеля) па маршруце: Менск—Дубна—Лунна—Індура—Гудзевічы—Адэльск—Вялікія Эйсманты—Масаляны—Вярэйкі—Менск. 19 — 22 кастрычніка: Познань, Гнёзна. Т.: (017) 292-54-58, (029) 622-57-20, 509-12-16, 110-19-28



**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |



**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.


12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 29.08.2007.

Замова № 4718.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.